Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

Літаратура і Мастацтва

№ 33 (2924)
18 жніўня 1978 г.

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

Выдаецца з 1932 г.
Цана 8 кап.

Яны будуюць Гродна. Члены брыгады Г. М. Водчыца з домабудаўнічага камбіната.

Сведка мужнасці і славы...

Фота У. КРУКА.

Перадавая работніца Гродзенскай фабрыкі мастацкіх вырабаў Лілія Канстанцінаўна Паўлюкевіч.

Фота А. КОЛАСАВА.

ПЕРАДСВЯТОЧНАЕ ПАДАРОЖЖА ПА АБЛАСЦЯХ РЭСПУБЛІКІ ІДЗЕ ДАЛЕЙ. СЁННЯ «ЛІМ» — НА АРДЭНАНОСНАЙ ГРОДЗЕНШЧЫНЕ.

Уборка ўраджаю ў калгасе «Дружба» Мастоўскага раёна.

Фота А. ПЕРАХОДА. (ВЕЛТА).

ЗОРЫ над НЁМАНАМ

Л. Г. КЛЯЦКОЎ,
першы сакратар Гродзенскага абкома КПБ

Механізатар калгаса «1 Мая» Шчучынскага раёна, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР Іван Фелiксавіч Місюк.

Фота А. КОЛАСАВА.

ШМАТ ВЯЛІКІХ і малых дарог здаўна перакрыжоўваліся на Гродзеншчыне. Розныя па іх прыходзілі да нас людзі. Але не заставалася абыякавых да велічнага бацькі-Нёмана, лашчыў слых падарожніка таемны шэпат векавых дуброў, вабілі непаўторнай прыгажосцю сінявокія азёры.

Прынёманскі край прыносіў натхненне і, услаўлены ў паэмах і баладах Адама Міцкевіча, стаў часцінкай радзімы для польскага кампазітара і грамадскага дзеяча Міхала Агінскага. У прыгажосці душы простага народа, шчодрасці прыроды чэрпалі натхненне Францішак Багушэвіч, Эліза Ажэшка, Алаіза Пашкевіч (Цётка).

Але больш за ўсё ўражвала падарожнікаў беднасць і галеча жыхароў гродзенскіх гарадоў і вёсак. Горадам кантрастаў і парадоксаў, напрыклад, здаўся немцам К. Гейкінгу і Ф. Шульцу горад Гродна другой паловы XVIII стагоддзя: «Мноства касцёлаў з вежамі, фацэтных палацаў і дамоў вельмі не глядзяцца на фоне бядняцкіх хацін».

Галечу рабочых гродзенскіх мануфактур убачыў англічанін У. Кокс. Ён адзначыў, што смутны выгляд дзяўчат-работніц сведчыць аб тым, што працуюць яны больш па прымусу, а не з любві да справы.

«Я бачыў гэтыя худыя, змардаваныя цені, падобныя на людзей, я быў у іх цесных хацінах, дзе ў адным пакоі на земляной падлозе ў цеснаце і дыме прымасцілася 2—3 сям'і. Іх цяжкі рабочы дзень пачынаецца з 4 гадзін раніцы — сякуць дровы, кормяць жывёлу, ледзь развіднее — пачынаюць малаціць. Улетку ад узыходу сонца да апошніх яго промняў — работа ў полі пад наглядам аканома, — пісаў сведка ў газеце «Северо-западный Голос». — Небарака-батрак і яго жонка, паўгалодныя і абарваныя, працуюць да поўнай страты фізічнай сілы, пакуль хвароба ці смерць не пазбавяць іх ад вечнай кабалы».

Гаротная доля беларускага мужыка хвалюе Францішка Багушэвіча. Крывёю сэрца ён піша вершы аб безвыходнасці сялян — сваіх землякоў, сацыяльнай несправядлівасці, і ў іх гучыць ужо не простае ўшчуванне іншаземнага падарожніка, а заклік да барацьбы. Як і ў соцень аднадумцаў, у паэта-дэмакрата спее пратэст, ідэя свабоды.

Гулкім рэхам адазвалася на Гродзеншчыне паўстанне дзекабрыстаў, а ў 1863 годзе Кастусь Каліноўскі і Валерый Урублеўскі фарміруюць атрады сялян-паўстанцаў у лясах і пушчах Прынямоння.

У 1905 годзе палымяная Алаіза Пашкевіч (Цётка), бадай, першая (і не толькі ў беларускай літаратуры) клікала, што «цара павесіць трэба», і гэты заклік адгукаўся ў тысячах, мільёнах абяздоленых сэрцаў.

Свядомасць мас, іх рэвалюцыйную барацьбу распальвала ленінская «Іскра», якая цераз усе перашкоды трапляла на Гродзеншчыну. Рэвалюцыйныя масы ўзначалілі бальшавікі, і нішто ўжо не магло выратаваць прагнілы царскі рэжым.

У штурме самадзяржаўя ўдзельнічалі многія гродзенцы. Паплечнік У. І. Леніна, член партыі з 1898 года З. П. Салаўёў — адзін з іх. Актыўны ўдзел у рэвалюцыі і стварэнні рабоча-сялянскага ўрада прымаў А. Я. Якаўлеў, які ў 1929 годзе стаў першым Народным Камісарам земляробства СССР.

Але ненадоўга бліснула сонца свабоды ў Прынёманскім краі. Па гродзенскіх вуліцах застукалі боты салдат нямецкага кайзера Вільгельма, затым — белапольскіх акупантаў. І зноў амаль на два дзесяцігоддзі ўсталяваўся тэрор, сацыяльны і нацыянальны прыгнёт.

Горкай школай празарэння стане знаёмства з жыццём працоўнага люду на Гродзеншчыне для польскай пісьменніцы Зофіі Налкоўскай. Яе глыбока хвалюе жорсткасць буржуазнай цывілізацыі і трагізм сучаснасці, пакуты простых людзей. Налкоўская падзяляе гнеў беларускага народа, а пасля знаёмства з падпольшчыкамі, барацьбітамі за светлае будучае прызнаецца: «Я раблюся ўсё больш і больш блізкай па духу з камуністамі».

Стагнаў ад болю, знявагі і здзекаў працоўны люд Гродзеншчыны, але яго не маглі паставіць на калені ні змрочныя засценкі «дэфензівы», ні казематы Картуз-Бярозы, ні масавыя карныя акцыі фашыстоўскіх санацыйных улад. Пад кіраўніцтвам Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі ні на дзень не аціхала барацьба, у народзе жыла вялікая вера ў светлае будучае. Набатна гучыць голас Сяргея Осіпавіча Прытыцкага, Веры Захараўны Харужай, палымяныя і натхнёныя словы Максіма Танка, Піліпа Пестрака, Валянціна Таўлая, Міхася Васілька.

«У верасні 1939 года здзейснілася мара працоўных заходніх абласцей Беларусі аб уз'яднанні ў адзінай Савецкай сацыялістычнай дзяржаве» — гэтыя радкі з пастановы Цэнтральнага Камітэта КПБ «Аб 60-годдзі Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі і Камуністычнай партыі Беларусі» — пра нас, пра вялікую падзею, якая карэнным чынам перамяніла далейшы лёс працоўных Прынёманскага краю.

Пралетарскі інтэрнацыяналізм, братнюю падтрымку заходнія беларусы адчулі адразу ж. Сюды стала паступаць абсталяванне для пашырэння вытворчасці, распачата будаўніцтва новых прамысловых прадпрыемстваў, прыехалі спецыялісты — рускія, украінцы, грузіны, і сталі наладжваць вытворчасць, рыхтаваць нацыянальныя кадры.

Шмат якія сяляне па гэты час памятаюць тых першых «сталёвых коней», што прыйшлі на канфіскаваныя ў памешчыкаў і асаднікаў землі. Яны абудзілі зямлю. Не згладзіцца такое з памяці: пад плугамі разляталіся ўдзірванелыя межы, што стагоддзямі дзялілі не толькі вузкія палоскі, але і сэрцы, жыцці сялян. Ужо на канец 1940 года ў вобласці налічвалася 950 трактароў.

Без ценю сумнення гродзенцы ўступілі ва ўпарты бой з фашызмам, які чорнай хмарай павіс над савецкай зямлёй. У падполлі і ў партызанскіх лясах яны грамілі ненавіснага ворага і набліжалі Дзень перамогі. Выдатнымі ваеначальнікамі сталі ўраджэнцы Гродзеншчыны Герой Савецкага Саюза маршал В. Сакалоўскі, генерал арміі А. Антонаў, генералы-палкоўнікі Н. Паўлоўскі, І. Нагорны, В. Корчыц і іншыя.

Вялікая ідэя ператварыць сваю зямлю ў квітнеючы край дапамагла гродзенцам у кароткі час залячыць раны вайны, аднавіць разбураную гаспадарку. І ў гэтым яны штодзённа адчувалі братнюю падтрымку і дапамогу ўсіх народаў нашай шматнацыянальнай Радзімы.

Да юбілею Беларускай рэспублікі мы рыхтуемся як да вялікай знамянальнай падзеі ў грамадска-палітычным жыцці, як да свята рэвалюцыйнай барацьбы і камуністычнага будаўніцтва. І святочным убраннем жыццярадаснай зямлі стала золата буйной збажыны і аксаміт сакавітых траў на шырокіх калгасных нівах, роўныя квадраты карпусоў і ўзнёслыя да неба дакладныя лініі тэхналагічных калон прамысловай індустрыі, іскрамётныя ўсмешкі яе гаспадароў.

...Як і раней, перакрыжоўваюцца на Гродзеншчыне вялікія і малыя шляхі. Да нас прыязджаюць госці, і мы вельмі рады добрым сябрам. Госць на парозе — шчасце ў доме.

Толькі за апошнія пяць гадоў падвоіліся міжнародныя культурныя і эканамічныя сувязі Гродзенскай вобласці. З місіяй дружбы і дзелавога супрацоўніцтва да нас прыязджаюць прадстаўнікі працоўных братняй Польшчы, Балгарыі, Чэхаславакіі, іншых краін сацыялістычнай садружнасці. Значна ўзрасла колькасць прыязджаючых да нас з краін капіталістычнага свету.

Як і раней, мы гаворым аб кантрастах. Толькі цяпер ужо аб тых, што было ў нас раней, і аб вялікіх пераўтварэннях, якія адбыліся на тэрыторыі вобласці за гады Савецкай улады.

Не так даўно мы прымалі дэлегацыю журналістаў і літаратараў з Чэхаславакіі. Зластаміл Андрм, Вілент Рот і Міраслаў Толар з вялікай цікавасцю знаёміліся з вытворчым аб'яднаннем «Азот» імя С. О. Прытыцкага, калгасам «Прагрэс» Гродзенскага раёна і шмат чым іншым. Вярнуўшыся дамоў, нашы чэхаславацкія сябры расказалі сваім чытачам аб тым, якім клопатам дзяржавы акружаны савецкі рабочы чалавек, аб ахове працы і захаванні навакольнага асяроддзя.

З добразычлівасцю і гонарам за нашы дасягненні пішуць пра нас польскія пісьменнікі і журналісты. Бадай, не выходзіць нумара «Газеты вспулчэснай» (пагранічнага з намі Беластоцкага ваяводства) без інфармацыі аб падзеях у БССР. На працягу больш чым дзесятка гадоў усталяваліся самыя цесныя сувязі калектываў «Гродненской правды» і беластоцкай «Газеты вспулчэснай». З матэрыялаў, якія апублікаваны ў гэтых выданнях, яскрава вырысоўваецца летапіс дзелавых і культурных кантактаў брацкіх народаў, летапіс этапаў умацавання дружбы і ўзаемадапамогі.

У якасці прыкладу можна прывесці дзелавыя кантакты, якія падтрымліваюцца паміж рабочымі Гродзенскага завода карданных валаў і падобнага па профілю прадпрыемства ў балгарскім горадзе Габрава, паміж гродзенскімі тэкстыльшчыкамі, харчавікамі, хімікамі і іх калегамі з народнай Польшчы. Гэта на справе паказвае вялікую сілу пралетарскага інтэрнацыяналізму, згуртаванасць народаў сацыялістычных краін у барацьбе за агульную справу.

Нашы дасягненні здзіўляюць прадстаўнікоў капіталістычнага свету. Не маглі захаваць захапленне ад убачанага прафесар універсітэта з Атавы Дэвід Льюіс і прэзідэнт буйной канадскай будаўнічай фірмы Джон Эйн. У маі бягучага года яны пабывалі ў гарпасёлку Свіслач, наведалі раённую бальніцу і пазнаёміліся з персаналам, пабывалі ў іншых установах і месцах адпачынку працоўных.

— Мы не чакалі ўбачыць такое, — сказалі Д. Льюіс і Д. Эйн. — У нашым уяўленні ўсё было інакш. Мы дзякуем за гасціннасць, за ўсё, што нам паказалі.

Так, нам ёсць што паказаць гасцям. І мы з ахвотай робім гэта. Расказваем, што толькі за апошнія 10—15 гадоў на эканамічнай карце Савецкага Саюза з'явіліся такія буйныя сучасныя прадпрыемствы, як Гродзенскае вытворчае аб'яднанне «Азот» імя С. О. Прытыцкага, Лідскі лакафарбавы завод, Гродзенскі прадзільна-ніткавы камбінат, Ваўкавыскі малочна-кансервавы камбінат дзіцячых прадуктаў, Слонімская камвольна-прадзільная фабрыка і Гродзенскі завод сінтэтычнага валакна. У вобласці, якая да апошняга часу лічылася аграрнай, зараз амаль дзве трэці валавой прадукцыі дае прамысловая вытворчасць.

У вобласці выпрацоўваецца электрычнасць, выпускаюцца сельскагаспадарчыя машыны, вузлы і дэталі да аўтамабіляў, у тым ліку амартызатары да аўтамабіляў «Жыгулі», тканіна, абутак, мінеральныя ўгнаенні і іншая прадукцыя. Займаючы 12 працэнтаў тэрыторыі рэспублікі, вобласць выпускае 40 працэнтаў скуранога абутку, трэцюю частку цэменту і цукру-пяску, 25 працэнтаў кардону і г. д. Хімічныя ўгнаенні і дэталі да аўтамабіляў, якія вырабляюцца на нашых прадпрыемствах, добра вядомыя ў краіне, а 65 відаў выробаў ідзе на экспарт.

Такія новыя галіны вытворчасці, як энергетычная, хімічная, машынабудаванне і металаапрацоўка ў апошнія гады развіваюцца асабліва высокімі тэмпамі. Толькі з 1970 года іх доля ў агульным аб'ёме прамысловай вытворчасці павялічылася з 23 да 35 працэнтаў. За апошнюю пяцігодку амаль у паўтара раза павялічылася вытворчасць прадпрыемстваў лёгкай, харчовай і мяса-малочнай прамысловасці. І яшчэ адна лічба, якая ярка характарызуе навукова-тэхнічны прагрэс у прамысловасці: механізаваных, паточных і аўтаматычных ліній, комплексна механізаваных і аўтаматызаваных участкаў і цэхаў за 9-ю пяцігодку і два гады бягучай стала амаль у 3 разы больш, чым было зроблена за ўсе пасляваенныя гады.

У вобласці здзейснены ленінскі кааператыўны план, у выніку якога адбыліся глыбокія сацыяльна-эканамічныя пераўтварэнні ў сельскай гаспадарцы. Клопаты земляробаў — аб павышэнні ўраджайнасці палёў, прадукцыйнасці жывёлагадоўлі і на гэтай аснове рэзкім павелічэнні валавой вытворчасці ўсіх сельскагаспадарчых прадуктаў. Высокімі ўраджаямі збожжавых праславілі калгасы «Прагрэс» і «Авангард» Гродзенскага раёна, «Звязда», «Рассвет» і імя Шчорса Навагрудскага, калгас «1 Мая» Шчучынскага раёнаў. А ў цэлым па вобласці ў леташніх надзвычай складаных кліматычных умовах сабрана па 25,8 цэнтнера збожжа з кожнага гектара. Бульба дала па 146 і цукровыя буракі — па 290 цэнтнераў з гектара. Жывёлаводы атрымалі на ўмоўную адзінку зямлі

па 450,8 цэнтнера малака і 132,1 цэнтнера мяса. Гэта стала галоўнай умовай паспяховага выканання дзяржаўных планаў двух гадоў пяцігодкі.

Гэтымі днямі на палях вобласці шырокім фронтам вядзецца жніво. Паступаюць весткі аб рэкордах адзіночак і цэлых калектываў. Працуюць каля пяці тысяч камбайнаў, сотні жняярак. Папярэднія падлікі даюць надзею: хлебны каравай будзе важкі.

У нас ёсць вялікія перспектывы росту. Яны — у далейшым развіцці спецыялізацыі і канцэнтрацыі вытворчасці. Ствараюцца спецыяльныя гаспадаркі па адкорму жывёлы, вытворчасці малака і іншых прадуктаў сельскай гаспадаркі.

Але, на жаль, не ўсе бачаць нашы здабыткі. Справядлівей кажучы, не хочуць заўважаць, разглядаюць нас праз цёмныя акуляры. Асабліва гэтым грэшныя літаратары капіталістычнага Захаду. Яны засланяюць ход у свае выданні праўдзе нашай сучаснасці, усяляк адцягваюць усё ўзрастаючае захапленне сваіх працоўных нашым ладам жыцця і, наадварот, смакуюць розныя выдумкі і яўную хлусню.

З гэтай нагоды ўспамінаецца падобны ўзорчык, выдадзены не так даўно ў адным з англійскіх выдавецтваў. Паставіўшы ўвогуле неблагую мэту расказаць аб нашых спартсменах, аўтары вельмі пакрывілі душой, паказваючы савецкае асяроддзе. Напрыклад, горад Гродна быў прадстаўлены як правінцыйны, далёкі ад цывілізацыі і забіты гарадок, насельніцтва якога займаецца ні чым іншым, як «вытворчасцю цыгарэт, мыла ды парафінавых свечак». Мне шкада тых чытачоў, якім залежныя ад выдаўцоў аўтары падаюць такую хлусню.

На Захадзе наўмысна маўчаць аб тым, што наша партыя распрацавала і паслядоўна праводзіць навукова абгрунтаваную эканамічную стратэгію, якая скіравана на дасягненне фундаментальных, доўгатэрміновых мэт, вышэйшая сярод якіх — няўхільны ўздым матэрыяльнага і культурнага ўзроўню жыцця савецкага народа. Гэтая мэта дасягаецца праз рост заработнай платы, павелічэнне грамадскіх фондаў спажывання. Рознага роду буржуазныя тэарэтыкі і «саветолагі» затушоўваюць вялікія магчымасці сапраўднай дэмакратыі, гарантаванай Канстытуцыямі СССР і БССР.

А, між іншым, Савецкая Канстытуцыя пераканаўча паказвае ўсім, як многа можа дасягнуць народ, які скінуў з сябе ланцугі капіталістычнай эксплуатацыі і ўзяў у свае рукі палітычную ўладу, стаў гаспадаром свайго лёсу.

Сацыялізм адкрыў перад працоўнымі былых заходніх абласцей Беларусі шырокі доступ да ведаў, да багаццяў духоўнай культуры. Да 1939 года ў вобласці не было ніводнай вышэйшай навучальнай установы, ніводнай беларускай школы. Зараз жа наша моладзь вучыцца ў 287 сярэдніх школах, 42 тэхнікумах і прафтэхвучылішчах, трох вышэйшых навучальных установах. Дарэчы, напярэдадні 850-годдзя горада ў Гродне гасцінна расчыніў свае дзверы дзяржаўны універсітэт.

Хочацца яшчэ спаслацца толькі на некалькі параўнанняў. 268 масавых бібліятэк з кніжным фондам 346 тысяч экземпляраў было ў вобласці ў 1940 годзе. Зараз колькасць бібліятэк узрасла да 1100 і ў іх налічваецца каля дзесяці мільёнаў кніг і часопісаў. У гарадах і вёсках дзейнічае 928 клубных устаноў, больш за тысячу кінаўстановак, 10 музеяў, 6 народных тэатраў і дзесяткі народных самадзейных калектываў. Вядомымі не толькі ў рэспубліцы, але і ў краіне сталі народныя ансамблі «Нёман» і «Раніца». Нашы самадзейныя калектывы часта бываюць за мяжой.

Асобна хочацца сказаць аб калектыве абласнога драматычнага тэатра, які карыстаецца любоўю і пашанай у жыхароў абласнога цэнтра і сельскіх працаўнікоў. Творчая трупа за апошнія гады ажыццявіла пастаноўку многіх спектакляў, сярод якіх найбольш удалымі сталі «Мілы чалавек» К. Крапівы, «Трывога» А. Петрашкевіча, «Камуніст» паводле сцэнарыя Я. Габрыловіча. У цэнтры Гродна будуецца новы будынак драматычнага тэатра, дзе, несумненна, адбудзецца шмат цікавых прэм'ер.

Тыя вялікія змены, што адбыліся ў жыцці працоўных заходніх абласцей за гады Савецкай улады, знаходзяць сваё адлюстраванне ў творах гродзенскіх пісьменнікаў, мастакоў. Яны вырашаюць хвалюючыя пытанні сучаснасці, публіцыстычнымі сродкамі скіроўваюць грамадскую ўвагу на нявырашаныя праблемы.

У вобласці дзейнічае аддзяленне Саюза пісьменнікаў БССР. Літаратары рэгулярна выступаюць перад чытачамі на прамысловых прадпрыемствах, у калгасах і саўгасах, у навуковых установах, нашы празаікі і паэты прымаюць рэгулярны ўдзел у абласным і раённым друку. Аднак, якой вялікай ні была б такая праца, трэба прызнаць, што без уласна літаратурнай творчасці яна наўрад ці будзе шмат значыць. Безумоўна, што аўтарытэт літаратараў, іх уплыў на шырокія масы чытачоў залежыць у першую чаргу ад іх твораў. У гэтым сэнсе літаратары Гродзеншчыны маюць пэўныя здабыткі, аб якіх варта сказаць падрабязней.

З Гродзеншчынай звязана літаратурная біяграфія лаўрэата Дзяржаўнай прэміі СССР Васіля Быкава. Яго аповесці атрымалі ўсенароднае прызнанне, а талент аўтара высока ацэнены Савецкім урадам. У творчасці Васіля Быкава па-новаму адлюстраваны многія аспекты мінулай вайны, услаўляецца духоўная прыгажосць савецкага чалавека, воіна-пераможцы. Мы з задавальненнем успрынялі новую аповесць Васіля Быкава «Пайсці і не вярнуцца», падзеі якой разгортваюцца на Гродзеншчыне ў гады Вялікай Айчыннай вайны.

Шмат гадоў Васіль Уладзіміравіч Быкаў быў кіраўніком абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў і яго дзейнасць на гэтай пасадзе зрабіла добры адбітак на літаратурным жыцці Гродзеншчыны, на выхаванні творчай моладзі.

Наш старэйшы паэт, перакладчык і літаратуразнаўца Міхась Юр'евіч Дуброўскі адзначыў 80-годдзе. Вядома, узрост гэты не назавеш самым працаздольным для літаратара, тым не менш Міхась Юр'евіч даволі актыўна ўдзельнічае ў літаратурным працэсе вобласці. Здаўна маючы схільнасць да сатыры, ён напісаў шмат баек, а таксама лірычных і агульнапалітычных вершаў, якія час ад часу з'яўляюцца на старонках абласной і раённай газет. Друкуюцца таксама і іншыя вершы Дуброўскага, яго пераклады санетаў Шэкспіра.

Мы рады таксама, што ў гэтым страі знаходзіцца другі наш старэйшы паэт Анатоль Іверс, які жыве і працуе ў Слоніме. Актыўны ўдзельнік барацьбы народа Заходняй Беларусі за яго сацыяльнае і нацыянальнае вызваленне, ён пачаў пісаць яшчэ да вайны і ў 1940 годзе быў прыняты ў члены СП Беларусі. Анатоль Іверс не пакінуў служыць літаратуры, сведчаннем чаго з'явіўся выхад у свет яго этапнага зборніка «З пройдзеных дарог», цёпла сустрэтага крытыкай.

Як заўжды плённа і напружана працуе наш празаік Аляксей Карпюк, плён працы яго—аповесць «Вершалінскі рай» і зборнік «Свежая рыба» з'явіліся ў апошнія гады на паліцах кнігарняў вобласці. Карпюку ўдаецца падняць і па-мастацку даследаваць цэлыя пласты народнага жыцця.

З ашчаднай далікатнасцю да роднага слова працуе ў паэзіі Данута Бічэль-Загнетава. Не так часта, але даволі рэгулярна, выходзяць з друку яе кніжкі вершаў, дзіцячыя зборнікі, пераклады. Паэзія Дануты Іванаўны карыстаецца ўсеагульным прызнаннем.

Даўно і плённа працуе ў паэзіі наш рускі паэт-воін Гаўрыіл Шутэнка. Нягледзячы на пэўныя цяжкасці са здароўем, Гаўрыіл Шутэнка рэгулярна працуе над вершамі, многія з якіх друкуюцца ў «Гродненской правде», а таксама ў навагрудскай раённай газеце, у мінскіх выданнях. На Навагрудчыне яго ведаюць, апроч таго, як актыўнага выхавальніка моладзі на баявых традыцыях Вялікай Айчыннай вайны. Былы разведчык, камуніст і паэт і цяпер у страі.

Таксама трэба парадавацца паэтычнаму поспеху Мар'яна Дуксы і Юркі Голуба, якія выдалі па некалькі зборнікаў, адзначаных значным майстэрствам, добрым паэтычным густам і беражлівым стаўленнем да роднага слова. Выдалі па адной і некалькі кніжак паэзіі Марыя Шаўчонак, Генадзь Дзмітрыеў, прозы — Валянцін Блакіт, Пётр Лісіцын. Да названых імён трэба дадаць яшчэ дзесяткі і сотні, якія гуртуюцца вакол літаратурных аб'яднанняў, рэдакцый абласной і раённых газет, каб атрымаць поўнае ўяўленне аб творчых сілах і магчымасцях на паэтычнай арбіце нашых землякоў.

Светлае сёння, самаадданая натхнёная праца землякоў, героіка мінулага хвалююць нашых мастакоў і скульптараў. Аб прызнанні таленту і знаходак І. Пушкова, В. Савіцкага, К. Пятрова, А. Захарава, В. Шчарбакова, У. Церабуна і іншых гаворыць той факт, што ўсё больш і больш іх работ экспануецца на рэспубліканскіх, усесаюзных і замежных выстаўках.

...Спакойна і велічна, як і многа вякоў назад, нясе свае воды ў сівую Балтыку ўслаўлены ў вершах і песнях Нёман. Падобна яго магутнай плыні, упэўнена жыве, будуе сваё шчасце працавіты народ. І ярка зіхацяць над імі асветленыя Вялікім Кастрычнікам наднёманскія зоры.

Ансамбль «Раніца» Дома культуры тэкстыльшчыкаў.

Вялікая хімія— гонар вобласці.

Растуць дамы, растуць кварталы.

Фота А. КОЛАСАВА.

Данута БІЧЭЛЬ-ЗАГНЕТАВА

Падлётнае

Прабягуся,
нібыта Нёману пара.

Дыхае Радзіма.
Уздымаецца пара.
Абуджаецца зялёнае пакаленне.
Парасткам, сцяблом
з нутра зямлі бурэнне.

Чырвона-бурыя каташкі таполі.
Ступае грак
гаспадарскай ступою.
Раструшчвае ў дзюбе
камякі глебы.
Каштуе, ці тлуста
на смак. Не грэбуе.

Цёпла душы
між птушак, казюлек.
Як дачушку, гукаю
ластавачку пад стрэшку.

Тупаю па звонкім спеўным
арэшку.
Свіцяцца пупкі
з-пад зялёных кашулек.

Гродна

На шлях Радзімы несмяротнай
дыхнула жарало байніц.
Ссівелае чало Гародна
ад войн крывавіць і баліць.

Крыло над Нёманавым вірам,
разбег акрыленых людзей.
Чародкамі
ляцім у вырай.
А ты штоpанку маладзей.

Адам Міцкевіч

«Дзяды» чытаю,
нібы адпяваю вясну,
што знікла ў мураваны горад,
наіўнай вёскай
не ўталіўшы голад...

Вярэдзіць сэрца
досвіткавы голас
матулі ці Адамавай Марылі.

Яго выгнаннем
і мяне марылі.
Яго бяздомнасць—
мне ў воку парушына.

Цялятка ў шкодзе:
— Куды, Гражына!
З-за панібрацтва
не трэба абурэння.
Што даражэй за рыжае стварэнне
было ў мяне?

Балоты, бездарожжа,
тутэйшых ніваў
льняная світка,
з карэнняў і хлудзін зялёных
кошык,
напоўнены вадой крынічнай —
Свіцязь...

Дзівосны Нёман,
Плужанскі бор,
муры Наваградка
калышуць боль
Міцкевіча,
нягледзячы на лёт
зямных падзеяў, войнаў і маркот
людскіх,
нягледзячы на рознасць
сястрыных моў,
свіціцца роснасць
даўнейшых вобразаў...

Расінка з дрэў,
што лашчылі яго
шурпатаю карою,
калі спакой
свідруюць думкі роем,
тужліва выдыхаю нараспеў:
— Літво!
Ойчызна моя!
Ты естэсь як здрове...

Ценям Касцюшкі

Цень з Марачоўшчынскай
даўняй таполі,
бывае, далёка вандруе па полі.

На ўсходзе сонца
лагодна пакратае
прытулак сноў спрадвечных
у Кракаве.

Перад заходам
ціхенька ўзлезе
на дольны камень амшэлы
ў Залессі.

Гаючаю засенню
спыніцца ўдзень.

Дзе нарадзіўся,
блукае цень.

Дзе зброяй люд бараніў
ад жуды,—
перад жывымі ў змаганні заўжды.

Сын

Яшчэ як былі мы
аднюткай істотай
і я пра цябе
толькі марыла ўпотай,

каб кволы не рос,
не слабы, не малы.
Каб крышку ўдыхнулі
адвагі арлы, —

над болем буслы
разлагоджвалі клёкат.
Бусельнік слаўся
барознамі ўпокат.

Пад босай нагой
выдыгаліся тупка
праз мох баравы
па зацішным бары

шляхі.
Як цяляткі, рыкалі зубры.

Дабро наваколля
ўбірала, як губка.

Гаворка людская
цякла, як вада.
Ніхто не смяяўся
з майго жывата...

Сынок прастадушны, як мы...
і шкада.

Пераказ

Мяне вучылі цёткі:
— Чаго ты хмурыш броўкі?
Нявыкрутка?
і ўсё-ткі
не бегай да сяброўкі.

Паплач паціху з горачка,
і божа барані!
Яна ж табе так горача
клялася ў дабрыні.

За непагаддзю, слотай—
сонейкавы выгляд.
З любой непамыслоты
прыдумаецца выхад.

Пакуль не прыйдзе свяцейка
ў душу,
пабудзь здаля.
...Даруй, мая прыяцелька, —
ім веры не дала.

Няпраўда так гарэла,
што і душой згалела.
Спарола словы-авадні.

Няпраўду лечаць
толькі дні.

Нёман-працаўнік.

Фота А. КОЛАСАВА.

Юрка ГОЛУБ

Ноч

Нанач фарбы губляюць
і бляск,
і красу,
ды затое угору ўздымаецца
зорка,
каб агледзець спакой,
наваколле,
расу
на засеяных лесам пагорках.

Кропля касая вісіць пад лістом.
Падае май да каленяў чаромхі.
У думак юначых на ганку пастой
хаўруснікам гукаў чароўных.

Разбойна кладуцца сады на платы.
Натомлена днём брукаванка
ўздыхае.
Пошапт глыбокі.
І сад.
І пры тым
Вечнасць стаіць маладая.

Гродзенская імпрэсія

Калі
сустрэнеце спакойнага чалавека
апоўначы
ў квартале,
дзе ў бліскучы асфальт
углядаюцца вокны
і ў пакінутым скверы
атрасае плашч навальніца —
гэта ходзіць
сон горада.

Радаснае

Фарбам у прасторы не баліць.
Бязважкасць наступіла,
як прыгода.
І доўжыцца сярэбраная ніць
між берагам і сэрцам цеплахода.

І настрой спяшаецца на ўздым:
дзякаваць вандроўніцкай нагодзе.
Растае мінулае, як дым,
і дымок таго, што будзе,—
на ўзыходзе.

І ляціць блішчаста па канве
і сцяжок,
і хмарка,
і выснова.
І душа, як радасны канверт,
вылятае ў свет услед за словам.

Згадка

На вольным полі васілёк,
Пад небам выснены айчынай.
Гляджу на жыта аддалёк
Заўсёды блізкімі вачыма.

Нёманскі малюнак

З хвіліны на хвіліну
Адстане нарасхрыст,
Як воблак ад хваіны,
Скразное хвалі свіст.

За смелым паваротам
Направа будзе май,
І горны стануць потым
Трубіць у ранні гай.

Дзе выдмы свежай рана
Аслепіць, як рывок,
Стаіць сабе з зарана
Бліскучы ґаплавок.

І з гонарам хлапечым
(Ды сонца шанец быў)
Малец рукзак — за плечы,
І ходам пад абрыў.

І СТАРАЖЫТНЫ, І ЮНЫ

ГОРАД ГРОДНА хутка адзначыць сваё 850-годдзе. Старажытны і юны, планамі і справамі сваімі ўвесь у будучым, горад жыве ў напружаным рытме нашых пяцігодак, пашыраючыся і прыгажэючы. 190 тысяч насельніцтва, 50 буйных прамысловых прадпрыемстваў, два раёны—Кастрычніцкі і Ленінскі, тры вышэйшыя ўстановы і восем тэхнікумаў, пяць кінатэатраў, 27 паркаў і сквераў, гістарычны музей, заапарк... Нядаўна стаў трэцім універсітэцкім горадам Беларусі.

Пра сённяшні яго дзень і дзень заўтрашні і ішла гаворка з галоўным архітэктарам горада Анатолем Пятровічам Каральковым...

Архітэктары майстэрні перспектыўнага планавання праектнага інстытута «Гроднаграмадзянпраект» за распрацоўкай новых жылых масіваў.

Фота А. КОЛАСАВА.

— Сілуэт Гродна — якім ён уяўляецца вам, галоўнаму архітэктару, сёння?

— За гады Савецкай улады наш горад вырас і ўшыркі, і ўвысь, змяніўся, стаў буйным індустрыяльным цэнтрам, інтэнсіўна вядзецца забудова жылых раёнаў. Мікрараёны «Фарты-1», «Савецкіх пагранічнікаў», «Перасёлка-3», «Прынёманскі-1» — гэта ўжо новы дзень Гродна.

Але, калі гаварыць пра тое, што і зараз — і сёння — вызначае яго сілуэт, трэба ў першую чаргу гаварыць пра гістарычныя архітэктурныя помнікі, якія — у сукупнасці каля ста васьмідзесяці — фарміруюць цэнтральную частку горада. З далёкіх-далёкіх часоў здзіўляе сваёй прыгажосцю Барысаглебская царква на гары Каложа. Гэта ўражвае, будзіць фантазію: фасады аздоблены рознымі па форме, велічыні, колеру каменнямі, верхняя частка сцен апрацавана маёлікавымі плітамі і керамічнымі чашамі. Своеасаблівы і ўнутраны выгляд храма: падлога пакрыта складаным дывановым узорам, які па хараству не ўступае лепшым узорам дэкаратыўнага мастацтва Русі. І стаіць царква на пагорку, з якога адкрываюцца вачам бязмежная прастора Занямоння і пакручастая, бліскучая стужка ракі.

Ідучы па гэтай частцы горада, нібы гартаеш каменныя старонкі гісторыі. Абаронныя збудаванні, замкі, ахоўныя вежы... Рэшта іх на Замкавай гары моўчкі сведчыць пра той бурны гістарычны перыяд, калі горад ад феадалаў літоўскіх пераходзіў да магнатаў польскіх, калі пад гнётам заваёўнікаў стагнаў беларускі народ.

Манастыры, касцёлы, заняўшы самыя выгодныя вышынныя кропкі горада, уяўлялі сабой цэлую абаронную сістэму, што ў выпадку народных паўстанняў і бунтаў дазваляла трымаць пад кантролем усе важнейшыя вузлы. Трынаццатае стагоддзе, стагоддзе, характэрнае засіллем каталіцызму...

Адзін век змяняўся другім, іншыя будыніны ляпіліся да ўжо ўзведзеных, новыя заваёўнікі змянялі папярэднікаў. Гэтыя гістарычныя напластаванні карэнным чынам змянілі старажытнае аблічча беларускага горада у горадабудаўнічых адносінах, фарміравалі своеасаблівы сілуэт горада, яго твар.

І сёння, нягледзячы на тое, што горад вырас у дзесяткі разоў, а будаўніцтва прамысловых прадпрыемстваў і жылых мікрараёнаў цалкам змяніла яго аблічча, яно характэрнае менавіта тымі вышыннымі дамінантамі, якія былі ўзведзены ў XIII—XVIII стагоддзях.

— Якія асаблівасці забудовы Гродна? Як упісваюцца архітэктурныя збудаванні мінулых стагоддзяў у сучасны выгляд горада?

— Горадабудаўнічая прастора — ці то цэнтр альбо жылы раён, вышэйшая кропка горада альбо дапаможная сфера — заўсёды з'яўляецца нармальнай жыццёвай сферай жыхароў з усімі функцыянальнымі і дзелавымі атрыбутамі: транспартам, камунікацыямі, сацыяльным жыллём і г. д.

Цэнтр горада даўно стаў запаведнай архітэктурна-гістарычнай зонай. Па заданню Дзяржбуда БССР вядучымі інстытутамі рэспублікі ўважліва вывучаны ўсе помнікі. Гісторыка-архітэктурны і эканамічны аналіз іх і лёг у аснову комплекснай рэканструкцыі цэнтра. Ідзе рэстаўрацыя Брыгіцкага манастыра, гэта наша спадчына, і мы стараемся, калі не ўсё, то большасць, зберагчы яе для нашчадкаў. Але ж у дамах жывуць людзі, дамы мадэрнізуюцца (падводзяцца цеплацэнтраль, каналізацыя, водаправод), некаторыя зносяцца, упісваюцца і новыя, але з абавязковым захаваннем маштабаў забудовы, трасіроўкі вуліц. Вуліцы па магчымасці вызваляюцца ад транспарту і становяцца пешаходнымі, як, напрыклад, ужо сталі Ажэшкі, Савецкая, Маладзёжная і іншыя.

Канечне, мы не хочам зусім пазбаўляць старую частку горада новых сучасных будынкаў. Вырас тут драматычны тэатр, Палац піянераў, універмаг; іншая справа, што размяшчаць усё гэта трэба з належным тактам і пачуццём прафесійнай адказнасці...

— Архітэктурны вобраз будынка ці ансамбля ў стане расказаць не менш аб светапоглядзе грамадства, аб стылі яго жыцця, аб яго эстэтычных поглядах і густах, чым, напрыклад, карціна, якая занатавала няхай сабе і вельмі канкрэтна, але толькі адно імгненне жыцця. Рамэн Ралан гаварыў, што архітэктура — гэта акамянелая музыка.

— Музыка... Шкада, але гэта не вельмі стасуецца да сённяшняга жыцця. Хутчэй гаворка пойдзе пра тое, як пазбегнуць аднастайнасці, падабенства будынкаў і цэлых мікрараёнаў, калі браць маштаб рэспублікі.

У нас жылы фонд за дзве пяцігодкі падвоіўся. Штогод будуецца да 120—130 тысяч кв. метраў жылля. Узровень індустрыялізацыі, жыллёвага будаўніцтва дасягнуў дзевяноста працэнтаў. Канечне, архітэктурны вобраз надзелены аграмаднай сілай уздзеяння, незвычайнай магчымасцю хваляваць і ствараць настрой, арганізоўваць, расказваць. З гэтага трэба зыходзіць. І ўся бяда ў тым, што ў індустрыяльнага домабудаўніцтва пакуль што не багаты выбар сродкаў. Мы дамаглісь, да пэўнай ступені, сумесна з домабудаўнічым камбінатам таго, што пераадольваем аднастайнасць — за кошт таго, што прымяняем розныя серыі дамоў, уводзім індывідуальныя элементы ўваходаў, балконаў, а таксама рознай фактуры панелей. Але гэта толькі першы крок.

Назваць архітэктурны ансамбль, лепшы ў горадзе, яшчэ нельга. Няма яго. Ёсць арыгінальныя кампановачныя рашэнні груп будынкаў, там-сям умела выкарыстаны рэльеф мясцовасці, зялёныя насаджэнні, малыя формы архітэктуры. І пакуль што ўсё.

Калі ўзяць першы мікрараён «Фарты-1» і параўнаць яго з апошнім «Перасёлка-3», то ён выгадна адрозніваецца ад першага якраз агульным архітэктурна-планіровачным і колеравым вырашэннем. Музыка... Гэта хутчэй пра будучыню.

— Анатоль Пятровіч, калі ўжо гутарка зайшла пра будучыню, што вы можаце сказаць пра будучыню свайго горада, пра генеральны план яго забудовы?

— У гісторыі пасляваеннага перыяду горада было распрацавана тры генеральныя планы яго развіцця. Першы (1949 г.) пасля вызвалення ад фашысцкіх акупантаў, калі горад ляжаў у руінах і трэба было як мага хутчэй аднаўляць яго гаспадарку, жылы фонд. Тады эканамічная база была слабая, і рэалізацыя генеральнага плана ў асноўным была нацэлена на адбудову жылых дамоў і прамысловых прадпрыемстваў. Будаўніцтва новых будынкаў вялося ў 4—5-павярховым выкананні з цэглы—быў адноўлены цэнтр горада і закладзены асобныя новыя вуліцы.

Другі генеральны план, прыняты ў 1963 г., упарадкаваў падзел тэрыторый на зоны і ўжо ў 70-х гадах вычарпаў свае магчымасці. Бурны рост прамысловасці (хімічнай, машынабудаўнічай, харчовай і лёгкай) прадвызначыў новы этап у жыцці горада. У 1974 годзе быў распрацаваны і зацверджаны ўрадам новы генеральны план, асноўныя палажэнні якога прадугледжваюць развіццё Гродна як абласнога адміністрацыйна-гаспадарчага цэнтра, які мае гісторыка-архітэктурнае значэнне. Горад будзе развівацца кампактна, у тых межах, якія існуюць сёння. Вуліцы і магістралі будуць значна рэканструяваны з улікам пропуску асноўных відаў транспарту — тралейбуса і аўтобуса. Будуецца яшчэ адзін мост цераз Нёман—абходны, каб «разгрузіць» цэнтр. У сувязі з новай арганізацыяй транспартнага руху палепшыцца і архітэктурна-планіровачная структура горада, і па-ранейшаму ў перспектыве першаступеннае значэнне будзе ўдзяляцца комплекснай рэканструкцыі і ўпарадкаванню жылых раёнаў у гістарычнай частцы горада.

У шэрагу важнейшых перспектыўных мерапрыемстваў, адным з галоўных з'яўляецца і праектаванне і рэалізацыя эксперыментальнага паказальнага жылога раёна «Румлёва». Жылы комплекс з максімальным набліжэннем устаноў абслугоўвання знаходзіць падтрымку шырокага кола спецыялістаў і грамадскасці горада. Рэалізацыя гэтага праекта ў асноўным будзе залежаць ад магчымасцей будаўнічай індустрыі і арганізацыі будаўніцтва.

— «Прырода — лепшае з мастацтваў», — так гаварылі яшчэ ў старажытнасці. Як упісваецца прырода ў горад, што вы робіце па ахове зялёных насаджэнняў, ці павялічваюцца іх плошчы?

— Плошча зялёных насаджэнняў будзе даведзена ў нас да 650 гектараў, ці па 20 кв. метраў на аднаго чалавека. Закладваюцца новыя паркі, сквары. Упершыню ў складзе генеральнага плана распрацаваны праект прыгараднай зоны, якая зойме тэрыторыю ўкруг горада ў радыусе 20—35 км. Ужо сёння шмат зроблена для адпачынку насельніцтва — першая лесапаркавая зона шырынёй 5—7 км ужо ствараецца, у яе арганічна ўвайшлі і сады працаўнікоў.

Усякія крыніцы скідання сцёкавых водаў у раку Нёман будуць выключаны. Ужо зараз завод сінтэтычнага валакна праектуе, а ў 1979 годзе пачне будаўніцтва ачышчальных збудаванняў, ліўневых сцёкаў у раёне вёскі Ласосна на былых пясчаных кар'ерах. Не забруджваць, не засмечваць тое, што створана прыродай, мы павінны, а аберагаць, клапаціцца пра яе. Няхай мы робім толькі першыя крокі на гэтым шляху, будучыня радуе...

— Ці ўзаемадзейнічаюць у горадабудаўнічых ансамблях розныя віды і жанры манументальнага і дэкаратыўнага мастацтва? Якія магчымасці дае сучасная архітэктура для ўвасаблення задум мастака?

— Манументальнае мастацтва дасягнула сваіх найбольш значных поспехаў там і толькі там, дзе яно было свядома ўспрынята як мастацтва новай эпохі ў гісторыі чалавецтва, эпохі, якая стала сацыяльнай рэчаіснасцю. І гаворка павінна ісці аб разуменні сінтэзу архітэктуры і выяўленчага мастацтва як працэсу, што ідзе ў далёкае будучае, формы якога, відавочна, будуць значна мяняцца. Калі практыка апошніх гадоў і творчы вопыт даюць многа прыкладаў удачнага рашэння твораў манументальнага мастацтва ў шэрагу мемарыяльных комплексаў і ў будынках грамадскага прызначэння, то значна менш распрацавана праблема сінтэзу ў масавым будаўніцтве новых жылых раёнаў і кварталаў. Тут, як мне здаецца, трэба весці пошук у арганічным рашэнні ўсяго прасторавага асяроддзя, а не ва ўпрыгожванні і дэкарыраванні дамоў. Пераацэнка дэкаратыўнасці ў многіх выпадках прывяла да афармлення, якое часта было беспрадметным, чыста арнаментальным.

Шмат тут яшчэ недапрацовак, пэўных цяжкасцей і ў нас. У інстытуце «Гроднаграмадзянпраект» пакуль што не існуе майстэрні па рэалізацыі генеральнага плана горада. Праектныя аб'екты горада размеркаваны па ўсіх майстэрнях і нават па некалькіх інстытутах рэспублікі, што, натуральна, не садзейнічае рашэнню комплексных праблем.

На домабудаўнічым камбінаце, які з'яўляецца асноўным падрадчыкам у будаўніцтве жылля, дасюль не існуе цэха па вытворчасці малых архітэктурных формаў для ўпарадкавання кварталаў, у штаце адсутнічае архітэктар, што зусім не паляпшае справу.

Праблемы ёсць. Мы над імі працуем і спадзяёмся знайсці падтрымку па гэтых пытаннях у Дзяржбуда БССР, міністэрствах і ведамствах.

Абласны цэнтр Гродна на якасна новым этапе свайго развіцця, і нам бы хацелася, каб ён заўсёды заставаўся адным з самых прыгожых гарадоў рэспублікі.

Інтэрв'ю правяла
Т. БОНДАР.

ЯШЧЭ АДЗІН САМАРОДАК

Гродзенская зямля здаўна славіцца сваімі літаратурнымі талентамі. Тут стараўся «Дзённік» Фёдара Еўлашэўскага, друкавалася «Мужыцкая праўда» Кастуся Каліноўскага. Не выключана, што менавіта адсюль паходзіў напаўлегендарны Мікола Гусоўскі. На Гродзеншчыне нарадзілася палымяная паэтэса Цётка, тварыў Францішак Багушэвіч, збіраў народныя і па іх узору кампанаваў свае «песенькі» Ян Чачот. Недзе на Лідчыне жыла першая беларуская паэтэса, таямнічая Адэля з Устроні. Гродна, Слонім, Шчорсы, Навагрудак, Свіслач, Залессе, Вішнева — усё гэта прыкметныя цэнтры літаратурнага і грамадска-культурнага жыцця ў XVIII і XIX стагоддзях.

А потым літаратурную эстафету перанялі Гальяш Леўчык, Зоська Верас, Міхась Васілёк, Алесь Салагуб, Ігнат Дварчанін, Сяргей Крывец, Міхась Явар, Алесь Мілюць, Макар Краўцоў. Дзесяткі маладых літаратараў Гродзеншчыны былі звязаны з Грамадой і КПЗБ, з прагрэсіўным заходнебеларускім друкам. Седзячы ў гродзенскай турме, Браніслаў Тарашкевіч перакладаў на беларускую мову «Пана Тадэвуша».

Сёння ж, прадаўжаючы векавыя традыцыі, на Гродзеншчыне плённа працуюць члены мясцовага аддзялення Саюза пісьменнікаў БССР, якое ўзначальвае Аляксей Карпюк. Творы Дануты Бічэль-Загнетавай, Анатоля Іверса, Юркі Голуба, Міхася Дуброўскага, Аляксея Пяткевіча, Гаўрыіла Шутэнкі добра вядомы беларускаму чытачу, перакладаюцца на іншыя мовы.

На Гродзеншчыне прайшло юнацтва Янкі Брыля, да нядаўняга часу жыў Васіль Быкаў. Мацярык беларускай савецкай літаратуры быў бы намнога бяднейшы, калі б не творчасць ураджэнцаў зямлі Гродзенскай Зінаіды Бандарынай і Сяргея Дарожнага, Анатоля Дзеркача і Майсея Кульбака, Янкі Нёманскага і Ніны Тарас, Вольгі Іпатавай і Аўгінні Кавалюк, Вячаслава Адамчыка і Міколы Арочкі, Алеся Бажко і Уладзіміра Калесніка, Арсена Ліса і Алега Лойкі, Рамана Тармолы і Віктара Шымука (пералік па непазбежнасці доўгі, але прыемны). Хораша падрастае маладая змена. Толькі што я шчыра парадаваўся добрым вершам свайго земляка з Астравеччыны саўгаснага шафёра Станіслава Валодзькі, апублікаваным у сёмых нумарах часопісаў «Маладосць» і «Беларусь».

На Гродзеншчыне творча перакрыжоўваліся літаратурныя традыцыі розных народаў — беларускага, рускага, польскага, літоўскага. На розных мовах выдавала кніжкі «каралеўская» друкарня, што існавала ў Гродне ў XVIII стагоддзі. На Навагрудчыне ўзрос і чэрпаў натхненне з беларускага фальклору Адам Міцкевіч. З Гродзеншчынай звязаны жыццё і творчасць польскай рэалісткі Элізы Ажэшка. Над Нёманам нарадзіўся славуты вучоны-славіст Яфім Карскі. У Гродне прайшлі дзіцячыя гады вядомага рускага пісьменніка Юрыя Алешы. З Навагрудчыны, ад роду Кастравіцкіх, цягнецца нітачка да французскага паэта Гіёма Апалінэра.

Мне прыемна, што да гэтага вялікага пераліку сёння я магу дадаць няхай і сціплае, але новае імя. Імя ўраджэнца і жыхара Смаргоні Івана Францавіча Сініцкага. Нарадзіўся ён у 1861 годзе ў звычайнай сялянскай сям'і, памёр жа дзесьці каля 1905 года ад сухотаў, набытых у турмах і ссылцы. Яго ўспаміны «З майго жыцця ў вёсцы», напісаныя на рускай мове ў 1904 годзе, маюць не толькі гістарычную, але і літаратурную каштоўнасць. Уласна кажучы, гэта першыя (наколькі сёння вядома) мемуары ў Беларусі, якія выйшлі з-пад пяра не шляхціца, не чыноўніка, а селяніна.

Мемуары Сініцкага нядаўна мне ўдалося знайсці ў аддзеле рукапісаў Дзяржаўнай бібліятэкі СССР імя У. І. Леніна ў Маскве. Захоўваюцца яны ў фондзе вядомага рускага пісьменніка і кнігазнаўцы Мікалая Аляксандравіча Рубакіна. Сініцкі быў адным з яго шматлікіх карэспандэнтаў, аб чым сведчаць пісьмы, што ёсць у справе. Хутчэй за ўсё, успаміны былі напісаны па просьбе Рубакіна.

Аб чым жа расказвае Сініцкі? Аказваецца, у 1893 годзе ён кінуў даволі выгадную чыноўніцкую службу дзесьці на Украіне і вярнуўся на сваю радзіму, у Смаргонь, купіў тут каля мястэчка невялікі ўчастак зямлі і развёў на ім сад. Аўтар падрабязна тлумачыць свае паводзіны: па-першае, ён расчараваўся ў царскім бюракратычным апараце, у аснове якога былі пакладзены «безапеляцыйны загад адных і паслухмянае падпарадкаванне другіх», па-другое, ён «хацеў быць карысным» у сваіх родных мясцінах.

Пераехаўшы ў Смаргонь, Сініцкі разгарнуў бурную грамадскую дзейнасць: пісаў карэспандэнцыі ў газеты, абараняў сялян у судах, дапамагаў ім рознымі парадамі, пазычаў кнігі і часопісы са сваёй багатай бібліятэкі. Местачкоўцы называлі яго «талстоўцам», але сам ён сябе «талстоўцам» не лічыў. Калі раней у Сініцкага і былі якія ілюзіі адносна мірных сродкаў, то ў Смаргоні яны зніклі... «І тут толькі я выразна пабачыў, — піша ён, — які хаос пануе ў сялянскім жыцці, якая галеча, як гэтую цёмную, вартую жалю масу рабуюць розныя дзялкі, больш магутныя і багатыя,—то пры дапамозе грубай фізічнай расправы, то пры дапамозе грошай, начальства і адвакатаў; як адымаюць апошнія крошкі ў слабых, як бескантрольна распараджаецца ніжэйшая адміністрацыя, на кожным кроку топчучы і чалавечае права, і пісаныя законы, і маральныя прынцыпы».

У Смаргоні Сініцкі цесна звязаўся з моладдзю, якая «прымыкала да прагрэсіўнай партыі» (трэба падкрэсліць, што мемуары пісаліся ў турме і ссылцы, маглі, трапіўшы ў рукі паліцыі, нарабіць бяды, адсюль — такая асцярожнасць у выразах, адсутнасць канкрэтных прозвішчаў). Мясцовыя ўлады, а таксама кансерватыўныя бацькі асуджалі праявы ўсялякага свабадалюбства. «Але чым больш праследавалі моладзь, тым з большай энергіяй яна імкнулася парваць ненавісныя ёй путы і, нягледзячы на пабоі, публічныя абразы, знішчэнне рускіх кніг (калі яны трапляліся на вочы) і інш., справа асветы рухалася шпаркімі крокамі». Вакол бібліятэкі Сініцкага, у якой быў «значны запас добрых кніг», арганізаваўся нелегальны гурток. Але ў выніку даносу ў 1895 годзе «паліцыя арыштавала злашчасную бібліятэку». Пачаліся вобыскі, цкаванні.

Сініцкі апісвае мноства канкрэтных выпадкаў злоўжыванняў царскай адміністрацыі. У 1897 годзе ў Смаргоні згарэла звыш двухсот двароў. Пагарэльцы павінны былі атрымаць будаўнічую драўніну на льготных умовах. Але ляснічы прадаў яе чыноўнікам і духавенству, тыя ж перапрадавалі местачкоўцам па спекуляцыйнай цане. Аўтар спрабаваў расказаць аб усім гэтым у друку, тэлеграфаваў у Пецярбург — і ўсё дарэмна. Рэвізор атрымаў ад ляснічага нямала «каштоўнага металу», таму нават не выклікаў сведак. Ляснічы ж стаў яшчэ адным заклятым ворагам аўтара.

Або такі выпадак. У Смаргоні тады шырока быў пастаўлены выраб скур. На скураных заводах працавала каля тысячы рабочых. Будаваліся гэтыя заводы (за хабар), дзе папала. Ніякіх фільтраў, зразумела, не было. І сцёкавыя воды, заражоныя сібірскай язвай, скідваліся прама ў рэчку. Сяляне не мелі дзе браць ваду, паіць жывёлу. Тады Сініцкі напісаў скаргу віленскаму губернатару. Прамыслоўцы ж абвялі губернатара вакол пальца. Яны прывялі яго ў тое месца, дзе рэчка запавольвала бег, паказалі на некалькі трэсак, што плылі ў супрацьлеглым кірунку (іх цягнуў на нітачках схаваны ў кустах чалавек)—і саноўнік паехаў, перакананы ў тым, што заводы не могуць забруджваць ваду местачкоўцам, паколькі яны размешчаны... ніжэй па цячэнні.

Многія старонкі ўспамінаў Сініцкага прысвечаны смаргонскаму пралетарыяту. «Умовы працы на заводах, — абураўся аўтар, — настолькі цяжкія, а гігіенічныя і санітарныя ўмовы настолькі дрэнныя, што чалавек у 40—45 год, калі ён не паміраў ад сібірскай язвы, ад якой штогод гіне не менш дзесяці чалавек, лічыцца інвалідам, або, кажучы прасцей, жабраком». Становішча рабочых не змянілася і пасля прыняцця закона аб тым, што працоўны дзень не павінен працягвацца больш адзінаццаці з паловай гадзін. «У заводчыкаў па-старому рабілі 12, 13 і 14 гадзін у суткі пры абуральных санітарных умовах і пры празмерным напружанні сіл, атрымоўваючы параўнальна невялікую заработную плату. Затое заводчыкі нажывалі вялікія капіталы. Дастаткова сказаць, што адзін заводчык-селянін, які меў у 1893 годзе наяўнага капіталу чатыры тысячы рублёў, — у 1901 годзе меў ужо тысяч 30—35».

Смаргонскія рабочыя, асабліва моладзь, не мірыліся з такім здзекам. Яны пачалі «дабівацца паляпшэння свайго становішча шляхам невялікіх забастовак». У цэнтры гэтай барацьбы аказаўся аўтар мемуараў. У мястэчку яго лічылі «натхніцелем рабочых у барацьбе з гаспадарамі».

У 1901 годзе Сініцкаму з вялікай цяжкасцю ўдалося выехаць за граніцу. Мы пакуль што не ведаем, дзе ён быў і што рабіў. Але вельмі праўдападобна, што якраз ён меў дачыненне да той ананімнай карэспандэнцыі пра стачкі смаргонскіх рабочых, якая з'явілася ў ленінскай «Искре» 20 снежня 1901 года. Сініцкі мог быць яе аўтарам або інфарматарам.

Вярнуўшыся з-за мяжы, аўтар увесь аддаўся падпольнай рабоце: арганізоўваў забастоўкі, пашыраў нелегальныя выданні. Але тут знайшліся правакатары. Сініцкага арыштавалі і накіравалі ў віленскую губернскую турму. Пракурор абвінавачыў яго «ў прыналежнасці да тайнага згуртавання, якое мела мэтай звяржэнне існуючага парадку». Усяго па справе Сініцкага было арыштавана больш чым сто чалавек. З іх 36 чалавек прыгаварылі да ссылкі ва Усходнюю Сібір і губерні Поўначы, а больш як 70 чалавек пакінулі пад наглядам паліцыі.

У віленскай турме (дарэчы, там пачалі пісацца мемуары) Сініцкі пазнаёміўся з вельмі цікавымі падпольшчыкамі. «І як шкада, што такі мастак пяра, як Горкі, не мог чуць і назіраць гэтых людзей, паміж якімі адзін беларус, з выгляду такі мізэрны і просты, прывёў мяне ў сапраўднае захапленне сваімі перадавымі поглядамі, веданнем грамадскага жыцця і вастрынёй свайго розуму. Трэба, дарэчы, зазначыць, што гэта не просты вясковы жыхар, а неспакойны туляга (нельга сказаць — бадзяга), які за 25 год пабываў не толькі ва ўсіх вялікіх рускіх гарадах, але і ў многіх партовых гарадах Еўропы, Азіі і Афрыкі».

І вось разам з іншымі ссыльнымі Сініцкага накіравалі ў Валагодскую губерню.

На апошніх старонках успамінаў аўтар скардзіцца, што яго здароўе катастрафічна пагоршылася...

Мемуары Сініцкага напісаны страсна, даволі яркай і вобразнай мовай. З іх відаць, што смаргонскі рэвалюцыянер меў літаратурны талент, быў шырока адукаваным чалавекам. У тэксце часта сустракаюцца спасылкі і паралелі, узятыя з твораў Гогаля, Талстога, Горкага. Аўтар згадвае свае іншыя літаратурныя спробы, якія пасылаліся ў рэдакцыі віленскіх газет (варта было б заняцца іх пошукамі).

Імя смаргонскага літаратара-рэвалюцыянера заслугоўвае нашай асаблівай памяці напярэдадні 60-годдзя БССР і Кампартыі рэспублікі. Гэта быў адзін з тых нязломных людзей, якія будзілі народную свядомасць, змагаліся за лепшую будучыню.

Адам МАЛЬДЗІС.

«Залатыя каласы» А. Астрэйні, «Нарачанскія сосны» А. Дзеружынскага, «Бяроза н ь к а» Д. Бічэль-Загнетавай, «Ручнічок», «Добры дзень, гарадняне», «Слуцкія паясы» Я. Насуты і іншыя вершы паклаў на музыку самадзейны кампазітар, кіраўнік аркестравай групы ансамбля танца «Вянок» Палаца культуры хімікаў у Гродне Яўген Петрашэвіч. Яго песні выконваюць самадзейныя артысты з народнага ансамбля песні і танца «Нёман», «Дзень добры, горад Ліда» на словы У. Васько выконвае ансамбль песні і танца «Чаравічкі», а песню «Белы снег» на словы Л. Паўлені — Дзяржаўны народны хор БССР.

На здымку: Яўген Петрашэвіч.

ПРАГА

Наведваючы Шчучыншчыну, адразу ўспамінаеш вядомую беларускую паэтэсу-рэвалюцыянерку, грамадскага дзеяча, выдаўца Алаізу Пашкевіч, якая ў гісторыю сусветнай культуры (а стогадовы юбілей з дня нараджэння яе пазалетась па рашэнню ЮНЕСКА ўрачыста святкаваўся ва ўсім свеце) увайшла пад прозвішчам Цётка. Тут, у вёсцы Пешчына, яна нарадзілася, тут бегала басаногай дзяўчынкай, заслухоўваючыся казкамі, песнямі і паданнямі, якія чула ад сваёй старой нянькі Ягасі, і тут лягла яна ў родную зямлю назаўсёды ля старога гасцінца, што вядзе ў вёску Стары Двор.

А дагэтуль былі доўгія вандроўкі, пакуты і сумненні, пошукі і расстанні, страты і перамогі. А яшчэ была любоў да Бацькаўшчыны, тая ўсепераможная, ненатольная любоў, якая з аднолькавай сілай сагравае чалавечае сэрца і ў раннім юнацтве, і ў сталым узросце.

На магіле ўзыду дубам,
Пачну шаптаць братнім губам
Аб іх долі, аб свабодзе,
Стану песняй у народзе!

Жаданне паэтэсы збылося. Сапраўды, яна даўно стала песняй у родным народзе, вершы яе з радасцю чытаюць удзячныя чытачы, і найперш, вядома ж, землякі.

Найлепшае сведчанне таго, што шчучынская зямля не толькі захоўвае памяць аб сваёй славутай землячцы, а і па-ранейшаму бруіцца крынічкамі народных талентаў, — раённае літаратурнае аб'яднанне, якое створана і працуе пры рэдакцыі мясцовай газеты «Савецкая вёска». Менавіта з яе старонак часта гучыць голас маладых аўтараў, тых, хто пакуль што робіць толькі першыя крокі па нялёгкай літаратурнай дарозе.

Нямала па згуртаванню творчых сіл пачаткоўцаў, па выхаванню і фарміраванню ў іх правільнага мастацкага густу, па авалодванню няпростымі сакрэтамі майстэрства зрабіла маладая беларуская паэтэса, аўтар двух зборнікаў вершаў Марыя Шаўчонак, якая доўгі час працавала ў рэдакцыі «Савецкай вёскі». Цяпер Марыя пераехала ў Гродна, але добрыя літаратурныя традыцыі ў калектыве не заглухлі. І ў гэтым у першую чаргу заслуга рэдактара «раёнкі» Абрама Данілавіча Змудзяка, які шчыра зацікаўлены ў тым, каб пачынаючыя паэты і празаікі заўсёды знаходзілі сяброўскую падтрымку, а лепшым творам іх давалася «зялёная вуліца». Ахвотна дае парады аўтарам, разглядае іх вершы, апавяданні і цяперашняя загадчыца аддзела пісем і масавай работы, вопытны журналіст, чалавек тактоўны і ўважлівы Алена Лагуновіч.

Шчучынцы, думаецца, знайшлі правільны, найбольш аптымальны варыянт друкавання твораў пачаткоўцаў. Тут не імкнуцца абавязкова рэгулярна даваць цэлыя літаратурныя старонкі. У газеце можна сустрэць і невялічкія куткі паэзіі з твораў аднаго ці некалькіх аўтараў, і асобны верш пачаткоўца, і адно апавяданне, змешчанае поруч з матэрыяламі вытворчай тэматыкі.

Падобная практыка фактычна выключае публікацыю твораў яўна слабых (крытэрыі тут, безумоўна, свайго, раённага маштабу) толькі з-за таго, што неабходна падрыхтаваць і выпусціць чарговую тэматычную старонку, а такая патраба-

ДУШЭЎНАГА АБНАЎЛЕННЯ

вальнасць аўтарам ідзе толькі на карысць.

Любоў да Цёткі, захапленне яе неўміручым талентам... Ці не яна сведчанне таго, што многія вершы пачаткоўцаў часам бы паўтараюць так добра ўсім вядомыя нам яе радкі пра хараство наднямонскіх прастораў, якія штодня дораць чалавеку радасць адкрыцця? Хоць бы тыя, дзе паэтэса піша пра светлую летнюю пару:

Ніва шуміць каласамі
Жыта спелага, аўса;
Уся прыбрана васількамі,
Як дзяўчына да вянца...

А вось як хораша, проста і разам з тым адкрыта-даверліва глядзіць на родныя прасторы Вольга Русілка:

Выспеў ранак-мудрэц
неўзаметкі,
Ціха ветрыкам шэпча ён:
«Глянь, жывыя смяюцца кветкі!
Ці не лепш, як дзівосны сон?»

Так, неблагой атрымалася ў яго «Песня пра камсамольца Клімака», які выратаваў ад пажару грамадскую жывёлу. Удалая спроба асэнсаваць падзеі штодзённасці ў іх дыялектычнай сувязі адчуваецца ў «Хатынскім звоне»:

Хатынскі звон,
Як вузел болю,
Перавязаў маю душу.
Крывёй загінуўшых пішу,
Іду па іх суровым полі.

Сама тэхніка вершаскладання часам жадае лепшага ў творах настаўніцы Берштаўскай сярэдняй школы, выкладчыцы мовы і літаратуры Любові Русілкі, але паэзія яе — на дзіва жаноцкая па свайму гучанню, мілагучная па танальнасці, светлая па ўспрыманню рэчаіснасці. Л. Русілка часцей за ўсё расказвае пра тое, што добра ведае: пра хараство роднай зямлі, пра адданасць ёй, пра вечную зменлівасць пор года, якія аднак кожны раз пасвойму прывабныя і непаўторныя. І гучыць у яе творчасці адна вялікая песня пра Радзіму, суровымі акордамі ў якую ўрываецца мінулая вайна, што па-сённяшні дзень стукае ў сэрцы людзей.

Свае вобразы ў Гвідона Ждановіча:

Красуе жыта. Пах салодкі...
Схмялеў мурожны травастой.
Лілеяў беленькія сподкі
Духмяны разлілі настой.

У творчасці сваёй Г. Ждановіч — традыцыяналіст, таму так уважлівы ён да слова, імкнецца пісаць даходліва і зразумела:

Запахла сенам маладым
І сырадоем з-пад аселіц.
Перад вачыма светлы дым
Прастор рамонкавы шавеліць.

Дарэчы, Г. Ждановіч — адзін са старэйшых і найбольш творча здольных членаў мясцовага літаратурнага аб'яднання. Нарадзіўся ён у вёсцы Уборак Асіповіцкага раёна, у тутэйшых мясцінах аказаўся пасля заканчэння ВНУ. Юрыст па адукацыі, адвакат па спецыяльнасці, Г. Ждановіч у большасці сваіх твораў паўстае перад чытачом тонкім лірыкам, які ўмее не толькі дакладна схопліваць той ці іншы стан душы лірычнага героя, а і перадаць увесь працэс пазнання наваколля ў яго эмацыянальна - экспрэсіўнай разнастайнасці, у багацці фарбаў і адценняў.

Вось чаму за знешняй мажорнасцю некаторых вершаў пачынаючага паэта лёгка заўважаецца, угадваецца той унутраны падтэкст, які ў кожным новым выпадку дазваляе бачыць іншы, раней невядомы змест, таму ўжо знаёмае ўспрымаецца часта як першароднае, дагэтуль не бачанае. Як, напрыклад, у гэтым невялікім творы «Роднае поле», пазначаным свежасцю ўспрымання рэчаіснасці:

О, як лёгка і вольна,
І як светла душы!..
Побач роднае поле—
Васількі на мяжы.
Пахне спеласцю жніўня
І ячмень, і авёс.
Перапёлчыным ліўнем—
Захлынула да слёз.
Белапенная грэчка,
Як дзяўчына ў фаце.
Звонкі жаўранак сведчыць,
Што тут лепей, як дзе...

Г. Ждановіч спрабуе пашыраць тэматычныя рамкі сваёй творчасці: ад вершаў прыроднага, пейзажнага плану ўсё часцей пераходзіць да лірыкі грамадзянскай («Правады» «Крэўнасць», «Хатынскі звон» і іншыя.) Праўда, тут яму не заўсёды ўдаецца сказаць сваё важкае слова. У такіх творах часам паўтараюцца агульнавядомыя матывы, аўтар не ідзе далей дэкларацыйнага, нейкага аголенага сцвярджэння прапісных ісцін. Усё гэта, думаецца, вынік няўмення сарыентавацца ў багатым патоку паэтычнай інфармацыі, так сказаць, апрабіраваць уласныя перажыванні па пачуццях лірычнага героя.

І наадварот, калі аўтар выразна бачыць сваю паэтычную задуму, усведамляе тую задачу, якую ставіць перад сабой, пошук прыносіць яму плён.

Свае вобразы ў Гвідона Ждановіча:

Красуе жыта. Пах салодкі...
Схмялеў мурожны травастой.
Лілеяў беленькія сподкі
Духмяны разлілі настой.

У творчасці сваёй Г. Ждановіч — традыцыяналіст, таму так уважлівы ён да слова, імкнецца пісаць даходліва і зразумела:

Запахла сенам маладым
І сырадоем з-пад аселіц.
Перад вачыма светлы дым
Прастор рамонкавы шавеліць.

Дарэчы, Г. Ждановіч — адзін са старэйшых і найбольш творча здольных членаў мясцовага літаратурнага аб'яднання. Нарадзіўся ён у вёсцы Уборак Асіповіцкага раёна, у тутэйшых мясцінах аказаўся пасля заканчэння ВНУ. Юрыст па адукацыі, адвакат па спецыяльнасці, Г. Ждановіч у большасці сваіх твораў паўстае перад чытачом тонкім лірыкам, які ўмее не толькі дакладна схопліваць той ці іншы стан душы лірычнага героя, а і перадаць увесь працэс пазнання наваколля ў яго эмацыянальна - экспрэсіўнай разнастайнасці, у багацці фарбаў і адценняў.

Вось чаму за знешняй мажорнасцю некаторых вершаў пачынаючага паэта лёгка заўважаецца, угадваецца той унутраны падтэкст, які ў кожным новым выпадку дазваляе бачыць іншы, раней невядомы змест, таму ўжо знаёмае ўспрымаецца часта як першароднае, дагэтуль не бачанае. Як, напрыклад, у гэтым невялікім творы «Роднае поле», пазначаным свежасцю ўспрымання рэчаіснасці:

О, як лёгка і вольна,
І як светла душы!..
Побач роднае поле—
Васількі на мяжы.
Пахне спеласцю жніўня
І ячмень, і авёс.
Перапёлчыным ліўнем—
Захлынула да слёз.
Белапенная грэчка,
Як дзяўчына ў фаце.
Звонкі жаўранак сведчыць,
Што тут лепей, як дзе...

Г. Ждановіч спрабуе пашыраць тэматычныя рамкі сваёй творчасці: ад вершаў прыроднага, пейзажнага плану ўсё часцей пераходзіць да лірыкі грамадзянскай («Правады» «Крэўнасць», «Хатынскі звон» і іншыя.) Праўда, тут яму не заўсёды ўдаецца сказаць сваё важкае слова. У такіх творах часам паўтараюцца агульнавядомыя матывы, аўтар не ідзе далей дэкларацыйнага, нейкага аголенага сцвярджэння прапісных ісцін. Усё гэта, думаецца, вынік няўмення сарыентавацца ў багатым патоку паэтычнай інфармацыі, так сказаць, апрабіраваць уласныя перажыванні па пачуццях лірычнага героя.

І наадварот, калі аўтар выразна бачыць сваю паэтычную задуму, усведамляе тую задачу, якую ставіць перад сабой, пошук прыносіць яму плён.

Так, неблагой атрымалася ў яго «Песня пра камсамольца Клімака», які выратаваў ад пажару грамадскую жывёлу. Удалая спроба асэнсаваць падзеі штодзённасці ў іх дыялектычнай сувязі адчуваецца ў «Хатынскім звоне»:

Хатынскі звон,
Як вузел болю,
Перавязаў маю душу.
Крывёй загінуўшых пішу,
Іду па іх суровым полі.

Сама тэхніка вершаскладання часам жадае лепшага ў творах настаўніцы Берштаўскай сярэдняй школы, выкладчыцы мовы і літаратуры Любові Русілкі, але паэзія яе — на дзіва жаноцкая па свайму гучанню, мілагучная па танальнасці, светлая па ўспрыманню рэчаіснасці. Л. Русілка часцей за ўсё расказвае пра тое, што добра ведае: пра хараство роднай зямлі, пра адданасць ёй, пра вечную зменлівасць пор года, якія аднак кожны раз пасвойму прывабныя і непаўторныя. І гучыць у яе творчасці адна вялікая песня пра Радзіму, суровымі акордамі ў якую ўрываецца мінулая вайна, што па-сённяшні дзень стукае ў сэрцы людзей.

Біяграфія Івана Пяшко ў пэўнай ступені тыповая для той часткі маладых людзей, маленства якіх прыпала на першыя пасляваенныя гады. Нарадзіўшыся ў 1941 годзе, тут жа, у Прынямонні, у вёсцы Лішчыцы Гродзенскага раёна, ён скончыў сярэднюю школу ў Скідалі, прафесіянальна - тэхнічнае вучылішча. Праца электраманцёрам, потым служба ў радах Савецкай Арміі стала для юнака той жыццёвай школай, якая не толькі загартавала яго фізічна і маральна, але і нарадзіла жаданне далей спасцігаць таямніцы няпростага свету ведаў.

І. Пяшко вучыцца на гістарычным факультэце Гродзенскага педагагічнага інстытута імя Янкі Купалы, працуе настаўнікам, завучам, дырэктарам адной са школ тут жа, у Шчучынскім раёне. У 1975 годзе заканчвае Вышэйшыя сцэнарныя курсы ў Маскве, выкладае гісторыю і грамадазнаўства ў сярэдняй школе імя В. Урублеўскага ў гарадскім пасёлку Жалудок (дарэчы, Віктар Урублеўскі, легендарны генерал Парыжскай Камуны, нарадзіўся ў Жалудку).

Менавіта гэтыя гады сталі тым перыядам у ягонай біяграфіі, калі ўпершыню ўзнікла неадольнае жаданне аб многім зведаным, убачаным і перажытым расказаць у мастацкіх творах. Сваё першае апавяданне «Ірына Аляксееўна», пазначанае спробай асэнсаваць тое, што добра вядома яму, І. Пяшко змясціў у 1968 годзе на старонках «Савецкай вёскі».

Безумоўна, сёння з вышыні творчага вопыту аўтара, няхай і не такога ўжо вялікага (летась ў выдавецтве «Мастацкая літаратура» выйшла першая кніга апавяданняў І. Пяшко «Чырвоная клубніка»), бачыцца пралік як з боку самой задумы, так і належнага мастацкага асэнсавання. Але пачатак акрыліў маладога аўтара, усяліў у яго надзею на новыя поспехі.

Новыя апавяданні яго, як тыя, што змяшчаліся ў «Савецкай вёсцы», так і тыя, якія траплялі на старонкі рэспубліканскай перыёдыкі, засведчылі, што І. Пяшко мае безумоўныя творчыя задаткі. Чаго не хапае яму, дык, думаецца, умення з багатага фактычнага дакументальнага матэрыялу, часцей за ўсё ўласна перажытага, адабраць самае важнае, тое, што, адлюстраваўшыся ў лёсе аднаго канкрэтнага чалавека, па свайму сацыяльна - грамадскаму і маральна - этычнаму зместу становіцца потым вартым увагі многіх.

Разам з тым І. Пяшко ўмее пісаць пераканаўча, адчуваючы тонкія зрухі ў людской псіхалогіі.

У гэтых адносінах асабліва цікавае апавяданне «У другі выхадны дзень». Герой яго, вясковы настаўнік, дырэктар васьмігадовай школы Віктар Пятровіч Ляшчэня (персанаж, як нам здаецца, мае пэўныя аўтабіяграфічныя рысы) з тых душэўна - чыстых, адкрыта-даверлівых людзей, у жыцці якіх праца адзін з самых важных, калі не галоўных, заняткаў. Ей яны аддаюць сябе поўнасцю, без астатку, нават «у другі выхадны дзень», які надараецца ў педагога, калі няма прадметных гадзін.

Не абмінае аўтар сваёй увагай і такую важную тэму, як Вялікая Айчынная вайна. Памяць аб ёй, боль аб загінуўшых, вернасць іх справам гучыць у апавяданнях «Чырвоная клубніка», «Гудок», «Лыжка». Творы гэтыя, безумоўна, розныя па сваіх мастацкіх вартасцях (больш моцным нам здаецца «Гудок»), але аднолькава ўзрушваюць і хвалююць, бо напісаны на матэрыяле, які ніколі не старэе. Чалавечая памяць — той камертон, па ваганнях якога, часам ледзь заўважных, непрыкметных, лірычны герой аўтара вызначае свае адносіны да сённяшняга дня, выяўляе сваю грамадзянскую пазіцыю, пазіцыю чалавека, што жыве па самаму высокаму рахунку.

Асобна стаяць у сённяшняй творчасці І. Пяшко апавяданні, зместам сваім звязаныя з сучаснай вёскай. Праўда, аўтар пакуль што як бы пазбягае чыста вытворчых канфліктаў, засяроджваючы сваю ўвагу на падзеях больш лакальнага плану, найчасцей за ўсё — маральна - этычнага, хоць тут, як напрыклад, у апавяданні «Бабульчына піва», рамкі гаворкі больш шырокія, чым можа падацца на першы погляд. Прывязанасць да бацькоўскага кута, да таго гнязда, дзе чалавек узгадаваўся і рос, тут гучыць як лучнасць з радзімай увогуле, як вернасць зямлі, якую нідзе ні пры якіх абставінах нельга забываць.

У апошні час, праўда, І. Пяшко пачаў друкавацца параўнальна мала. Праца на адказным ідэалагічным участку (ён сакратар парткома адной з гаспадарак раёна), безумоўна, адбірае шмат часу, патрабуе пастаяннай энергіі, увагі да сябе. Разам з тым, гэтая работа, як ніякая іншая, дае мажлівасць пастаянна знаходзіцца сярод людзей, жыць іх запатрабаваннямі, адчуваць іх інтарэсы, дзяліць клопаты і турботы. Усё гэта, думаецца, у далейшым вельмі спатрэбіцца аўтару для напісання новых твораў, якія б хацелася бачыць тэматычна звязанымі з сённяшняй вёскай, у якой адбываюцца складаныя працэсы, нараджаецца і расце новы чалавек — селянін эпохі навукова-тэхнічнай рэвалюцыі.

Акрамя ўжо названых В. Русілкі, Г. Ждановіча, Л. Русілкі, І. Пяшко, з першымі творамі выступілі настаўнікі Міхась Марук, Яўген Варонін, выпускніца Ракавіцкай сярэдняй школы Таццяна Заянчукоўская... На чарзе — адкрыццё для раённага чытача імён тых, хто толькі яшчэ спрабуе пісаць і пакуль што атрымлівае з рэдакцыі лісты з падрабязнымі разглядамі вершаў, замалёвак...

Алесь МАРЦІНОВІЧ.
г. Шчучын.

Сяргей БАНДАРЭНКА

Ідуць беларусы

А хто там ідзе, а хто там ідзе
У агромністай такой грамадзе?
– Беларусы.

Я. КУПАЛА.

Ці варта пытацца: «А хто там ідзе
Паважнай хадой без прымусу?»
Сягоння па песнях, што льюцца з грудзей,
Спазнаеш: ідуць беларусы.
А што яны свету нясуць напаказ,
Сумленныя гэтыя людзі?
Мо крыўду-бяду, што калісьці не раз
Пякла іх апалыя грудзі?
— О, не! Не галечу спрадвечнай глушы,
Не крыўду і цяжкае гора, —
Нясуць яны шчасце і веліч душы,
Раскутай пад залпы «Аўроры».
Куды ж яны крочаць, ці трэба гадаць,
Ці трэба пытацца пра гэта?
— Сузорныя дні камунізму спаткаць —
Вось іхняя слаўная мэта!
А што ж асвятляе іх сонечны шлях
Да смелых здзяйсненняў і славы?
— Агонь барацьбы, што ў грудзях не зачах,
І мудрага Леніна справы.
А хто ж іх штодзённа наперад вядзе
У светлыя, мірныя далі?
— Вялікая партыя — гонар людзей,
Якую матуляй празвалі...
Ідуць беларусы — арліная рацъ—
Пад гоман жытоў і заводаў.
Нікому хады іх цяпер не стрымаць
У братнім саюзе народаў!

Анатоль ІВЕРС

●

Па-над Слонімам стыне
Неба — сіні плакат.
Я стаю на вяршыне,
Над вачамі — рука.

Сонца ўсходзіць за лесам —
Іскры пырскамі ўвысь.
З-за стагоддзяў завесы
Ўдаль плывуць паплавы.

Можа, полк з атаманам
Тую даль варушыў?
Ці палотны туманаў
Разыходзяцца ўшыр?

І блішчаць, нібы пікі,
(Усё гляджу з-пад рукі) —
Сонца сыплюцца блікі
На праталкі ракі.

Полк з уяўнасці, чараў
Адышоў пакрысе.
І адкрылася Шчара
У непаўторнай красе.

Васіль СТРУМЕНЬ

Вёску Зачэпічы на Дзятлаўшчыне нездарма называюць гняздом паэтаў. У 20—30-х гадах яе праславілі заходнебеларускія паэты Пятрусь Граніт і Васіль Струмень, якія там жылі і вялі барацьбу з прыгнятальнікамі.

Зараз В. Струмень (Аляксандр Мікалаевіч Лебедзеў) жыве ў г. Сарны на Украіне, піша вершы на беларускай і ўкраінскай мовах.

Песня пра Гродна

Пазнаёмілі сёння з табой
Клёны пышныя вуліц тваіх,
Захапіўся нябёс глыбінёй,
Ззяннем Нёмана хваль
залатых.
Ты з маленства мне стаў
дарагім,
Бо ад беліцкіх нашых
мясцін
Нёман мой працягнуў берагі
Сярод нашых квяцістых
раўнін.
І я ўспомніў аб цяжкіх гадах,
Як была тут прыгону пара:
Пасвіць коней вадзіў
па начах,
Ногі босыя грэў ля кастра.
Любаваліся бацька і дзед
Старым стылем тваіх
камяніц,
Як ракою ганялі плыты
Да літоўскіх і прускіх граніц.
Паднявольныя мукі даў лёс
Беднаце нашай панскі закон.
Але мужна ўсё перанёс,
Пакуль волю здабыў,
плытагон.
Абнаўленне тваё праслаўляць
Я сягоння хачу ўсёй душой.
Будзеш вечна расці,
красаваць
Над любімаю роднай ракой.

Марыя ШАЎЧОНАК

Імёны светлыя людзей

Як без зязюлі лес вясновы,
Як стол святочны без гасцей,
Душа маркоціцца без слова,
Якое трэба ўсё часцей.
Яно жыве у той старонцы,
Дзе застаецца першы след,
Там, дзе ў крынічцы тоне
сонца
І шчасцем свеціцца ўвесь свет.
Дзе даль палёў, лясныя
ўзгоркі —
Як сведкі памятных падзей,
Дзе загараюцца, як зоркі,
Імёны светлыя людзей.

ВАРТЫЯ АПЛАДЫСМЕНТАЎ

АКЦЁРЫ... Колькі пра іх сказана добрых і ўзнёслых слоў! І не будзе імскопу — тырадам захаплення і замілавання: такая гэтая прафесія. І як бы ні ўгаворвалі сваіх унучак практычныя бабулі, як бы ні палохалі рознымі «жахлівымі» гісторыямі з акцёрскага жыцця, кожнае лета тэатральныя навучальныя ўстановы штурмуюць тысячы юнакоў і дзяўчат: на адно месца — дзесяткі прэтэндэнтаў. Магія рампы — магутная, цяга да яе — неадольная.

Сёння ў Гродне працуюць тыя, што пачыналі свой шлях без якіх-небудзь «універсітэтаў», і — пераважная большасць — выхаванцы нашага інстытута, вучні Д. Арлова, В. Рэдліх, А. Бутакова, У. Маланкіна і іх калег. Тыя, для каго ўзорам былі і застануцца Б. Платонаў і Л. Ржэцкая, Л. Рахленка і З. Стома, А. Клімава і Р. Янкоўскі, І. Ждановіч і С. Станюта... Зрэшты, і яны самі, гродзенцы, маюць ужо вопыт і майстэрства.

Глядач любіць сустрэчы з прызнаным акцёрам у розных спектаклях, параўноўвае, здзіўляецца пераўвасабленню. Любіць і адкрываць для сябе новае ў нядаўніх дэбютантаў. Гэта дзівоснае ўражанне — адчуць сілу акцёрскага ўздзеяння, слова, рэплікі, маналога, жэста, позірку, паўзы, мімікі... У трупе тэатра цяпер шмат цікавых творчых індывідуальнасцей.

●

Размаўляць з Н. Караткевіч у дзень яе спектакля цяжка. Удзень, як заўсёды, — рэпетыцыя; пасля — прыкметная адчужанасць ад субяседніка з-за стомленасці, з-за таго, што думкі ўжо на вячэрнім спектаклі. І адпачынак, калі гэта магчыма, і абавязак — сабрацца перад спектаклем. Аднойчы на гастролях у зялёным украінскім горадзе ў спякотны дзень усе, хто мог, хоць на гадзінку ўцякалі да ракі, а ў яе вечарам спектакль, і трэба быць у форме. Бывай, рака! Бывай, ветрык над блакітам!... Калі ў яе няма спектакля, яна зноў, насуперак спадзяванням, сканцэнтраваная і не вельмі гаваркая. Няўжо ўсе думкі — аб спектаклі, аб новай ролі? Можа, чалавеку, які працуе на службе пэўны адрэзак часу, а пасля работы яго адольваюць клопаты моднага цяпер хобі, і цяжка гэта зразумець. Ды яна — такая! Бо яе работа — творчасць. А творчасць вымагае ад цябе ўсяго жыцця да рэшты. Зразумела, калі табе даручаюць ролю Камісара ў «Аптымістычнай трагедыі», ты пачынаеш арыентавацца на класічныя спектаклі Камернага, Вялікага Ленінградскага, Рускага тэатра БССР, адначасова мабілізуючы ўсе духоўныя сілы, каб сказаць пра гераіню нешта сваё. Камісар тады з табой і ў табе заўсёды. Кожную хвіліну...

Было так — перад пачаткам спектакля Н. Караткевіч сказала, што нядобра сябе адчувае, а тут яшчэ і сын прыхварэў, іншыя непрыемнасці. Мільганула думка: можа, прыйсці на гэты спектакль у наступны раз? Ды празвінеў трэці званок, і літаральна праз некалькі хвілін неўтаймоўная весялосць яе гераіні — свахі Ханумы, задор яе, песні, танцы захапілі ўсіх персанажаў на сцэне, быццам камертон, задалі тон усяму спектаклю. І захапілі залу. Яна была ў свеце сцэны! Назаўтра ўжо артыстка гранічна верагодна паказвала нам пранізліва трагічны лёс маладой жанчыны ў спектаклі «Арфей сыходзіць у пекла». Тут у Н. Караткевіч стрыманая манера выканання, і нам, гледачам, перадаецца трапяткая надзея на шчасце яе гераіні — Лэйдзі Торэнс, перадаецца духоўнае напружанне чакання і барацьбы за яго.

Наогул, перамога чакае Н. Караткевіч там, дзе яна сустракаецца з моцным, актыўным характарам гераіні, незалежна ад жанру спектакля. Нават у такой шырокавядомай п'есе А. Астроўскага, як «Беспасажніца», цяжка было дамагчыся поўнага поспеху, бо спектакль у Гродне быў менш за ўсё аб беспасажніцы Ларысе, а больш — аб тых злых сілах, якія гуляюць з яе лёсам. Затое ў паядынку з Карандышавым прарываліся бліскучыя моманты прасвятлення гэтай таленавітай і чулай да хараства жанчыны...

●

Прайшло ўжо даволі шмат часу пасля прагляду спектакля «Ханума», ды ў памяці стаіць так, быццам бачыў яго ўчора, невысокі, нязграбны, але на дзіва сімпатычны Акоп. Яго на сцэне прыкмячаеш адразу, хоць гэты персанаж яшчэ не вымавіў ніводнай рэплікі. Міжволі задумваешся: каго ж гэта ён нагадвае? Герояў Чапліна? Так, падабенства ёсць! І не толькі знешняе. А можа, традыцыйных камедыйных персанажаў у грузінскіх камедыях? Часткова — і іх. І слова «іграе» ролю тут неяк не падыходзіць — такі рэальны чалавечы характар бачыш на сцэне. Яго ногі, якія прыскокваюць не ў такт і нясвоечасова; яго скаваныя ў руках рукі; яго запаволенасць ва ўсім, слабае пагойдванне галавой у такт музыцы — усё гэта стварае непаўторнае аблічча Акопа. Звычайным рацыянальным разлікам, нават з пэўнай доляй акцёрскага майстэрства такі вобраз не створыш. Патрэбна поўнае захапленне жыццём героя. Трэба ведаць пра яго ўсё і як мага паўней перадаць гэта гледачам. Праўду кажучы, роля не такая ўжо і вялікая, не так ужо выпукла выпісана ў п'есе, але дзякуючы выкананню яе У. Мішчанчуком запамінаецца. Акоп робіцца такім жа ясным і такім жа зразумелым, як і сама Ханума.

Кантрастам паўстае побач другая работа артыста: роля нейкага прайдзісвета Жлукты ў камедыі «Мілы чалавек» Кандрата Крапівы. Тут усё інакшае: тон, гаворка, рухі, жэсты. Роля Жлукты дадзена драматургам у развіцці, і артыст выкрывае ўсе рысы характару і падкрэслівае адценні ўчынкаў свайго агіднага персанажа. Спачатку ў героя У. Мішчанчука выверана інтанацыя, падкрэслена ветлівыя манеры абыходжання з людзьмі, ды паступова ўпэўненасць пераходзіць у нахабства. На нашых вачах трансфармуецца стыль паводзін гэтага Чарскага (Жлукты). І мы бачым тыповую фігуру прайдзісвета-авантурыста.

Гэтыя дзве, такія розныя, нічым не падобныя, ярка сыграныя ролі сведчаць аб дынамічных творчых магчымасцях артыста. І прамовім гэта слова: аб яго таленце. Думаецца, не варта асцярожнічаць і па розных прычынах пазбягаць гэтага слова ў ацэнцы работы артыстаў, калі яны таго заслугоўваюць, і прыберагаць яго да юбілейных дат, далёкіх ад мінладосці і творчага росквіту. А тое, што У. Мішчанчук ад прыроды таленавіты артыст, сумняваецца няма падстаў. Гэта ён пацвярджае ў класічным рэпертуары і ў сучасных п'есах, у высокай драме і ў вадэвілях, у лірычнай споведзі і ў сатырычным гратэску.

●

Хораша, што калектыў мае ў сваім творчым арсенале і такога мабільнага артыста, як С. Кліменка! Ён пластычны і па-музычнаму выразны ў руху, у мове, ён валодае рытмічным малюнкам, прыдатным сёння для гэтай ролі, а заўтра ж можа кардынальна яго змяніць на іншы, прадыктаваны, напрыклад, стылістыкай спектакля-плаката «Тэмп-1929» па п'есе М. Пагодзіна або рамантыкай спектакля паводле фільма «Камуніст». Калі прыгадваеш тое, што бачыў з даволі багатага на самыя разнастайныя ролі рэпертуару С. Кліменкі, то

Сцэна са спектакля «Аптымістычная трагедыя».

НА АБСЯГАХ КУЛЬТУРЫ

ГОРАД МАЙСТРОЎ

ЁСЦЬ НА ГРОДЗЕНШЧЫНЕ невялічкі пасёлак з простай прыгожай назвай — Бярозаўка. Хто і калі даў яму такую назву — у архівах не пазначана. А дакумент, дзе ён упершыню ўпамінаецца, датаваны так: 1883 года, кастрычніка, дзевятага дня.

«Местность сия состоит из смешенного соснового леса, отстоит от города Лиды на 25 верст, за рекой Неман от берега — 4 версты» — напісаў царскі прыстаў пры афармленні папер памешчыка Зянона Ленскага, прашэння на дазвол пабудаваць тут шклозавод — невялічкую гуту. І прыпісаў: «асобнай назвы ўрочышча не мае».

Чаму менавіта тут людзі пачалі вырабляць шкло — хораша расказана ў паэтычнай казцы Уладзіміра Дубоўкі «Мілавіца». Памятаеце? Сялянскі сын, каб дагадзіць любай, зрабіў з мясцовага пяску дзівосныя крышталёвыя пантофелькі... Сёння гэты казачны майстра жыве ў Бярозаўцы ў тысячах абліччаў: амаль усё дарослае насельніцтва гарадка — патомныя гутнікі. Адзін малады рабочы на пытанне: які ягоны працоўны стаж? — адказаў: «Гледзячы як лічыць. Калі па запісу ў працоўнай кніжцы, дык два гады. Але ж тут працаваў некалі мой дзед, потым — бацька, а цяпер вось — я. Так што стажу хутка сто гадоў набяжыць...»

Безумоўна, за гэтыя амаль сто гадоў — у асноўным, за апошнія дзесяцігоддзі — старая гута змяніла сваё аблічча. Яе другое нараджэнне прыпадае на 60-я гады, калі былі цалкам перабудаваны цэхі і мадэрнізавана абсталяванне, калі на завод прыйшла група таленавітых мастакоў.

Сёння шклозавод «Нёман» — трэцяе па велічыні прадпрыемства такога тыпу ў краіне, пасля Гусеўскага і Дзяцькаўскага заводаў. Яго гадавая прадукцыя — 50 мільёнаў штук вырабаў 450 назваў. Нёманскі посуд са шкла і крышталю заказваюць усе адпаведныя гандлёвыя фірмы нашай краіны і 20 — замежных.

Гэта — празаічныя лічбы, але за імі — сапраўдная сучасная казка. Хоць, відаць, ні ў казцы сказаць ні пяром апісаць той прыгажосці, якую выпускае завод. І ў самога казачнага персанажа, у таго ж хлопца з «Мілавіцы», пэўна, разбегліся б вочы, калі б ён трапіў на Усесаюзны мастацкі савет па шклу, які праходзіў нядаўна ў Бярозаўцы. Члены савета — 150 спецыялістаў з розных гарадоў і рэспублік — разглядалі і адбіралі для вытворчасці лепшыя ўзоры прадукцыі 29 заводаў, і самай прадстаўнічай і самай прыгожай была экспазіцыя гаспадароў (калі можна так назваць звычайны рабочы паказ).

Ацэнка новым вырабам будзе дадзена членамі савета пазней, а пакуль што даваўце разам з гасцямі зробім невялічкую экскурсію па заводскіх цэхах. Між іншым, на «Нёмане» прывыклі да гасцей: сюды едуць не толькі з розных гарадоў Саюза, але з Італіі, Вялікабрытаніі, Бельгіі і з іншых краін традыцыйнага шкла, з краін, дзе мастацкае шкло — прадмет экспарту. Едуць таму, што ў бярозаўцаў ёсць чаму павучыцца, таму, што яны не хаваюць сваіх сакрэтаў.

На заводзе дзейнічае лепшы ў нашай краіне танкасценны прэс для выпуску масавай прадукцыі. За серыю прасаваных вырабаў мастак завода У. Мурахвер атрымаў медаль ВДНГ СССР. А спецыялісты лічаць, што самае складанае для шклозавода—гэта якраз выпуск такой масавай прадукцыі, якая пры ўсёй сваёй утылітарнасці, а значыць, і даступнасці, і таннасці, была б эстэтычна каштоўнай, каб яна спалучала таннасць, зручнасць, масавасць і мастацкасць.

Славіцца «Нёман» і знакамітай «нёманскай ніткай», якая прымяняецца для аздобы вырабаў з каляровага шкла, і накладным, і фактурным шклом, і шырокай граніроўкай. Славіцца высокай культурай формы і колеру зырабаў.

І вось мы ў цэхах. Тут новыя паточныя лініі для вырабу звычайнага, шклянога, і крышталёвага посуду.

Адна секунда! Ёю вымяраецца не толькі работа аўтамата, але і работа майстра-выдзімальшчыка. Бо шкло, як і жалеза, «куецца, пакуль гарачае». Майстар, спрытна жанглёруючы «хватком», вымае з печы буйную кроплю шкла — некалькі імгненных рухаў, і з кроплі нараджаецца форма, якая нагадвае гарлачык. Яшчэ некалькі рухаў, і на дымчатым шкле з'яўляецца тонкая блакітная ніць, тая самая, венецыянская. Дакладней, некалі — венецыянская, а цяпер — нёманская. Нёманскі шкляр Анатоль Федаркоў дакладна авалодаў старой тэхнікай, удасканаліў яе, назваў ніць «нёманскай». Майстар Федаркоў і сам аўтар многіх вырабаў — яго твор са шкла пад назвай «Кветка» ўдастоены галоўнага прыза на Міжнароднай выстаўцы шкла ў Яблонцы (ЧССР).

«Нёман» наогул славіцца майстрамі. Сваю палітру каляровага шкла — ад жоўта-бірузовага, ярка-чырвонага да зялёна-залацістага і кафейна-карычневага — стварыў майстар Б. Шыманскі. Яго вазы для садавіны, гарлачыкі і шклянкі для малака, для вады вабяць пакупніка.

Майстар І. Бардосік таксама не толькі ажыццяўляе задумы мастакоў, але і сам стварае арыгінальныя прыгожыя рэчы. Асабліва хораша глядзяцца яго вырабы з жоўтага крышталю, аздобленыя алмазнай гранню ў «буйныя квадраты».

Усё лепшае, створанае на «Нёмане», можна ўбачыць у заводскім музеі. Музей вельмі прыгожа абсталяваны: экспанаты месцяцца ў асобных боксах, кожная група аддзелена ад суседняй белым шчытом і падсвечваецца нябачным святлом, у выніку кожны асобны выраб, кожная рэч пададзены гранічна выгадна, а ўсе цалкам раскрываюць сваю прыгажосць.

Высакародны празрысты крышталь... Малочна-дымчатае шкло... Сіняе... Блакітнае... Чырвонае... Зялёнае з золатам... Усе магчымыя адценні шкла самых разнастайных формаў!

Вырабы славутых нёманскіх гутнікаў — скульптурныя сувеніры — шкляныя зубры, алені, птушкі — усяго і не пералічыць...

Многія экспанаты музея — творы мастацтва, адзначаныя прэміямі і медалямі, дыпломамі на ўсесаюзных і міжнародных выстаўках.

Кожны год «Нёман» абнаўляе сваю прадукцыю — прапаноўвае 50 новых вырабаў. А на апошні Усесаюзны мастацкі савет, пра які мы расказваем, завод прадставіў дзвесце новых рэчаў — шэсцьдзесят камплектаў. Большасць з іх — утылітарнага прызначэння, некаторыя — сапраўдныя мастацкія творы.

Мастакі і мастацтвазнаўцы, якія выступалі на савеце з дакладамі, падкрэслівалі, што сацыяльная функцыя кожнага віду мастацтва — выхоўваць культуру насельніцтва. Таму масавыя вырабы павінны перш за ўсё быць прыгожымі, мець

здаецца, быццам бы ён і не надта бывае занепакоены знешнім пераўвасабленнем. Ды затое кожны раз яго герой — адметны характар.

Ад Васіля Губанава («Камуніст» паводле Я. Габрыловіча) і да Князя ў той жа «Ханумі» А. Цагарэлі, ад Вані Кудраша ў «Навальніцы» А. Астроўскага і да матроса-анархіста ў «Аптымістычнай трагедыі» У. Вішнеўскага, ад старшыні калгаса Трубчака ў «Трывозе» А. Петрашкевіча і да Вэла Зяўера ў спектаклі «Арфей сыходзіць у пекла» па п'есе Т. Уільямса — які сапраўды шырокі дыяпазон. Да гонару С. Кліменкі трэба аднесці яго творчую дапытлівасць, яго акцёрскую няўрымслівасць. Бывае, артыст можа, як кажуць, адразу ж «схапіць» характар і амаль з першых рэпетыцый зажыць жыццём персанажа. Часцей жа за ўсё ён даследуе псіхалагічны свет менавіта гэтай непаўторнай асобы, гэтага чалавечага феномена. Потым выпрацоўвае форму сцэнічнага ўвасаблення. Спачатку ж — дыялектыка душы.

Дазволю сабе асабістую заўвагу. Мне давялося назіраць, як гэты акцёр паглыбляецца ў падтэкставыя нетры ролі, калі ён выступаў выканаўцам адной з роляў у маёй п'есе «Трэцяга не дадзена». Было такое адчуванне, што яму трэба ведаць... больш за аўтара, чым кіруецца ў кожным учынку і ў кожным выяўленні тэмпераменту яго сцэнічны персанаж. Потым, гледзячы на С. Кліменку — Георгія з залы, я не адасобліваў адзін яго даследчы рэпетыцыйны эцюд ад іншага, не вылучаў нюансаў, не бачыў і швоў паміж кавалкамі і пераходамі. Яго Георгій быў зусім пэўнай і таму яшчэ больш загадкавай у прапанаваных жыццём сітуацыях фігурай. Выснова такая: артысту ўласціва ўменне прааналізаваць і па-мастацку ўпэўнена потым сінтэзаваць у цэласны і завершаны тэатральны вобраз.

Акцёр С. Кліменка — добры і чулы партнёр. Аб гэтым варта сказаць, бо гэта не толькі яго рыса: так — у ансамблі — імкнуцца іграць ролі наогул усе гродзенцы. Дуэты А. Царова і Г. Панкрат («Трыбунал» А. Макаёнка), В. Смачнева і Н. Караткевіч («Беспасажніца» А. Астроўскага), У. Мішчанчука і Л. Дзяменцьевай («Мілы чалавек» К. Крапівы), В. Смірнова і В. Грачынскага («Аптымістычная трагедыя» У. Вішнеўскага), Н. Караткевіч і С. Кліменкі («Арфей сыходзіць у пекла» Т. Уільямса) — вось прыклады, якія красамоўна сведчаць аб тым, што гродзенская рэжысура ў суладдзі з выканаўцамі свядома будуе працу над спектаклем як над гарманічным у кампанентах мастацкім творам, асабліва ў сферы акцёрскага майстэрства. Мне асабіста падалося, што С. Кліменка, які мае рысы так званага «прэм'ера» ў трупе, навучыўся выдатна і сапраўды па-творчы ўзгадняць і стыкоўваць свой тэмперамент з інтарэсамі агульнай пастановачнай задумы і стылявых асаблівасцей спектакля. Нядаўняя эксперыментальная работа гродзенцаў — «Ноч пасля выпуску» паводле У. Цендракова — пераконвае ў гэтым яшчэ раз.

У праграмках Гродзенскага абласнога драматычнага даволі часта сустракаецца такі радок: «Музычнае афармленне — Сяргей Кліменка». Па ходу спектакля ён і сам, бывае, спявае арыгінальныя песні, напісаныя ім на вершы розных паэтаў. І тут яму спадарожнічае добры густ і мастакоўская стрыманасць.

Пагадзіцеся, што такі артыст — каштоўнасць калектыву.

●

Хай даруюць мне тыя, аб кім я сёння не змог сказаць слова: В. Смачнеў, Л. Ашуркава, Л. Волкава, В. Грачынскі, Ю. Нікіцін, В. Смірноў, В. Мышко, С. Аляксандраў, да прыкладу. Прычына ў тым, што я перакананы: і па работах названых мною вышэй артыстаў-гродзенцаў можна адчуць плённы і высакародны напрамак магістральных творчых пошукаў тэатра. Поспехі калектыву вядомыя. І расказваць можна было не толькі аб яго артыстах, але і аб творчай рэжысуры, якая трымаецца на ўзроўні сучасных патрабаванняў, аб таленавітых мастаках, якія працуюць там. Гэта патрабуе асаблівай размовы. Мне ж цяпер карціць сказаць вось што. Напярэдадні здымкаў кіна- і тэлефільмаў бягуць ганцы ва ўсе канцы краіны, ляцяць запытанні і выклікі, бывае, і да заштампаваных артыстаў-варагаў, а свае, мясцовыя акцёрскія сілы амаль не выкарыстоўваюцца. Між тым, нават адзін калектыў з Гродна мае арсенал цікавейшых і працалюбівых акцёрскіх індывідуальнасцей. Шкада, што пакуль іх ведае толькі тэатральны глядач. Тут бы замест славутага кінарэжысёрскага воклічу: «Не бачу!», больш сумленна было б сказаць: «Не ведаю!». А ведаць разнастайныя прафесійныя акцёрскія індывідуальнасці, што працуюць на падмостках беларускіх тэатраў, нашым кінематаграфістам варта. Ад гэтага выйграюць усе. На гэтай ноце я і закончу свае нататкі аб гродзенскіх акцёрах.

Леў КАРАІЧАЎ.

Сцэна са спектакля «Мілы чалавек».

Сцэна са спектакля «Эшалон».

У садружнасці з літаратурай

Тэатр Прынямоння прыцягвае да сябе ўвагу гледачоў не толькі роднай Гродзенскай вобласці. Яго лепшыя спектаклі заслугоўвалі і заслугоўваюць высокай ацэнкі грамадскасці Мінска, Ленінграда, дзе ён сёлета гастраляваў упершыню ў сваёй творчай біяграфіі, Украіны, РСФСР. Адна з традыцый, што беражліва захоўваецца калектывам і перадаецца новым пакаленням творчых работнікаў, — гэта садружнасць тэатра з пісьменнікамі Беларусі. Дарэчы будзе прыгадаць, што трупа спачатку працавала як Бабруйскі абласны драматычны тэатр і ў 1947 годзе пераехала на сталую пляцоўку ў горад над Нёманам. Яе стваралі вакол ядра былога Бабруйскага калгасна-саўгаснага тэатра, арганізаванага сорак гадоў назад (1938 г.). Яшчэ тады артысты з вялікім энтузіязмам іграли творы народнага пісьменніка Беларусі Кандрата Крапівы і Кузьмы Чорнага. Яны з поспехам выступалі на І Усебеларускім фестывалі калгасна-саўгасных тэатраў і адну з першых прэмій заваявалі маляўнічасцю і псіхалагічнай праўдай выканання роляў. За гады дзейнасці ў Гродне трупа звярталася да п'ес Я. Купалы, К. Крапівы, А. Макаёнка, К. Губарэвіча, П. Васілеўскага, А. Кучара, А. Петрашкевіча, на гродзенскіх падмостках была паказана інсцэніроўка рамана «Сустрэнемся на барыкадах» П. Пестрака. Сёння ў рэпертуары пазначаны «Мілы чалавек» К. Крапівы, «Трывога» А. Петрашкевіча, «Трэцяга не дадзена» Л. Караічава. Да 60-годдзя стварэння Беларускай ССР і Кампартыі Беларусі тэатр рыхтуе вялікае гістарычнае палатно — «Напісанае застаецца» («Георгій Скарына») А. Петрашкевіча.

эстэтычную вартасць. І, безумоўна, яны павінны быць зручнымі. Зыходзячы з гэтага, трэба падыходзіць і да вырабу унікальных рэчаў. Мастак павінен арыентавацца на тое, што сённяшняя унікальна» рэч заўтра будзе масавай. Таму задача мастака, які працуе на прадпрыемстве, умела спалучаць эстэтычныя і утылітарныя функцыі вырабаў.

Менавіта сінтэз мастацтва і тэхналагічнасці вызначае стыль працы нёманскіх майстроў. Большасць твораў, паказаных савету бярозаўскімі гаспадарамі, — плён такой творчай працы.

Малады мастак А. Анішчык паказаў набор для гаспадыні. Посуд з тонкага бясколернага шкла, лаканічна ўпрыгожаны адной каляровай плямкай на донцы, амаль ідэальны па сваіх формах — абрысы яго вытанчаныя, надзвычай пластычныя. Работа прымаецца з адзнакай «выдатна».

Вазы з сакавіта-чырвонага і сіняга шкла маладой мастачкі, выпускніцы БДТМІ Т. Малышавай, названы «Імпульс». Яны вырашаны імклівай лініяй. Аднолькавыя дыскі нібы пакладзены адзін на другі і заканчваюцца разгорнутым краем, які ўтварае падабенства раскрытай кветкі. Адзнака работы таксама высокая.

Пад апладысменты прымаецца кампазіцыя «Кветка» А. Федаркова. Вытанчаная, малочна-блакітная скульптура з гутнага шкла выканана, здаецца, на адным дыханні — і ў пераносным, і ў прамым сэнсе гэтага слова: майстра выдзьмухвае свой твор з вогненнай кроплі... Сінія і чырвоныя блюды з рэльефным малюнкам, выкананыя У. Жохавым, і тонкія шклянкі В. Рыжкоўскай таксама прымаюцца з літарай «Н» — гэта значыць, выдатна. Гэтак жа высока ацэнены «алімпійскі камплект» шклянак В. Дзівінскай.

Як заўсёды, парадавалі сваімі работамі заслужаны дзеяч мастацтваў БССР галоўны мастак завода Л. Мягкова і мастак У. Мурахвер.

Кампазіцыя Л. Мягковай «Ляціце, галубы» складаецца з пяці каляровых калон, якія нагадваюць дрэвы з фігурай птушкі наверсе — шкляныя крылы яе распраўлены ў палёце...

Творы У. Мурахвера выклікаюць багатыя асацыяцыі. Яны заўсёды новыя і па тэхніцы выканання, і па сваім псіхалагічным уздзеянні на гледача. Яго кампазіцыя «Зімні сад» аддалена нагадвае дрэвы, пакрытыя інеем, але галоўнае, яна выяўляе новыя магчымасці шкла — тут мастак спалучае гладкае шкло з фактурным, што дае нечаканы мастацкі эфект. Вельмі цікавы посуд У. Мурахвера з так званага «скамечанага» шкла — талерачкі з такога шкла нагадваюць сапраўдныя льдзінкі... А вось графіны з карычневага, цяжкага шкла. Яны своеасабліва адлюстроўваюць сонечны прамень дзякуючы таму, што мастак заклаў грані ў саму металічную форму, з якой адліваецца выраб.

Удзельнікі савета адзначалі, што кожны з шасці мастакоў «Нёмана» — яркая творчая індывідуальнасць, у кожнага свой адметны почырк. А ўсе разам яны складаюць цудоўны ансамбль майстроў.

Як сказаў лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР, старэйшы мастак, выкладчык вучылішча імя В. Мухінай Ф. Энтэліс, сёння можна гаварыць пра школу майстэрства Мурахвера і Мягковай, як пра беларускую школу мастацкага шкла.

...У гарадскім пасёлку Бярозаўка жыве дзесяць тысяч чалавек. І жылыя дамы, і школа, і яслі-сад выраслі вакол шклозавода «Нёман». Амаль кожны другі жыхар тут — шкляр. І жыве ў шкляроў цікавасць да шырокага свету, да мастацтва, да музыкі. Таму і стварылі яны сваю музычную школу, выдатны клуб з разнастайнай мастацкай самадзейнасцю. У прыватнасці, тут — народны самадзейны хор, народны духавы аркестр, шматлікія гурткі і лаўрэат першага Усесаюзнага фестывалю самадзейнай творчасці працоўных — вакальна-інструментальны ансамбль «Шкляры». Якраз у жнівеньскія дні, калі ў Бярозаўцы працаваў Усесаюзны мастацкі савет па шклу, ансамбль выступіў з канцэртам па Беларускаму тэлебачанню, з тым жа самым, які на дзень раней яны паказалі членам савета.

Знамянальна, што «Шкляры» з Бярозаўкі выйшлі ў шырокі свет — іх песні панясуць па роднай зямлі і за яе межы старую і новую славу горада майстроў над Нёманам. Слаўнага горада беларускага шкла.

Р. БАКУНОВІЧ.

ХРОНІКА

ГАНАРОВАЕ ЗВАННЕ «НАРОДНЫ»

Ганаровае званне «народны» атрымалі ў гэтым годзе яшчэ два самадзейныя калектывы Гродзеншчыны. Гэта хор Квасаўскага сельскага Дома культуры, што ў калгасе «Кастрычнік» Гродзенскага раёна. Яго мастацкі кіраўнік — С. В. Смагажэўская, чалавек, які любіць сваю справу. Хор удзельнічаў у І, ІІ і ІІІ турах Усесаюзнага фестывалю самадзейнай мастацкай творчасці за 1975—1977 гады. Паспяхова выступіў ён і на цяперашнім куставым агляндзе, заслужыўшы права ўдзелу на заключным раённым канцэрце.

Другі народны — Малюшыцкі хор калгаса імя Калініна Карэліцкага раёна. Яго нязменны кіраўнік — настаўнік А. А. Русак. Харысты з поспехам выступалі на многіх абласных і рэспубліканскіх аглядах.

Зараз гэтыя калектывы рыхтуюць новую канцэртную праграму, прысвечаную 60-годдзю Беларусі і КПБ.

ВУЧАЦЦА ПРАКТЫКАНТЫ

Ужо некалькі гадоў запар у дамы культуры і сельскія клубы Карэліцкага раёна прыязджаюць навучэнцы Гродзенскага культасветвучылішча для праходжання вучэбнай практыкі. Гэтым летам студэнты працуюць у Лукскім, Карэліцкім і Турэцкім дамах культуры. Разам з загадчыкамі клубаў яны распрацоўваюць культурна-масавыя мерапрыемствы для працаўнікоў вёскі. Вусныя часопісы, тэматычныя вечары, дні культуры на фермах, вечары пытанняў і адказаў.

Практыканты ў Турэцкім СДК цікава правялі дзень культуры для жывёлаводаў калгаса імя Чарняхоўскага, выступілі з нумарамі канцэртнай праграмы ў вёсках Загор'е і Браносава.

Пяць канцэртаў для медыкаў і працаўнікоў сяла, раёна, вучняў Карэліцкай сярэдняй школы дала брыгада, якая замацавана за раённым Домам культуры. Яна правяла таксама вечар па прафарыентацыі, вечар бальнага танца. Зараз будучыя культработнікі рыхтуюць вусны часопіс «Беларусь мая родная» і баль «Бярозка». Сумесна з работнікамі пракуратуры і нарсуда яны правядуць вечар на тэму «Чалавек і закон».

СВЯТОЧНАМУ ГРОДНА

850-годдзю Гродна прысвячаецца святочны канцэрт, які рыхтуюць лепшыя самадзейныя калектывы горада разам з заслужаным дзеячам культуры БССР А. С. Чопчыцам. Пралогам — гісторыяй старажытнага Гродна — адкрыецца праграма канцэрта.

Станцуе «Палескую аколачку» народны ансамбль танца «Раніца», прагучыць раманс Шастаковіча з кінафільма «Авадзень» у выкананні ансамбля скрыпачоў, зводны хор праспявае «Радзіму» Тулікава, некалькі песень гродзенскага кампазітара, заслужанага дзеяча культуры БССР А. К. Шыдлоўскага. Парадуе гледачоў сваім выступленнем народны ансамбль песні і танца «Нёман».

ТЭАТР НА ГАСТРОЛЯХ

Вярнулася з гастроляў акцёрская трупа Гродзенскага абласнога драматычнага тэатра. Два месяцы ёй апладзіравалі гасцінныя жыхары старажытнага Пскова і вобласці, патрабавальны ленінградскі глядач, на суд якіх былі вынесены лепшыя спектаклі з рэпертуару тэатра: «Мілы чалавек» К. Крапівы, «Трывога» А. Петрашкевіча, «Арфей сыходзіць у пекла» Т. Уільямса, «Фантазіі Фарацьева» А. Сакаловай, «Старамодная камедыя» А. Арбузава.

У верасні творчаму калектыву тэатра прадстаіць сустрэча з сельскімі працаўнікамі Гродзенскай вобласці.

Г. ШАБЛІНСКАЯ.

ЧАЦВЁРА З ПАЛАЦА

Больш як паўмільёна чалавек у рэспубліцы заручыліся з мастацкай самадзейнасцю. Пасля працоўнага дня яны спяшаюцца ў дамы і палацы культуры, клубы, студыі, каб аддацца любімай справе. Сёння мы раскажам пра чатырох з гэтай вялікай арміі аматараў. Усе яны—члены мастацкіх калектываў, якія працуюць пры Гродзенскім Палацы культуры тэкстыльшчыкаў. Дарэчы, палац гэты адзін са старэйшых у горадзе на Нёмане. У гродзенцаў карыстаюцца вялікім поспехам народны тэатр, народны ансамбль танца «Раніца» і народная агітбрыгада «Дзелавыя рабяты». Шмат прыхільнікаў маюць вакальна-інструментальны ансамбль «Віцязі», духавы аркестр, хор народнай песні, дзіцячы танцавальны калектыў, дзіцячая эстрадна-цыркавая студыя, клубы па інтарэсах...

РАНІЦА ГАЛІ СКОК

Вось такое ў яе прозвішча. У ансамблі танца «Раніца» жартуюць: «З такім прозвішчам чалавеку з дзяцінства наканавана танцаваць». А так яно па сутнасці і здарылася. Прыйшла Галя ў калектыў дзесяць гадоў назад, калі вучылася яшчэ ў сёмым класе. Цяпер яна тут адна з ветэранак, адна з дванаццаці танцорак, якім прысвоена званне артысткі народнага ансамбля.

А знаёмства наша адбылося не ў рэпетыцыйнай зале, не ў час канцэрта, а на Гродзенскай пальчаткавай фабрыцы, дзе працуе Галя пашывачніцай. Аперацыя — тры роўныя машынныя строчкі. Норма — 340 пар пальчатак за змену. Кожны рух разлічаны, здаецца, амаль аўтаматычны — узяла нарыхтоўку, падклала пад галоўку швейнай машыны, націснула педаль. Кароткае стракатанне, потым яшчэ і яшчэ адно. Пальчатка ідзе далей па канвееру.

Майстар змены, якая прывяла нас да рабочага месца Галі, па дарозе коратка ахарактарызавала яе: «Адна з нашых лепшых працаўніц».

Тры разы на тыдзень, адпрацаваўшы змену, Галя ідзе на рэпетыцыю.

— Не цяжка? — пытаемся мы, бо кожная рэпетыцыя танцавальнага ансамбля — гэта яшчэ і вялікая фізічная нагрузка, да сёмага поту, як кажуць.

Пацепвае плячамі:

— Звыклася.

Яўгеній Аляксандравіч Штоп, з імем якога звязана нараджэнне і станаўленне ансамбля, успамінае, як прыйшла да іх Галя. Прыйшла, як кажуць, няўмекай. Але нешта ўбачылася яму ўпартае ў яе вачах, сур'ёзнае ў няўсмешлівым тварыку, каб пра сябе вырашыць — будзе танцаваць

— Хаця, — усміхаецца Я. Штоп, — першы блін у яе пайшоў, як нярэдка бывае, камяком. Рыхтавалі мы венгерскі танец. На рэпетыцыях усё ў Галі было добра. «Хапала» з першага паказу. А на канцэрце зблытала па і «паламала» ўвесь танец. За кулісамі так ужо горка плакала, што ўся прыкрасць мая адразу знікла. Падышоў, кажу: «З кожным можа такое здарыцца, не перажывай». І вось з таго дня дзесяць гадоў прайшло, а Галяй мы не нахвалімся, таленавітая танцорка...»

Пахвала высокая, калі яшчэ ўлічыць, што ў «Раніцы» сабрана нямала выдатных індывідуальнасцей. Сёння народны ансамбль (а ён гэтае ганаровае званне носіць ужо дзевяць гадоў) адзін з лепшых фальклорных танцавальных калектываў не толькі Гродзеншчыны, але і ўсёй рэспублікі. Яго мастацтва адлюстроўвае багацце народнай харэаграфіі Нёманскага краю. Гэта і «Дабравольская кадрыля», запісаная Я. Штопам у вёсцы Добрая Воля Свіслацкага раёна, і «Таўкачыкі» — адзін з самых старых народных танцаў, і «Калгасная полька», і шмат іншых харэаграфічных твораў — колькасць якіх у творчым «партфелі» калектыву складае каля шасці дзесяці.

Мастацтва «Раніцы» ведаюць не толькі на Гродзеншчыне, не толькі ў Мінску, дзе калектыў атрымаў вялікі залаты медаль лаўрэата першага Усесаюзнага фестывалю, але і ў Маскве, дзе ён прымаў удзел у міжнародным тэлефестывалі народнай творчасці, у Кішынёве, дзе выступаў на свяце народнай харэаграфіі ў ліку лепшых танцавальных ансамбляў краіны. Пабывала «Раніца» на гастролях у ГДР і Польшчы.

...Сёння ўвечары Галя прыйдзе на чарговую рэпетыцыю. Неяк яна падлічыла, што за дзесяць гадоў іх было каля тысячы. І ўсё на радасць...

Пасля напружанага працоўнага дня на пальчаткавай фабрыцы Галіна Скок ідзе на рэпетыцыі ансамбля танца.

ПРЭМІЯ

Сход быў, што гаварыць, — гарачы. Кіпелі страсці, людзі перапынялі адзін аднаго, зноў і зноў прасілі слова. А здарылася вось што. Адзін з рабочых Гродзенскага завода «Аўтаагрэгат» адмовіўся ад прэміі. Ды мала таго, вынес усё на прафсаюзны сход цэха, дзе абвінавацій начальніка ў несумленных паводзінах.

Расказваў гэты рабочы, што некалькі дзён назад яго паклікаў да сябе начальнік і сказаў: «Мы табе даём прэмію». Але тут жа дадаў: «Палову вернеш назад». «Чаму?» — здзівіўся чалавек. Яму растлумачылі, што патрэбны грошы на нейкае мерапрыемства. Вось тут рабочы і запратэставаў. Скончылася ўсё гэта для начальніка, як і павінна было скончыцца, тым, што яго знялі з пасады.

Валерый Камзанаў — слесар-наладчык завода «Аўтаагрэгат». Ён жа ў ролі Патапава ў спектаклі «Пратакол аднаго пасяджэння».

ЁСЦЬ У ГОРАДЗЕ МУЗЕЙ

У Гродне адкрыты новы Рэспубліканскі музей атэізму і гісторыі рэлігіі.

Калі зыходзіць з прынятай класіфікацыі музеяў па тыпах і профілях з улікам іх асноўных навуковых і выхаваўчых функцый, то ў адпаведнасці з гэтым рэспубліканскі музей павінен быць комплекснай доследна-навукова-асветнай установай. Сканцэнтроўваючы ў сваіх фондах разнастайны рэчавы, крыніцазнаўчы і літаратурны матэрыял, ствараючы на яго аснове з марксісцка-ленінскіх пазіцый абгрунтаваную экспазіцыю, новы музей закліканы адыграць важную ролю ў фарміраванні навукова - матэрыялістычнага светапогляду працоўных рэспублікі, саставной часткай якога з'яўляюцца маральна-атэістычныя погляды і перакананні.

Для таго, каб наш музей стаў доследна - навукова - асветнай установай, патрабуецца канкрэтная і пастаянная дапамога вышэйшых навучальных і акадэмічных устаноў рэспублікі, і ў першую чаргу абласнога цэнтра. У Гродне — тры ВНУ з прыкладна дзесяццю кафедрамі грамадскіх навук. У нашым горадзе абаронены і падрыхтаваны да абароны дзве доктарскія і дзесяць кандыдацкіх дысертацый па праблемах гісторыі рэлігіі, тэорыі навуковага атэізму і атэістычнага выхавання моладзі. Вучонымі і спецыялістамі Гродна апублікаваны дзесяткі манаграфій, брашур, навуковых і прапагандысцкіх артыкулаў па атэістычнай тэматыцы, крытыцы ідэалогіі і палітыкі каталіцызму, праваслаўя, уніяцтва, сектанцтва і іудзейства. Асабліва важна тое, што даследчая работа нашых вучоных у асноўным вядзецца на матэрыяле, знаёмым і зразумелым працоўным рэспублікі і вобласці. І калі ўсе вучоныя-атэісты палічаць удзел у рабоце Рэспубліканскага музея атэізму ў Гродне сваёй кроўнай справай, ад гэтага будзе немалая карысць.

З мэтай каардынацыі нашай работы з іншымі ідэалагічнымі арганізацыямі, вызначэння задач, месца і ролі новага музея створаны вучоны савет музея. У яго склад увайшлі даследчыкі праблем навуковага атэізму, прадстаўнікі партыйных і камсамольскіх органаў, друку, радыё і тэлебачання. Вучоны савет закліканы выпрацаваць магістральную лінію дзейнасці музея, дапамагчы вызначыць змест, формы і метады яго работы. Ён будзе праяўляць клопаты аб павышэнні ідэйна-тэарэтычнага, навуковага і метадычнага ўзроўню работы музея з тым, каб зрабіць экспазіцыю дзейсным сродкам фарміравання матэрыялістычнага светапогляду наведвальнікаў.

Наш музей існуе ўсяго адзін год. І ўсё ж калектыў яго супрацоўнікаў і актыў, разам з вучоным саветам, правёў немалую работу. Прэзідыум Акадэміі навук СССР бясплатна перадаў нам набор касмічнай тэхнікі. Мы атрымалі экспанаты першага штучнага спадарожніка Зямлі, спадарожніка серыі «Космас», спускаемага апарата «Венера-7», глобус Месяца, муляж Сіхатэ - Алінскага метэарыта, рухавік «ОРМ-1», «Пратон-4», багаты набор ежы касманаўтаў, 33 вялікія планшэты фотастэндавай выстаўкі па даследаванню космасу ў СССР. Усе гэтыя дорагакаштуючыя прадметы пабывалі на выстаўках у Парыжы, Вашынгтоне і Дэлі, і для нашага музея гэта — неацанімы ўклад.

Мы падрыхтавалі першы зборнік навуковых прац музея аб'ёмам больш чым 10 друкаваных аркушаў. Артыкулы для яго напісалі відныя вучоныя рэспублікі. На думку рэцэнзентаў — вядомых спецыялістаў па гісторыі атэізму і рэлігіі прафесара Г. М. Ліўшыца і дацэнта М. Я. Ленсу, — зборнік мае багаты сацыялагічны, гістарычны, этнаграфічны і гісторыка-архіўны матэрыял, які ўяўляе несумненную навуковую цікавасць.

Важнае месца ў папулярызацыі Рэспубліканскага музея сярод насельніцтва займае масавая работа яго супрацоўнікаў. Члены вучонага савета і навуковыя работнікі музея ўжо неаднойчы выступалі па мясцоваму радыё і тэлебачанню на атэістычныя тэмы, чыталі лекцыі. На заводах, у школах і іншых навучальных установах праводзілі экскурсіі. Навуковымі супрацоўнікамі падрыхтаваны тэкст для экскурсаводаў, з якім яны могуць весці экскурсіі па культавых будынках Гродна, расказваць аб іх мастацкіх вартасцях і аб рэакцыйнай ролі рэлігіі.

Навуковыя супрацоўнікі музея і найбольш актыўныя члены яго вучонага савета праводзяць значную работу па назапашванню дакументальных матэрыялаў, якія выкрываюць рэакцыйную дзейнасць праваслаўнай і каталіцкай цэркваў, розных сект, іудзейскай рэлігіі ў гісторыі Беларусі. Уся работа, такім чынам, папярэднічае навукова абгрунтаванай экспазіцыі музея. Адначасова з гэтым мы збіраем матэрыялы для стварэння аддзела «Савецкі лад жыцця». Гэта будзе ўражлівы аддзел, у якім мовай фактаў мы раскажам пра поспехі сацыялістычнага будаўніцтва ў нашай краіне.

Новая Канстытуцыя СССР у якасці адной з галоўных задач савецкай агульнанароднай дзяржавы абвяшчае выхаванне чалавека камуністычнага грамадства. У 52-м артыкуле Канстытуцыі гаворыцца аб свабодзе сумлення ў СССР, аб праве грамадзян вызнаваць любую рэлігію або не вызнаваць ніякай. Але хочацца завастрыць увагу на прадастаўляемым Савецкай Канстытуцыяй праве вя-

ТЭКСТЫЛЬШЧЫКАЎ

Валерый Камзанаў, слесар-наладчык таго ж цэха, таксама горача выступаў на тым сходзе, падтрымліваў таварыша. Ды толькі не ведаў ён, што неўзабаве яму давядзецца сыграць у спектаклі, дзе будзе таксама расказана гісторыя адной прэміі, праўда, у іншым аспекце, але гісторыя ў нечым падобная, бо яе дзейнымі асобамі таксама былі рабочыя.

На адной з чарговых рэпетыцый мастацкі кіраўнік народнага тэатра Абрам Міхайлавіч Гільварг прапанаваў артыстам для работы п'есу Гельмана «Пратакол аднаго пасяджэння». «Пратакол... пасяджэння»? — перапытаў Валерый. — А гэта не сумна?» «А ты прачытай п'есу», — усміхнуўся рэжысёр.

За вечар п'еса была прачытана. Камзанаў ледзь дачакаўся наступнага дня. І з дзвярэй — Абраму Міхайлавічу: «Вось каб мне ролю Патапава...»

Спектакль «Пратакол аднаго пасяджэння» з Валерыем у галоўнай ролі меў у гледача немалы поспех і прайшоў некалькі дзесяткаў разоў.

Вучнем сёмага класа прыйшоў ён у дзіцячую драматычную студыю. Праз некалькі гадоў яго «заўважыў» А. Гільварг і прапанаваў ролю «немца» ў спектаклі «А світанні тут ціхія...». З таго часу Камзанаў— адзін з вядучых артыстаў народнага тэатра. Іграў ён і ў спектаклях «Валянцін і Валянціна», «Мае Надзеі» і іншых.

Пра свой тэатр Валерый гаворыць з захапленнем чалавека, для якога ўсё гэта — частка жыцця. Ды так яно і ёсць. Ён скончыў завочна Гродзенскае культасветвучылішча — рэжысёрскае аддзяленне. Хто ведае, мо неўзабаве здзейсніцца яго мара — самому паставіць спектакль...

ДЗВЕ МУЗЫ

Адзін з пакояў палаца нагадвае музей — усе сцены скрозь увешаны планшэтамі з фотаздымкамі, афішамі, газетнымі выразкамі. Пакой гэты належыць адразу двум народным калектывам — тэатру і мастацкай агітбрыгадзе (абодва ўзначальвае А. Гільварг)

Калі вы ўважліва прыгледзіцеся да фотакартак, дык на большай частцы іх убачыце адны і тыя ж два жаночыя твары. Гэта Надзея Часнакова і Любоў Гардзейка. Абедзве яны ветэранкі і тэатра, і агітбрыгады.

З Надзяй мы сустрэліся на Гродзенскім прадзільна-нітачным камбінаце, дзе яна працуе тэхнікам-капіроўшчыкам. Работа ў яе адказная — яна робіць рабочыя чарцяжы дэталяў, якія трэба здубліраваць, распрацоўвае прэсформы для ліцця і г. д.

Мы расказваем Надзі, што бачылі яе на адным са здымкаў агітбрыгады.

— Дык гэта адно з нашых апошніх прадстаўленняў «Прырода — яна жаночага роду», — пабліскваючы вачамі, гаворыць дзяўчына. — О, гэта быў сапраўдны монаспектакль, ён прайшоў з вялікім поспехам. Вы разумееце, — працягвае яна, — я не хачу нічога благога гаварыць пра іншыя калектывы гэтага жанру, але мы ў сваёй творчасці ўзялі трохі іншы кірунак. Ідзе непасрэдная гаворка з гледачом на самыя актуальныя тэмы жыцця. Мы звяртаемся да яго пачуццяў, свядомасці. Па ходу дзеяння разыгрываем сцэнкі, спяваем. Так было і з прадстаўленнем «Прырода...» Мы «абыгралі» факт, пра які пісала «Гродзенская праўда». Па віне адной гаспадарчай арганізацыі з вадаёма была спушчана вада, у выніку чаго загінулі гнёзды лебедзяў. Гэтае здарэнне стала нібы штуршком для гаворкі пра ахову прыроды, пра тое, што можа і павінен зрабіць кожны чалавек у гэтай справе...

Нам расказвалі гродзенцы, што на выступленнях «Дзелавых рабят» у залах заўсёды поўным-паўнютка. Вялікай папулярнасцю карыстаецца праграма «Старонкі вялікага жыцця» — пра У. І. Леніна. З цікавасцю сустракаюць гледачы праграмы: «Вось яна, Амерыка», «Ах, гэты Гродна», «Увага—каханне!», «Забойца нумар адзін» (пра алкаголь), «Стаўка на якасць» і інш.

І апошняя сустрэча. На гэты раз у абласным камітэце па тэлебачанню і радыё з Любай Гардзейка, дзе яна працуе памочнікам рэжысёра. Тонкі твар, вельмі эмацыянальная мова — такая яна, Люба, адна з лепшых артыстак тэатра.

З вялікай павагай ставіцца да рэжысёра: «Вельмі цікавы чалавек, яму абавязана вельмі многім». Улюбёная ў тэатральнае мастацтва: «І калі рыхтую ролю, і калі іграю ў спектаклі — гэта самыя шчаслівыя мінуты майго жыцця».

Пра яе расказваюць, што яна пайшла іграць у спектаклі са свайго ўласнага вяселля.

Нярэдка можна прачытаць пра той ці іншы выпадак бескарыслівага служэння мастацтву. Як правіла, гутарка ідзе аб прафесійных артыстах. А тут? Асноўная работа ў Любы адказная — яна дапамагае рабіць тэлеперадачы, некаторыя з іх вядзе сама, а часта і выступае па мясцоваму радыё ў якасці дыктара, з чытаннем вершаў.

А пачалося ўсё з маленькай эпізадычнай ролі ў спектаклі «Традыцыйны збор». Роля была маленькая, а звярнула на сябе ўвагу Люба шчырасцю сваёй гераіні, праўдзівасцю вобраза. Потым яна сыграла Святлану ў «Выкліку багам», Наташу ў «Юнацтве бацькоў», Соню Гурвіч у «А світанні тут ціхія...», Валянціну ў «Валянціну і Валянціне»...

Гэта тэатр «падказаў» Любе пайсці вучыцца ў Гродзенскае культасветвучылішча, затым паступіць у Мінскі інстытут культуры.

Чацвёра з многіх... Яны знайшлі вялікую радасць у паўсядзённым служэнні музе, але радасць гэтая не толькі іх — яны падзяляюць яе з тысячамі і тысячамі ўдзячных гледачоў.

М. МІХАЙЛАЎ.
Фота У. КРУКА.

На Гродзенскім прадзільна-нітачным камбінаце Надзею Часнакову ведаюць як вопытнага тэхніка, а ў народнай агітбрыгадзе — як выдатную артыстку (на здымку яна першая злева).

Любоў Гардзейка сыграла Наташу Логінаву ў спектаклі «Юнацтва бацькоў» Б. Гарбатава. Працуе яна памочнікам рэжысёра на тэлебачанні.

дзення атэістычнай прапаганды, на забарону ўзбуджэння варожасці і нянавісці ў сувязі з рэлігійнымі вераваннямі. Указаны артыкул знаходзіцца ў поўнай адпаведнасці з ленінскім дэкрэтам аб аддзяленні царквы ад дзяржавы і школы ад царквы. 52-гі артыкул, як і 46-ы, забяспечваюць права грамадзян на карыстанне дасягненнямі культуры, яны маюць вялікае прынцыповае і асноватворнае значэнне для дзейнасці нашага музея. Яго фонды, экспазіцыі будуць сваёй агульнадаступнасцю каштоўнасцей пацвярджаць зафіксаваныя ў Асноўным Законе краіны развітога сацыялізму вялікія правы людзей працы на свабоду ад усялякай рэлігіі, на магчымасць мэтанакіраванай і сістэматычнай работы па камуністычнаму выхаванню працоўных.

А. КАРПЮК,
дырэктар
Рэспубліканскага музея атэізму і гісторыі рэлігіі.
Я. МАРАШ,
старшыня вучонага савета музея, доктар гістарычных навук.

ЖЫВУЦЬ ТУТ ЦІКАВЫЯ ЛЮДЗІ

Есць на Гродзеншчыне аддалены куток — Астравеччына. Куток, якіх шмат на Белай Русі. Але гэты асабліва вабіць да сябе нечым сваім, невыказным. Мо таму, што працякае тут прыгажуня Вілія са стромкімі соснамі і пяшчотнымі, у вясельным убранні, стройнымі бярозкамі на яе берагах. Цнатлівая роўнядзь блакіту вабіць дакрануцца да яе далоняй. А можа таму, што жывуць тут, на Астравеччыне, цікавыя людзі. Людзі рознага лёсу... Спрадвеку пасяліліся тут літоўцы і палякі, рускія і беларусы. Жывуць, разам сеюць і жнуць хлеб, разам адпачываюць і весяляцца, а калі здараецца, разам смуткуюць...

Машына імчыць па гладкай палявой дарозе. Абапал — калгасныя палі. Зірнеш—і дзіву даешся, як вытрымлівае, не абламаецца наліты цяжарам колас. А далей — хітравата падміргвае блакітнымі вачанятамі лён. Праязджаем калгасы імя Леніна, «Радзіма», «Рассвет».

— Добры ўраджай збяром сёлета, — задаволена гаворыць Мікалай Антонавіч Мілюк, загадчык аддзела прапаганды і агітацыі Астравецкага РК КПБ. У голасе—упэўненасць і гонар. — А людзі нашы—працаўнікі-і! Моладзь у горад не вельмі спяшаецца. Есць дзе прыкласці свае сілу і талент, і адпачыць ёсць дзе. Вунь, зірніце...

Спыняемся ля высокага прыгожага будынка. Гэта—сельскі клуб калгаса імя Леніна. Праз прасторнае фае і танцзалу з паркетнай падлогай трапляем ва ўтульную кіназалу на 460 месц. Такое ўражанне—быццам знаходзішся ў лепшай глядзельнай зале сталічнага кінатэатра. Сцэна гэтай залы прымала за апошні час артыстаў Мінскага ТЮГа, Маскоўскай і Горкаўскай філармоній, Гродзенскага драматычнага тэатра... Не выпадкова Эдуард Ясевіч, займаючыся ў Гродзенскім культасветвучылішчы, перавёўся з дзённага аддзялення на завочнае і прыехаў працаваць сюды, у калгас імя Леніна, загадчыкам клуба. Есць дзе разгарнуцца...

Але мэта нашай паездкі — вёска Гіры. Размясцілася яна ў некалькіх кіламетрах ад цэнтральнай сядзібы калгаса «Рассвет». Дабротныя дамы хаваюцца ў засені дрэў. Поўдзень... Ціха ў вёсцы. Усе ў полі на ўборцы ўраджаю... Але сёння, у гэтай, здавалася б, прыцішанай вёсцы, кожны хлапчук панажа, дзе знаходзіцца мясцовая бібліятэка і дзе жыве яе загадчыца.

У цэнтры вёскі стаіць невялікі будынак. Тут і знаходзіцца Гірская сельская бібліятэка, якой сёлета прысвоена званне «Бібліятэка выдатнай работы».

Загадчыца яе, Антаніна Фамінічна Багачова, 15 гадоў свайго жыцця прысвяціла любімай справе. І заўсёды ёй спадарожнічае поспех. Сарамяжлівая, надзвычай сціплая жанчына, яна не вельмі ахвотна расказвае пра сябе. Але добрыя справы яе сведчаць аб многім.

Невялікі, але чысты і ўтульны пакойчык, у якім размясцілася восем тысяч кніг, любяць наведваць і дзеці, і дарослыя. Каб знайсці патрэбную кніжку, тут не трэба траціць шмат часу. А. Багачова паклапацілася пра гэта. Кожная кніга стаіць на паліцы ў адпаведным аддзеле. Есць тут аддзелы не толькі айчыннай і замежнай літаратуры, мастацкай і тэхнічнай. Механізатар і жывёлавод, палявод і настаўнік, піянер і камсамолец знойдзе для сябе кнігу на спецыяльна адведзенай паліцы. У гэтым цесным пакойчыку ёсць нават кніжны раздзел «У дапамогу хатняй гаспадыні».

Шмат спраў у Антаніны Фамінічны. Яе бібліятэка абслугоўвае 565 чытачоў. Дзве перасоўкі. Рэгулярна праводзіцца інфармацыйная работа па новай літаратуры. Як толькі з'яўляецца новая кніжка, яна адразу трапляе ў рукі чытача. А потым Багачова праводзіць яе абмеркаванне. Калі ж надыходзіць юбілей вядомага пісьменніка, у бібліятэцы адразу з'яўляецца адпаведная кніжная выстаўка. Да 60-годдзя Савецкай Арміі Антаніна Фамінічна арганізавала тэматычны вечар «Байцы ўспамінаюць мінулыя дні». На ім, акрамя чытачоў, прысутнічалі мясцовыя ветэраны вайны. Адбылася шчырая, задушэўная гутарка.

Да 60-годдзя БССР і КП Беларусі ў бібліятэцы аформлены кніжны стэнд. Тут можна знайсці літаратуру, у якой расказваецца аб цяжкім мінулым Беларусі, аб рэвалюцыі і войнах, якія пранесліся над гэтым краем, аб сучасным жыцці. Да юбілею ў Антаніны Фамінічны намечаны шэраг мерапрыемстваў: гутаркі, сустрэчы, канферэнцыі чытачоў.

Цяжка пералічыць усё, што зроблена рукамі сумленнай, працавітай жанчыны.

— Калі размова заходзіць пра лепшых работнікаў культуры нашага раёна, — гаворыць інспектар аддзела культуры раёна Я. С. Дудко, — то ў першую чаргу называецца імя Антаніны Фамінічны Багачовай. Надзвычай працавітая, вопытная, аддадзеная сваёй справе. На яе раўняюцца маладыя нашы работнікі. І яна дапамагае ім, ахвотна дзеліцца сваім вопытам. Наогул, ганарымся мы ёю. І людзі яе вельмі паважаюць.

В. МАСЛОЎСКАЯ.

Яўген КУХТА

ЗАВЕЯ

Яўген Іосіфавіч Кухта нарадзіўся ў 1938 годзе ў Гродне. Пасля заканчэння мясцовага медыцынскага інстытута дзевяць гадоў працаваў урачом на Сахаліне.
Зараз — урач-неўрапатолаг у адной з паліклінік Гродна.
Апавяданне «Завея» — дэбют аўтара.

ЗАХОЦКАГА МОРА на ўсходняе ўзбярэжжа Сахаліна хутка насоўваўся вячэрні змрок. Па дахах дамоў невялікага пасёлка, што раскінуўся ўздоўж берага шырокай бухты ля падножжа пакатых сопак, завіхурыўся спачатку нясмелы, потым пачаў узмацняцца, вецер. Быццам белая машкара, закружыліся дробныя рэдкія сняжынкі, і пры кожным парыве ветру, які збіваў у пыл навалены на даху снег, пасёлак нібы захлёствала хвалямі спежнага мроіва.

«Як бы зноў не завіхурыла сутак на трое,—падумаў галоўны ўрач участковай бальніцы Мікалай Васільевіч, паглядаючы з акна кабінета на ахутаны снегам пасёлак і панурае неспакойнае мора, якое цяжка перакатвала шэрыя хвалі.— Тры дні прайшло, як бушаваў цыклон. Толькі дарогі ачысцілі і на табе: зноў, відавочна, пачынаецца».

У бальніцы было ціха і спакойна, цяжкіх хворых не было, ды і ў пасёлку, як правіла, па суботах амаль ніхто ніколі сур'ёзна не хварэў. Так што дзень абяцаў быць спакойным, і сёння можна было б пайсці і раней: як-ніяк, а сёння ў Мікалая Васільевіча з жонкай сямейнае свята — гадавіна вяселля. Але дадому ісці яшчэ было рана, тым больш, што ў яго дапамозе не было патрэбы — там ёсць каму дамапагаць, а сядзець і чакаць гасцей — пакутлівая для страўніка і настрою справа. Падарунак жонцы падрыхтаваны: месяц хаваў Мікалай Васільевіч у сябе ў кабінеце, каб іменна ў сённяшні вечар прыемна здзівіць жонку і ўбачыць на яе твары радасную ўдзячную іскрыстасць вачэй, у глыбіні якіх толькі ён бачыў усю пяшчотнасць і любоў да яго.

Настрой у Мікалая Васільевіча быў святочна-прыўзняты, ён рашыў застацца ў бальніцы яшчэ на пару гадзін, папрацаваць і з'явіцца дадому за паўгадзіны да гасцей.

...У кабінет увайшла з якімсьці ўсхвалявана-заклапочаным выглядам медсястра Паліна Архіпаўна і стала перад доктарам.

— Што здарылася?— спакойна спытаў Мікалай Васільевіч.

— На вызаў за вамі прыйшлі... Вы ж ведаеце Мікіту Іванова, ну, што на канюшні працуе, здаровы такі?.. Дык яго жонка прыслала за вамі суседскага хлопчыка. Ён кажа, што Мікіта чуць не памірае ад боляў у жываце. Можа, зноў прыступ апендыцыту? —і, глянуўшы ў акно, з сумнай іроніяй дабавіла: —І знайшоў час захварэць.

— Ну што ж, Паліна Архіпаўна, пайшоў на выклік, —апранаючы паліто, весела сказаў Мікалай Васільевіч, паглядзеў на пакет, што ляжаў на стале, падрыхтаваны ў падарунак, і накіраваўся да выхада. —Яшчэ зайду сюды.

«За падарункам прыйдзецца вярнуцца, не цягнуцца ж з ім да хворага. Хто яго ведае, што з гэтым Мікітам здарылася. А так можна было б ісці прама дадому».

А на вуліцы круціла ўжо грунтоўна. Вецер узмацніўся. Завіруха пачынала разгульвацца. Да дома Мікіты ён дабег хутка. У пакоі каля хворага заклапочана і бездапаможна мітусілася жонка. Тут жа, каля стала стаялі побач двое малых, якія пужліва туліліся адзін да другога, насцярожліва і маўкліва назіраючы акругленымі вачамі за тым, што адбывалася.

Хворы ляжаў на ложку з пакутліва сціснутымі зубамі, з потам на лбе. Падкурчыўшы ногі і трымаючыся за жывот, глуха стагнаў.

Мікалай Васільевіч сеў побач, пачаў лічыць пульс. Жонку папрасіў расказаць, як усё здарылася.

Яшчэ раніцай у мужа злёгку забалеў жывот. Да абеду болі не прайшлі, а калі прыклалі цёплую грэлку, нават узмацніліся. У бальніцу ісці не хацеў. Пазвалі фельчара, жыве побач і быў якраз дома. Ён прызнаў атраўленне, зрабіў прамыванне страўніка і даў нейкіх таблетак. А пад вечар стала яшчэ горш.

Чым больш абследаваў Мікалай Васільевіч хворага, тым непрыемней станавілася яму самому. Усе сімптомы, усё гаварыла за тое, што пачынаецца перытаніт. І цяпер, у данай сітуацыі, было не вельмі важна, ці прабадны апендыцыт, ці прабадная язва або нешта іншае далі-ўскладненне. Што б там ні было, усё звялося да перытаніту, запаленню брушной поласці, і паміраць ён будзе толькі ад гэтага, калі страціць час. Пры такім дыягназе, чым раней зроблена аперацыя, тым большы поспех. А гэта значыла, што хворага неабходна было тэрмінова і любымі сродкамі даставіць у раённую бальніцу.

І цяпер толькі ён, устанавіўшы гэты злавесны дыягназ, ён адзін пакуль ясна і акрэслена ўяўляў і разумеў, якая катастрофа навісла над гэтым чалавекам, над яго сям'ёй. У такую непагадзь наўрад ці ўдасца давезці яго на аперацыю: праз паўгадзіны — гадзіну неба змяшаецца са снегам у шалёнай кругаверці. І тады ўжо нікуды не кранешся і ніхто не зможа прыйсці на дапамогу. Дый на чым везці? Рабочы дзень закончыўся. Людзі хто ў лазні, хто ў піўбары — адпачываюць. Дзе і ў каго шукаць машыну? Ды і хто асмеліцца ехаць цяпер?

— О-о-х-х, баліць,—прастагнаў нечакана хворы.— Ж-жывот.

— Цяпер і ў гэтым болю наша надзея. Заціхне — дрэнь справа,—сказаў Мікалай Васільевіч, затым павярнуўся да жанчыны, якая стаяла побач з застылым пытальным выразам твару, і, панізіўшы голас, працягваў:—Становішча вельмі сур'ёзнае. Яго неабходна везці ў горад. Абавязкова! Інакш... Увогуле, я паспрабую знайсці які-небудзь транспарт, а яго апранайце, ды цяплей. На жывот халодную грэлку пакладзіце.

Дзеці прыхінуліся да маці, якая стаяла з разгубленым і журботным выглядам каля ложка. Яны адчувалі, што з бацькам адбываецца нешта страшнае, і вось-вось гатовы былі расплакацца.

На вуліцы было зусім цёмна. Штармавы вецер з мокрым снегам валіў з ног. Калюча хвастаў па твары. Пасля яркага святла вочы быццам заляпіла чымсьці чорным, і ўсляпую давялося выбірацца праз сумёты на вуліцу. Дарога была расчышчана, і Мікалай Васільевіч бягом накіраваўся на базу геолагаў. Цяпер толькі яны маглі дапамагчы яму: у іх быў усюдыход, а гэта, мабыць, самая прыдатная ў данай сітуацыі машына.

У палявым вагончыку сіратліва сядзеў за паперамі і роспачна дыміў цыгарэтай начальнік геалагічнай партыі Васіль Іванавіч. Паспешліва, проста з парога пачаў тлумачыць яму Мікалай Васільевіч абставіны, якія склаліся з хворым. Убачыўшы тэлефон, хутка пазваніў дзяжурнаму па станцыі, спытаўся, ці чакаюць яны ў бліжэйшы час падыходу цягніка. Праз мінуту, кладучы трубку, маркотна прамовіў:

— Вось так. Нядаўна пайшоў туды састаў. І пакуль няма ў іх нічога рухомага. Бліжэйшы цягнік праз дзве гадзіны, і то, калі праб'ецца з поўдня — там ужо занесла дарогу... Праклящце! Што рабіць, га? Толькі на ваш усюдыход надзея, Іванавіч. Выручайце!

— Цяпер усюдыхода ў мяне няма: павезлі змену на буравую,—павольна, як бы штосьці абдумваючы, сказаў Васіль Іванавіч і нечакана, ажывіўшыся, працягваў:— Але ён ужо павінен вярнуцца, адтуль людзей прывезці. Я, уласна, іх і чакаю, таму і сяджу тут. Пачакай! Зараз прыедуць. Адразу ж на ім і паедзеш, аб чым можа быць гаворка... Праўда, вадзіцель там мярзотны тып, але... паглядзім, можа, угаворым... Ды ты садзіся, не нервуйся. Мінут праз сорак будзеце на месцы.

...Мікалаю Васільевічу здавалася, што прайшло шмат часу. Зірнуўшы на гадзіннік, здзівіўся: крыху больш як дваццаць мінут ён выйшаў з бальніцы. Час для яго прыняў той будзённы справавы ўсёпаглынальны рытм, калі ўрач забываецца аб асабістым і бачыць чужы боль, спрабуючы аблегчыць яго. І ён забыўся, што ў яго сёння святочны вечар, што дома яго ўжо з нецярплівасцю чакаюць жонка і госці. Усе яго думкі цяпер былі заняты адным: трэба дапамагчы хвораму выжыць, а што калі ўсюдыход выпадкова зусім не прыйдзе і хворы застанецца на месцы.

Ён пазваніў у бальніцу, папярэдзіў Паліну Архіпаўну, што павязе Мікіту на аперацыю, папрасіў яе ўкласці ў чамаданчык неадкладнай дапамогі вялікія прастэрылізаваныя шпрыцы і прынесці яго на кватэру да хворага.

У гэты момант з вуліцы данёсся гул матора, і неўзабаве на двор укаціўся з глухім вуркатаннем аблеплены снегам усюдыход і заціх. Праз некалькі хвілін у вагончык увайшоў высокі, у зашмальцаваным кажушку, мужчына сярэдніх гадоў. Васіль Іванавіч, адказаўшы на яго прывітанне, тут жа прапанаваў яму адвезці ў горад цяжкахворага.

— Ды што вы, Васіль Іванавіч! — спуджана шарахнуўся вадзіцель.—Сабак не выганяюць у такое надвор'е, а вы пасылаеце везці некага за сорак кіламетраў. Не-е!

— Аплата двайная і адгул,— коратка вымавіў начальнік геапартыі і запытальна паглядзеў на вадзіцеля.

Вадзіцель, надзьмуўшыся, маўчаў, разважаючы пра нешта.

— Тут хворы да раніцы можа памерці,— парушыўшы цішыню, сказаў Мікалай Васільевіч,— і дзеці яго...

— Не-не, не паеду! — перапыніўшы доктара, злосна і нечакана заявіў вадзіцель.—У мяне таксама дзеці ёсць.

— А сумленне ў вас ёсць? — рэзка спытаўся Мікалай Васільевіч.

— Ёсць, ёсць сумленне! Ёсць! — выкрыкнуў вадзіцель.— А рызыкаваць з-за некага сваёй скурай — к чорту. Вы ўрач, ну й лячыце. За гэта і атрымліваеце грошы,— і, шпурнуўшы на стол нейкія паперы, азлоблены, выскачыў з вагончыка, грукнуўшы дзвярамі.

— Скаціна! — пагардліва выдавіў Васіль Іванавіч, раптам падымаючыся з-за стала.—Пойдзем да хлопцаў у інтэрнат. Хутчэй.

Інтэрнат, старая драўляная будыніна, была здадзена геолагам у арэнду і знаходзілася насупраць базы цераз дарогу. У вялікім разгароджаным пакоі было шумна і мнагалюдна.

— Мужыкі! — энергічна крыкнуў з парога Васіль Іванавіч.— Тэрмінова патрэбна адвезці хворага ў горад. Чалавек памірае! Хто павядзе ўсюдыход?

Усе прыціхлі, застылі на сваіх месцах.

— Хворы пакуль корчыцца ад болю, але ратунак яго толькі ў аперацыі, інакш заўтра будзе труп,— таропка, усхвалявана загаварыў Мікалай Васільевіч, спрабуючы коратка растлумачыць, для чаго патрэбна такая неадкладнасць.

— Ладна, доктар,— сказаў невысокі хлопец ля акна ў цёмным касцюме.— Досыць давіць на свядомасць. Паехалі.

— Маладзец, Андрэй! — стрымана сказаў Васіль Іванавіч і злёгку ляпнуў хлопца па плячы.

Рыкам матора і прыглушаным лязгам гусеніц, перакрываючы завыванні завірухі, усюдыход імкліва падкаціў да хаты Мікіты. Мікалай Васільевіч з Андрэем выскачылі з машыны і бягом накіраваліся ў дом. Пасярод кухні стаяла і атрэсвалася ад снегу Паліна Архіпаўна, на стале ўзвышаўся чамаданчык неадкладнай дапамогі. Хворы ляжаў ужо апрануты з заплюшчанымі вачамі і глуха стагнаў.

— Хутчэй прыбярыце прасціны, накіньце яшчэ коўдру або паўкажушок,— таропка распарадзіўся Мікалай Васільевіч.— А чамаданчык у кабіну.

І тут жа ўдвух з Андрэем яны паднялі з ложка за вуглы матрац разам з хворым і хутка панеслі да ўсюдыхода.

З пакоя данёсся гучны плач дзяцей.

— А цяпер, Андрэй, цісні на ўсю жалезку,— сказаў павесялелым голасам Мікалай Васільевіч, усаджваючыся побач.— Прыпынішся толькі каля маёй хаты: заскочу пераабушча ды сказаць пару слоў жонцы.

Цяпер, калі апала трывожнае напружанне ад быццам нядаўняй безвыходнасці і асуджанасці, калі транспарціроўка хворага ідзе як нельга лепш і праз гадзіну — паўтары ён будзе на аперацыйным стале, доктар успомніў аб доме і аб тых, хто яго цяпер чакае. «Эх, чорт! Дык мог жа захапіць з сабой падарунак, прыпаднёс бы цяпер. Усё менш было б горычы».

Завея ўзмацнялася: вецер станавіўся злейшы, снег паваліў больш густа і вялікімі шматамі. Святло фар не прабівала ўжо і паўметра скрозь белае мільгацеўшае мроіва. Быццам у мяккую сцяну ўткнуліся.

Мікалай Васільевіч прасунуў руку пад коўдру, намацаў запясце хворага. «Пульс пакуль здавальняючы»,— падумаў ён.

— Вось жа паваліў, га, нічога не відаць,— парушыў маўклівасць Андрэй і рэзка збавіў хуткасць. Пераключыўся на блізкае святло. Не дапамагло — дарогі не відаць. Паўзлі амаль наўздагад.

Андрэй выдатна ведаў гэту дарогу, яе спускі і павароты, але ехаць амаль усляпую было вельмі рызыкоўна: на паўдарозе быў небяспечны ўчастак. Дарога там падымалася ўверх, абгінала сопку і двухметровай прыступкай навісала над чыгуначным палатном. А крыху ў бок ад палатна бераг стромка абрываўся да вечна халоднага Ахоцкага мора. Гэты ўчастак дарогі, які выступаў у мора і ахінаў невысокую скалістую сопку, быў вядомы ў пасёлку лад назвай «пупок».

Прайшло больш як дзве гадзіны. Вецер касым патокам раз'юшана сыпаў снег, залепліваючы шыбы, то нечакана ўзрываўся феерверкам і гнаў снежную лавіну ў адваротным напрамку. У такія моманты снег быццам раздувала шалеючай віхурай, і святло фар вырывала абрысы заснежанай дарогі. Андрэй кідаў машыну ўперад, рухаючыся па памяці, зрэдку прытарможваючы, чакаючы чарговага ўзрыўнога парыву ветру...

Усюдыход пачаў павольна праштурхоўвацца на пад'ём.

— Здаецца, на пупок ускарабкаліся,— сказаў Андрэй і спыніў машыну.— Як бы ўніз не змайнаць.

— Сядзі! Я праверу.

Мікалай Васільевіч прыадчыніў жалезныя дзверцы, рыхтуючыся выскачыць. Ветрам з абледзянелым снегам балюча абпаліла яму твар, быццам крапівой хвастанулі па ім, вырвала з рук дзверцы. Трымаючыся за борт, захіляючыся ад ветру, ён выскачыў у звар'яцелую снежную цемру і адчуў, як адна нага слізганула кудысьці ўніз, і ён павіс на руках. У снежнай калючай віхуры, якая раздзірала твар, нічога нельга

было разгледзець, але ён адчуў нагой, якая праваліла-ся, што яны заехалі на край абрыву, яшчэ трохі — і яны абрушыліся б уніз.

А над галавой гула, стагнала завіруха, быццам сама смерць спраўляла свой шалёны танец, радасна ўлюлюкаючы ў чаканні пажывы.

— Андрэй! — з усёй моцы закрычаў Мікалай Васільевіч, падцягваючыся да машыны і залазячы ў кабіну.— Мы вісім над абрывам! Давай назад, а потым крута ўлева.

Машына здрыганулася і падалася назад. Праз хвіліну ўсюдыход зноў папоўз павольна ўперад, асцярожна намацваючы гусеніцамі нябачную дарогу...

— Вось табе й прыехалі! — зласліва сказаў раптам Андрэй, калі ўсюдыход спыніўся, не адолеўшы пасля некалькіх спроб снежны завал, уткнуўшыся ў яго фарамі.— Ну, доктар, што будзем рабіць цяпер, га?

«Калі завязнем — гэта смерць,— падумаў Мікалай Васільевіч. — Не крыкнеш: мацуйся, хлопец. Не дапаможа».

— Дык што ж рабіць, доктар?

— Прабівацца,— выціснуў Мікалай Васільевіч і рэзка дабавіў: — Хоць рукамі разграбаць снег, але толькі ўперад! Разумееш? Рухацца толькі ўперад! За намі па пятах смерць крадзецца. Разумееш?.. Есць хоць чым кідаць снег?

Андрэй выцягнуў з-за бакавога сядзення лапаты, здаў трохі назад. Яны выскачылі з цёплай машыны і азвярэла пачалі разбіваць ледзь не вертыкальную сцяну снежнага завалу, шчыльна ўтрамбаваную моцным, раз'юшаным ветрам. Трэба было разбіць стромы бок завалу, зрабіць яго больш пакатым, каб быў хоць невялікі праход. І яны яго прабівалі, ахутаныя снежнай віхурай, у слабым святле промняў фар.

Усюдыход з разгону ўляцеў у разбураны снежны праём і, прыціскаючыся да сопкі, успорваючы спрасаваны снег, павольна пачаў рухацца наперад.

— Фу ты, чорт! — выціраючы хусткай мокры твар і атрасаючыся, сказаў Мікалай Васільевіч. — Яшчэ адну перашкоду адолелі.

— Як у казцы,— заўважыў Андрэй.— Чым далей, тым страшней.

Снег раптам паваліў настолькі густы, што за ветравымі шыбамі навісла скразная белая мільгатлівая імгла.

— А ў нас наадварот, Андрэй: страшней ззаду. Спераду ў нас шчаслівы ўсё-такі канец. Ды ўжо нямнога і засталося. Ты толькі гані, каб...

Доктар нечакана змоўк, сутаргава сціснуўшы сківіцы і ўчапіўшыся за скабу спераду. Усюдыход рэзка і імкліва паляцеў кудысьці ўніз, быццам нырнуў у снежны вір, і спыніўся. У момант стала цёмна. Ад імклівага палёту ўніз і штуршка гучна застагнаў хворы. Андрэй, праклінаючы ўсё на свеце, уключыў унутранае святло.

— Ш-што гэта? —атарапела спытаўся Мікалай Васільевіч.

— Уляцелі ў распадак, хай ён будзе тройчы праклятый. Добра, што неглыбокі. Можа, й выкарабкаемся.

Рэзка тузаючы рычагамі і моцна газуючы, ён спрабаваў выбрацца з распадка заднім ходам. Прасунуліся не больш як на метр. Надрыўна роў матор, усюдыход уздрыгваў, быццам яго дзяўблі адбойным малатком.

— Не, зараза, назад не цягне,— сказаў быццам самому сабе Андрэй.— Не было б снегу, сігануў бы напрамкі, і былі б на дарозе. А цяпер невядома, куды і совацца.

— Можа, усё ж паспрабуем уперад, га?—няўпэўнена, з нейкай нясмелай надзеяй прапанаваў Мікалай Васільевіч.

Усюдыход рвануўся ўперад, улазячы ў прабітую нару, і спыніўся: снег шчыльным пластом напаўзаў і ціснуў на ветравыя шыбы. Ірвануліся назад — ні з месца.

— Ну, цяпер хана! Селі капітальна!

— Як селі? — палахліва выкрыкнуў Мікалай Васільевіч.

— Ды на бруха, як жа яшчэ. Буксуем вунь ужо.

Мікалая Васільевіча кінула ў жар. Адбылося непапраўнае, і так адразу, у момант, як абухом па галаве. Стала цяжка дыхаць. Хацелася выбрацца з гэтай цеснай жалезнай скрыні і ісці ў завею, куды вочы глядзяць. Выбрацца яшчэ можна праз задні борт. Потым замяце, і давядзецца рэзаць дах, каб вырвацца. Але для чаго выбірацца? Гэтыя некалькі кіламетраў стануць апошнімі ў жыцці ўсіх траіх... Ну як жа так: амаль у канцы шляху і так недарэчна, безразважна ўваліцца ў гэты распракляты яр? Што ж цяпер рабіць? Ну што, што?.. Сядзець і чакаць?.. Чаго?

Андрэй прыгнечана маўчаў, зрэдку паглядваў запытальна на Мікалая Васільевіча. Ён адчуваў сябе бязмежна вінаватым перад урачом і гэтым хлопцам, што паміраў. Гэта смерць будзе на яго сумленні. Але ж хацелася хутчэй. Эх, каб толькі не замяло ў дарозе, ён валок бы яго на ўласным гарбу ў гэту бальніцу. Дый дарогу ж паспрабуй яшчэ знайдзі.

— Так, становішча, — няпэўна вымавіў Мікалай Васільевіч. — Безвыходнае літаральна... Скора, напэўна, замяце зусім.

Усюдыход, які нахіліўся наперад, яшчэ вібраваў ад работы матора, а зверху вар'яцела завіруха, намятаючы ўсё больш і больш снегу, гула і выла ў распадках, быццам зграя сабак, якія прадказвалі ў доме бяду.

У цеснай кабіне, якая была напоўнена жаўтаватым цьмяным святлом, было пакуль цёпла, і толькі зрэдку чуліся глухія стогны, якія нагадвалі аб немінучай бядзе.

«Што я магу зрабіць цяпер, акрамя падтрымання ўколамі?—пакутліва мучыў сябе Мікалай Васільевіч. — Дый яны цяпер ненадоўга. Вось табе і дапамог. А што, уласна, можна зрабіць у гэтай снежнай магіле, калі ў яго перытаніт?.. А калі... калі... не перытаніт? Можа, я памыліўся з дыягназам? Такое часта бывае ў медыцыне... Але, што тады? Хворы ж гіне, і да раніцы ён больш будзе на небе, чым на зямлі. Што б там ні было — пажар у брушной поласці, як кажуць хірургі. Гэта ўжо дакладна. А нешта зрабіць неабходна, і тэрмінова».

Мікалай Васільевіч сарваў шапку, расшпіліўся. У дадатак да ўсяго яго прыгнятала вымушанасць паставы: у пакоі хоць рухацца можна, усё ж лягчэй думаецца.

«Менінгіт таксама пажар, ды яшчэ які, — працягваў мучыцца разважаннямі Мікалай Васільевіч. — У апошні час яго лечаць велізарнымі дозамі антыбіётыкаў. Можа.., рызыкнуць? Акрамя смерці, траціць цяпер няма чаго».

Глянуў на гадзіннік — поўнач.

— Ён жывы, жывы! — адчайна выкрыкнуў Мікалай Васільевіч і з усёй моцы, перамагаючы велізарнейшы цяжар ва ўсім целе, млява неяк пачаў адбівацца ад гэтых жудасных лап, якія скоўвалі холадам ногі і рукі, нястрымна забіраліся пад адзежу да спіны, замарожваючы душу і цела, паралізуючы ўвесь арганізм.

Мікалай Васільевіч пакутліва напружыўся, прыцэліўся і стукнуў нарэшце кулаком у гэту бязвокую пачвару. І раптам, быццам нешта лопнула, вызваляючы яго, і ўсё кудысьці знікла...

Ён ляжаў скурчаны ўнізе на халодным жалезе, хутка выходзіў з адчуванняў пакутлівай барацьбы. Па целе прабягалі дрыжыкі, калені, здавалася, прымерзлі да металу, ціснула цемната. Цяжка ўзабраўшыся на сядзенне, пачаў расціраць анямелыя ногі і нечакана штосьці ўспомніў, хутка прасунуў у цемень руку, намацаў плячо Андрэя і моцна пачаў трэсці яго.

— Андрэй! Андрэй! Святло! Хутчэй давай святло!

У жаўтаватым святле, якое выдавіла цемень, яны нахіліліся над ахутаным хворым: ні стогну, ні дыхання. З-пад коўдры выглядваў нежывы, бляклы, з завостраным носам твар Мікіты.

«Вось табе і сон у руку», — з жахам падумаў Мікалай Васільевіч.

— Ён — што-о, ужо канцы аддаў, га? — заікаючыся, спуджана зашаптаў над галавой Андрэй.

— Колькі часу? — коратка спытаў доктар.

— С-скора восем.

Мікалай Васільевіч хутка пачаў раскручваць цёплыя коўдры. Сэрца ў грудзях стукала, быццам лупілі па агромністай пустой бочцы, гулка аддавалася ў кончыкі пальцаў, перашкаджаючы ўлавіць пульс на руцэ хворага. Хутка ўваткнуў у вушы фанендаскоп, рыўком пацягнуў уверх адзежу на грудзях хворага, спрабуючы агаліць трохі грудзі і выслухаць сэрца — ці б'ецца яно.

— Мікіта! Жывы! — здзіўлена-радасна ўсклікнуў Мікалай Васільевіч і павярнуўся да Андрэя. — Жывы! — і гучна, аблегчана ўздыхнуў усімі грудзьмі, змахнуў тылам далоні кроплі поту з ілба і зноў пачаў рыхтаваць медыкаменты і шпрыцы для выратавальных пакуль што ўколаў...

Санлівасць знікла, але ў цемры, пад аднастайны гул завеі вочы заплюшчваліся самі сабой, марылася.

— Калі ўжо да раніцы не памёр,—загаварыў ціха Андрэй, — то гэты дзень наш Мікіта абавязкова працягне. Нябожчыкі, звычайна, раніцай адыходзяць.

— Каб ты быў прарокам, — са шкадаваннем сказаў Мікалай Васільевіч. — Але я бачыў смерць і днём і вечарам... Гэта дама працуе без перакураў і цяпер рэдка наладжвае свае спатканні толькі на світанні.

А над галовамі, не перастаючы ні на хвіліну, раўла завея, то люта і нечакана вухаючы, то адчайна завываючы. Прыслухоўваючыся да гэтых гукаў, Андрэй пачаў расказваць пра сахалінскую завею. Якія нечаканыя сюрпрызы часам яна падкідвае!

— Мінулай зімой вырашыў неяк з'ездзіць у Паранайск пасля чарговай завеі. Праехалі паўдарогі, і раптам нечарговая, ды як улупіць, дык трое сутак прастаялі на нейкім раз'ездзе, халодныя і галодныя як сабакі. У мясцовых жыхароў і ў ларку закупілі і з'елі ўсе харчы, якія толькі дзе заваляліся ў іх. Усё падчысцілі.

Ад напамінку пра яду ў абодвух засмактала пад дыхавіцай.

— Так, — сказаў Андрэй, уключаючы і выключаючы святло, — скора абед, а там, глядзі, і вячэра, а потым зноў ноч, — ён асекся, замоўк.

— Есці вельмі хочаш? — вяла спытаўся доктар.

— Ды не, трываць яшчэ магчыма.

— Нашто трываць? Зараз падмацуемся, — запэўніў Мікалай Васільевіч і палез у свой чамаданчык з медыкаментамі. — Вось табе ампулы глюкозы і парашкі вітаміна С.

— Ну што вы, доктар, не трэба. Яй-богу, трываць можна, — запярэчыў Андрэй і кіўнуў галавой назад. — Яму лепш пакіньце.

— І для яго хопіць... Адразай ампулу, сып туды пабольш вітаміну, страсяні і пі на здароўе.

Нечакана застагнаў Мікіта і ціхім аслабленым голасам папрасіў піць. Яны напаілі яго гэтай жа сумессю, і закончыўшы свой медыкаментозны абед, зноў папрузіліся ў цемру, у свае думкі. Праз прарваную ў брызенце дзірку намятала снежныя крупы і відаць была шэрая клубамі маса надышоўшага дня.

Заціснула, заныла тужліва ў грудзях у Мікалая Васільевіча, калі ён падумаў пра дом, пра жонку. «Бедалага! Змучылася ўся, напэўна, чакаючы тэлефоннага званка і не ведаючы, што з намі робіцца. Не чакай яго—правады яшчэ ўчора паабрывала... І сёння, мілая, калі прыйдуць наведаць сябры, мяне яшчэ не будзе... Але мяне чакай!.. Колькі — не ведаю, цяпер ужо, калі знойдуць нас!».

— Доктар! Я вось хачу ў вас спытаць, — ціха, з нейкім напружаннем загаварыў нечакана Андрэй. — Здорава папала б вам, каб не павезлі яго, ну... і ён загнуўся б, га?

— А што? — здзівіўся Мікалай Васільевіч.

— Ды вось думаю ўсё: што заставіла вас паехаць?

Мікалай Васільевіч хмыкнуў, заскрыпеў сядзеннем і суха адказаў:

— Урачэбны абавязак, — падумаў трохі і дабавіў. — Стыхія поўнасцю мяне апраўдала б.

— Тады незразумела, навошта пайшлі на гэту рызыку, пакінуўшы жонку і сяброў, сапсавалі такое свята сабе і людзям? Гэтыя ж уколы можна было і дома рабіць. Нават зручней было б.

— А ты чаму паехаў? — замест адказу глуха і неяк раптоўна спытаўся Мікалай Васільевіч. — Другія не захацелі і не паехалі.

— Ведаеце, нягодніка ў любым калектыве знойдзеш.

— Ну, а ты ж чаму паехаў?

— Я? Хм!.. Вы пераканалі, што будзе жыццё, калі давязём, — разгублена неяк, заікаючыся, загаварыў Андрэй. — А жыццё варта рызыкі... Дый наогул паважаю талковую рызыку.

Да канца першай паловы дня бесперапынны гул, які давіў у вушы, трохі прыціх.

— Ці завея заціхае, — задумліва вымавіў у цемнаце Андрэй і выключыў святло, — або нас капітальна заваліла.

— А ну, выглянь яшчэ разок у дзірку. Паглядзі, як там замятае і ці не завальвае нас зусім, — сказаў Мікалай Васільевіч і рукой прасунуўся пад коўдру, намацаў на руцэ пульс хворага і адзначыў пра сябе: «Пакуль яшчэ б'ецца».

Андрэй пералез цераз хворага, падабраўся да дзіркі і ўсунуў туды галаву. Праз некалькі хвілін ён вярнуўся на сваё месца, выцер рукавом твар і павольна, быццам узважваючы словы, загаварыў:

— Завея быццам бы заціхае... Ды вось... Цямнець ужо пачынае.

— Зімовыя дні вельмі кароткія.

— Чорт вазьмі! — з раздражненнем сказаў Андрэй. — Ведаць бы хоць, колькі мы тут працягнем яшчэ.

— Мы-та працягнем доўга, — павольна і задумліва вымавіў Мікалай Васільевіч.

Раптоўна наступіла цішыня.

— А ён? — глухім шэптам спытаўся нечакана Андрэй.

Мікалай Васільевіч маўчаў. З самага пачатку ён не думаў аб гэтым, а рабіў усё, што ведаў і што мог, каб падтрымаць жыццё ў гэтым чалавеку і давезці яго да бальніцы. І зараз гэта пытанне, зададзенае зусім ціха, як выбух, таіла ў сабе трагічную няўхільнасць, і адказаць на яго ён не мог: насоўвалася другая ноч, поўная барацьбы, турботнага чакання і надзей.

А зверху, над імі, захлынаючыся патроху, заціхаючы на кароткія прамежкі часу, усё яшчэ лютавала завея.

Пераклад з рускай.

Мар'ян ДУКСА

●

Ідзе вясёлаю хадой —
У брыгадзіра крок піжонны...
Ну як жа — хлопец раскляшоны,
Ну як жа — хлопец з барадой.

Глядзяць вавёркамі услед
Яго дзяўчаты-аднагодкі.
Усе прадбачлівыя цёткі
Заўзята клічуць на абед.

Не, ён абедаць не гатоў,
Крутне педаль нагою звыкла,
Махне рукою з матацыкла —
І з ветрам шпарыць да жытоў.

Жыты сыпучыя — чалом,
Гавораць, шастаючы, просім...
Зазыўна гойдаюць калоссем —
Лічы, паверылі ў дыплом!

Генадзь ДЗМІТРЫЕЎ

Пасвячэнне ў будаўнікі

Я запомню той дзень назаўжды...
Люты сівер.
Мароз пякельны...
Як медаль,
уручыў брыгадзір
Мне старую блішчастую кельму.
Аб цагліны зашамкаў раствор —
І пайшла,
закіпела работа...
Будаўнічае рамяство
Скрозь прапахла
вятрамі і потам.
Спраўна цэгла кладзецца ў рады,
Змацаваная моцным растворам.
Вырастаюць з радоў гарады:
Рад за радам —
за горадам горад.
Уздымаюць праверхі муры
У аблоках,
нібы ў завітушках...
Толькі мы тут гаспадары,
Мы, крылатыя, —
людзі і птушкі.
І ляцім мы,
ляцім над зямлёй,
Быццам вырай у небе бясконцым...
Мы шчаслівыя доляй такой:
Набліжацца штодзённа да сонца.

Вы ўяўляеце?

Зеўс Праметэю крычаў:
— Даганю!
Кідаў
маланкай,
Грымотамі лаяўся...
Што, каб дагнаў?
Чалавек — без агню!
Вы ўяўляеце?

Зеўсавай помстай —
адвечнае зло —
Чорнаю зданню па свеце туляецца.
Колькі ў зямлю Праметэяў лягло! —
Вы ўяўляеце?

Ідалы смерці аб страшнай сяўбе
Трызняць
і сілай сваёй выхваляюцца...
Свет
без агню, без дабра,
без сябе —
Вы ўяўляеце?

Міхась МЕЛЬНІК

Міхась Мельнік працуе выкладчыкам роднай мовы і літаратуры Голдаўскай сярэдняй школы Лідскага раёна. У нашым штотыднёвіку выступае ўпершыню.

Пратэст

Рукі яго
будавалі дом, у якім гадаваліся дзеці;
рукі яго
даглядалі поле,
што хлебам надзённым карміла;
рукі яго
саджалі дрэва, якое пладамі дарыла;
рукі яго
ворага білі;
рукі яго
працу любілі...
Гэтыя рукі
вайна адабрала.
Новага дома не стала,
дрэва не вырасла,
поле сумуе...
Несціхана рыпіць пратэз —
вайне пратэст!

Юрка ЛЕПЕЦ

Юрка Лепец нарадзіўся ў 1961 годзе ў вёсцы Грыцкавічы Зэльвенскага раёна. Сёлета закончыў дзесяцігодку. З вершамі ў «ЛіМе» выступае ўпершыню.

●

Дождж стракаты
травы-шчоткі
нечакана абрасіў.
Куст парэчак, што ля хаты
Вусы рана адпусціў.
На бярозу глянеш збоку.
З-пад рукі, як з-пад крыла,
Так пяшчотна цешыць вока,
Бы дзяўчына — расцвіла.
Уся прырода, як з іголкі,
Рэзка ззяе ў чысціні.
Усміхаецца вясёлка
З неабсяжнай вышыні.

Ураджайная пара.

Фота А. КОЛАСАВА.

ПЯЮЦЬ ЖАЎРАНКІ

Імклівыя берагі Нёмана, запаволены рух аблокаў над навагрудскім замкам, вясёлкавыя ручнікі прасёлкаў Гродзеншчыны заўсёды зачароўвалі майстроў пэндзля, каб пасля знайсці другое жыццё на палотнах і будзіць пачуцці людзей, хваляваць. Так здарылася і з юнаком з растоўскай станіцы Гуляй-Барысаўка Анатолем Гаршкавозам: пагасцяваў ён некалькі разоў у мастака Д. Парахні ў Гродне і «прыкіпеў» да гэтых мясцін, да мясцовай «натуры». Пасля заканчэння Растоўскага мастацкага вучылішча імя М. Грэкава з няўтольнай прагай працаваць прыехаў у горад на Нёмане.

Высокае акно яго майстэрні як бы навісае над зялёным, шумлівым па-жніўеньску паркам — у пакой уплывае яркае ветранае неба, якое жыве, пераліваецца ўсімі фарбамі на многіх акварэлях мастака. А іх тут — мноства, і кожная можа пацвердзіць, што іх аўтар заўсёды ў пошуку, сумняваецца, пачынае наноў, каб у нейкае імгненне адчуць: праца была недарэмнай. Размова ідзе аб адной з апошніх задум, якая ўжо ўвасабляецца на палатне, чакае свайго завяршэння.

Глухі куток краіны, зіма першага года вайны. На вясковай заснежанай вуліцы каля гучнагаварыцеля сабраліся старыя, жанкі, дзеці. Яны слухаюць трывожныя звесткі з фронту. Такі, па сутнасці, сюжэт палатна.

— Гэта карціна працягвае маю дыпломную работу,— гаворыць Анатоль.— На ёй няма ніводнага выдуманага чалавека, ніводнага выдуманага твару. Я ведаю гэтых людзей, як сваіх родных. Давялося шмат перахвалявацца, ужыцца ва ўспаміны маці, каб уваскрасіць пэндзлем нябачаны самім грозны час. На гэту тэму і зроблена ўжо шмат, але ж перажытае хвалюе і нас, маладых.

Жанчына, якая правяла мужа на фронт, зусім ссівелы дзед, што пабачыў не адну свінцовую навальніцу, юная дзяўчына, уся ў думках пра свой лёс, і маленькае дзяўчо, захутанае ў матчыну хустку, — усе яны ўмясцілі ў сваіх вачах і душах скруху і надзею народа. Тут жа застылая ў чаканні і маці мастака — пад напружаным, напоўненым трывогай за лёс зямлі небам. Есць у гэтай рабоце ўжо знойдзеныя сімвалы, азначаны характары, але мастак усё не задаволены, зноў і зноў сумняваецца ў чымсьці. І вось менавіта гэтыя сумненні і адрозніваюць сумленнага майстра ад рамесніка, яны ўрэшце і вызначаюць лёс твора.

Анатоль Гаршкавоз, што маглі заўважыць наведвальнікі выставак з яго ўдзелам, улюбён у яркія колеры, а яшчэ дакладней — у кантрасты, падкрэсліваючы гэтым сваё здаровае ўспрыняцце жыцця, чалавека, юнацтва, і няхай гэта будуць нацюрморты, пейзажы, партрэты, цыклы «Тут будзе БАМ», «Беларусы на БАМе», «Край азёрны» — ва ўсім адчуваецца адметны почырк, свая манера.

Гаршкавоз доўга не заседжваецца ў майстэрні, лічачы, што быць «дамаседам» — значыць страціць пачуццё руху, пазнання новых фарбаў і характараў. Таму і бываў ён са сваім эцюднікам у Прыбалтыцы і Калмыкіі, Яраслаўлі і Суздалі, на Каўказе і ў Якуціі. Тры гады назад па камандзіроўцы ЦК ЛКСМБ ён месяц жыў на Байкала-Амурскай магістралі, у пасёлку Залацінка. Асляпляльнае сонца Сібіры, мужная прырода поўдня Якуціі глыбока ўразілі і адначасова далі такі матэрыял, ад якога дух заняло. Анатоль узяўся за цыкл «Тут будзе БАМ». Лісты «Вечная мерзлата», «Рака Нерынг», «Вечныя льды», «Вырваныя дрэвы» ўвасобілі ў сабе і таемную магутнасць прыроды, і валявы поступ чалавека па некранутых мясцінах суровага краю. Пэндзаль мастака паказаў, што тут чалавеку будзе нялёгка, тут патрэбна сіла, воля, уменне — для пераўтварэння, для здзяйснення задуманага. Асобныя работы гэтага цыкла былі адабраны для ўдзелу ў конкурсе «Карчагінцы 70-х», арганізаванага ЦК ВЛКСМ, Міністэрствам культуры СССР, творчымі саюзамі краіны. Яны экспанаваліся на буйных выстаўках, атрымалі высокую адзнаку, а пры падвядзенні вынікаў конкурсу за серыю акварэляў «Тут будзе БАМ» А. Гаршкавоз быў удастоены заахвочвальнай прэміі.

— Да 60-годдзя БССР і Кампартыі рэспублікі я рыхтую новы цыкл «Беларусы на БАМе»,— расказвае пра свае планы мастак.— Ен прадоўжыць тое, над чым працаваў раней. Людзі магістралі жывуць у маім уяўленні, я заўсёды побач з імі.

А. Гаршкавоз. У эфіры «Песняры». Тэмпера. З цыкла «Беларусы на БАМе».

«Там, дзе багун цвіце», «Скрозь хрыбет», «За кветкамі на вяселле», «На просецы», «Маляры з Гродна» — кавалачкі з жыцця, будзённасць і свята, напружанне мускулаў і адпачынак, буянне травы і гарэзлівасць маладосці. На адным лісце («Скрозь хрыбет») мастак шукае драматычныя таны, на другім («Маляры з Гродна») пэндзаль пяшчотна малюе чатырох дзяўчын, якія на фоне агромністых халодных цыстэрнаў глядзяцца светла і натуральна.

Канечне, не ўсё яшчэ знойдзена, многае яшчэ патрабуе дапрацоўкі, пачынаючы зноў з эцюдаў — матэрыялу, які патрэбен толькі мастаку. Шмат чаго будзе адкінута, як часовае, мінучае — гэта дакладна ведае Анатоль. Інакш і нельга рыхтавацца да вялікіх сур'ёзных выставак, да сустрэчы з гледачамі.

Мастак перабірае стос акварэльных лістоў. Яны — з серыі «Край азёрны». Вось «Вёска Салаўі», а гэта — «Камяні». Сярод вечнага поля ляжаць аграмадныя валуны, як сведкі часоў і падзей. А далей — зноў лірычны матыў...

— А вось мая першая акварэль «Пяюць жаўранкі»,— узрадаваўся Анатоль.— Я нават па ёй засумаваў...

На лісце панае светлы настрой, зялёныя, блакітныя таны, палі і прасторы. Птушак тут не відно. І ўсё-такі — пяюць жаўранкі.

Ю. ГОРНЫ.

У ДОБРЫ ШЛЯХ, УНІВЕРСІТЭТ!

Сёлетні Першамай для гродзенцаў стаў двайным святам. У гэты дзень горад атрымаў ранг універсітэцкага і пачалося афіцыйнае жыццё трэцяга ў рэспубліцы і 52-га ў краіне Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта. Чым выклікана гэта? Безумоўна, тым, што прамысловасць у нашым краі развіваецца надзвычай хуткімі тэмпамі. Колькі ў адным Гродне буйных заводаў і камбінатаў! Без высокакваліфікаваных спецыялістаў паскораны шлях наперад развіцця народнай гаспадаркі, навукі і культуры немагчымы. А патрэбных работнікаў можа даць універсітэцкая форма адукацыі—найлепшая сёння для іх падрыхтоўкі. Словам, стварэнне універсітэта выклікана самім жыццём. Універсітэт створаны на базе былога педагагічнага інстытута і мае пакуль 5 факультэтаў: фізічны, матэматычны, гістарычны, філалагічны і правазнаўства.

Так пачаў нашу размову рэктар новай навучальнай установы прафесар Аляксандр Васільевіч Бадакоў. Варта адзначыць, што ў часе нашай размовы найбольш часта гучалі такія словы, як сучасны, арыгінальны, таленавіты, працавіты, упершыню ў краіне, рэспубліцы.

Не выпадкова. Малады калектыў усімі сваімі імкненнямі скіраваны ў сучаснасць, у будучыню. Словы гэтыя трэба разумець у самым шырокім сэнсе. Узяць хоць бы толькі самыя назвы факультэтаў, іх спецыялізацыйную характарыстыку.

— Нашы фізікі (студэнты фізічнага факультэта), — адзначае Аляксандр Васільевіч, — будуць спецыялізавацца па праблемах квантавай электронікі, оптыкі і спектраскапіі. А на матэматычным факультэце прадугледжваецца ўвесці такія напрамкі, як вылічальная матэматыка і тэарэтычная кібернетыка, а таксама алгебра, геаметрыя, дыферэнцыйныя ўраўненні і іх прымяненне.

Далейшае развіццё атрымаюць і так званыя традыцыйныя нашы факультэты і аддзяленні. Прадугледжваюцца, напрыклад, спецкурсы і спецсемінары на рускім і беларускім аддзяленнях, дзе мяркуецца вывучаць дысцыпліны, звязаныя з метадалагічнымі праблемамі літаратуразнаўства і мовазнаўства. У сувязі з гэтым на абодвух аддзяленнях намячаецца спецыялізацыя па літаратуразнаўству і лінгвістыцы. Студэнты гістарычнага факультэта будуць мець магчымасць спецыялізавацца па такіх спецыяльнасцях, як гісторыя СССР, агульная гісторыя, гісторыя рэлігіі і навуковага атэізму.

Вялікая патрэба адчуваецца ў спецыялістах з вышэйшай юрыдычнай адукацыяй. Іх таксама будзем рыхтаваць, пачынаючы ўжо з гэтага года. Характэрна, што выпускнікі факультэта правазнаўства знойдуць прымяненне сваім ведам і сілам не толькі ў органах пракуратуры і правапарадку, але і на прадпрыемствах і ва ўстановах, калгасах і саўгасах.

«Перарастанне» педагагічнага інстытута імя Я. Купалы ва універсітэт, бясспрэчна, ставіць перад калектывам апошняга нямала самых разнастайных праблем. Вядома, што адно з найбольш вострых пытанняў — гэта стварэнне адпаведнай матэрыяльнай базы, без якой нельга ўявіць сабе нармальны навучальны і выхаваўчы працэс. За вырашэнне гэтай задачы ўзяліся яшчэ некалькі месяцаў таму назад. Варта пабываць цяпер у аўдыторыях і кабінетах ВНУ, каб пераканацца, як многа ўжо зроблена.

Пераабсталёўваюцца і аснашчаюцца сучаснай тэхнікай і апаратурай лабараторыі, кабінеты і майстэрні. Створана ўжо 9 новых лабараторый для патрэб, у асноўным, факультэта фізікі, а старыя—мадэрнізуюцца і дастасоўваюцца да патрэб сённяшняга дня. Варта адзначыць і тое, што поўным ходам вядуцца работы па стварэнню сучаснага вылічальнага цэнтра.

З дальнім «прыцэлам» арганізоўваецца і тэлевізійны цэнтр з сістэмай замкнутага тэлебачання ў галоўным корпусе. З пачаткам новага навучальнага года пачнуць дзейнічаць кабінеты дзяржавы і права, а таксама чатыры комплексна аснашчаныя аўдыторыі, забяспечаныя неабходнай літаратурай бібліятэкі.

Што называецца, на хаду даводзіцца перабудоўвацца і прафесарска - выкладчыцкаму персаналу, дастасоўвацца да патрэб універсітэта. З улікам новых запатрабаванняў складаюцца новыя канспекты, планы і методыкі. Шмат што ўжо ў гэтым напрамку зроблена, бо пачатак новага навучальнага года не за гарамі.

Ва ўяўленні рэктара ўжо дакладна акрэсліваецца не толькі дзень сённяшні універсітэта, але і заўтрашні. Вядома, усё тое, што прадстаіць пабудаваць, павінна быць сучасным, прыгожым, дастасаваным да падрыхтоўкі спецыялістаў высокага класа. Возьмем новы вучэбны корпус. Праўда, пакуль што яго контуры вырысоўваюцца толькі на чарцёжных дошках архітэктараў і канструктараў. Але заказчык запатрабаваў, каб гэта быў 12-павярховы будынак сучаснай архітэктуры, функцыянальны і прыгожы. Супрацоўнікі спецыялізаванага праектнага інстытута «Гіпраўз» абяцалі спраектаваць яго менавіта такім. Рыхтуецца таксама праект новага студэнцкага інтэрната на 400 месц.

Універсітэт камплектуецца ў асноўным маладымі, здольнымі вучонымі, якія праявілі сябе ў той ці іншай галіне навукі. Аддаць свае сілы і здольнасці новай ВНУ пажадалі прадстаўнікі Мінска, Гомеля, Вільнюса, іншых гарадоў краіны. Акрамя таго, зроблены пэўны «закід» на будучае. У навучальных і вучэбных установах Масквы, Ленінграда, Мінска займаецца каля 60 гродзенскіх аспірантаў. Прадугледжана таксама накіраваць аспірантамі БДУ, Акадэміі навук БССР, Ленінградскага педагагічнага інстытута яшчэ 20 здольных маладых людзей.

Нягледзячы на тое, што універсітэт існуе ўсяго некалькі месяцаў, яго ўжо добра ведаюць не толькі ў нашай рэспубліцы, але і далёка за яе межамі. Сведчаннем з'яўляецца той факт, што толькі сёлета яго студэнтамі пажадалі стаць 1150 юнакоў і дзяўчат Гродзеншчыны, іншых абласцей Беларусі, а таксама суседніх рэспублік. Каму з іх усміхнецца шчасце, пакуль што невядома. Вядома толькі, што экзаменацыйнае «сіта» адбярэ найбольш здольных, найбольш працавітых і настойлівых.

— Павінен заўважыць, — расказвае Аляксандр Васільевіч,—што паступае ў асноўным добра падрыхтаваная моладзь. Многія маюць някепскую жыццёвую загартоўку: гэта маладыя рабочыя, калгаснікі, салдаты Савецкай Арміі і Ваенна-Марскога Флоту. Але найбольш—учарашнія дзесяцікласнікі. Сярод іх 56 медалістаў.

Хто ўрэшце будзе студэнтам, пакажуць канчатковыя вынікі ўступных экзаменаў, рашэнне экзаменацыйнай камісіі. Аднак ужо сёння, напрыклад, вядома, што Алена Лешан стала студэнткай першага курса фізічнага факультэта. Падкрэслім — першай студэнткай Гродзенскага універсітэта. Яна закончыла сярэднюю школу на «4» і «5», першы экзамен па спецыяльнасці здала на выдатна.

Напружаным, паўнакроўным жыццём адзначаны працоўныя будні новай ВНУ. Яе першыя крокі цвёрдыя, упэўненыя. Яны дараўноўваюцца той размашыстай хадзе, якой паспяшае сёння ўсё Наднямонне, сам старажытны горад над берагамі імклівай ракі.

В. ІВАНОЎСКІ.

Першыя абітурыенты універсітэта.

Ідуць заняткі ў завочнікаў.

У лабараторыі.

Фота А. КОЛАСАВА.

Ажывае ў дрэве казка...

Вы не заўважалі часам, што менавіта ў лесе хаваецца сапраўдная чараўніца-казка? Прыглядзьцеся ўважлівей. Вунь страшны лясун з насупленымі бровамі, сярдзіта разяўленым ротам, шырока раскінутымі рукамі нахабна выглядвае з-пад чорнага выватрня. А побач — пянёк пад белым круглым капелюшом, бы насунутым на самыя вушы. Ці не схаваўся гэта ад старонняга вока адзін з добрых сямі гномаў — маленькіх дзядкоў-чараўнікоў з казкі братоў Грым?

Многія бываюць у лесе. Але не ўсе бачаць у спатканні з зялёным сябрам невычэрпную крыніцу для натхнення, не многія ўмеюць чуць, разумець, назіраць, адчуваць прыроду. Так, на працягу стагоддзяў людзі бачылі, як падае снег. Але трэба было з'явіцца вельмі назіральнаму чалавеку, каб заўважыць, якую правільную, якую цудоўна прыгожую форму мае кожная сняжынка. Заўважыць і сказаць аб гэтым іншым.

Такія думкі міжволі прыйшлі ў галаву, калі мы сядзелі ў альтанцы, што знаходзіцца ў двары Берштаўскай участковай бальніцы Шчучынскага раёна. Альтанка — законны гонар галоўнага ўрача А. Сарокіна. Прырода, бы спецыяльна, перапляла сасновыя карэнні і, як лотас, або кіпарыс, ці чароўную бутэльку Джына, раў. юсенька звузіла ўверсе.

— Ля гэтай сухастоіны я гады са два хадзіў,— расказвае Анатоль Сямёнавіч,— і ў думках кожны раз яскрава ўяўляў альтанку ў закончаным выглядзе.

Па просьбе ўрача дрэва было выкарчавана і з усімі перасцярогамі даставлена на бальнічны двор. Ачысціць карэнне, зрабіць своеасаблівы дах з высушанага чароту не выклікала цяжкасцей. Цяпер у альтанцы часта можна ўбачыць хворых і іх наведвальнікаў. Усе з задавальненнем адпачываюць на самаробных лаўках з карчэжын, ступаюць па мазаічнай падлозе.

Анатоль Сямёнавіч жыве на тэрыторыі бальніцы. «Я заўсёды сам у сябе пад рукой»,— жартуе ён. У кватэры многа рэчаў, зробленых умелымі рукамі гаспадара. З чорнага дрэва з ланцугамі і падсвечнікамі люстра, напрыклад, магло б упрыгожыць самую сучасную кватэру.

Па-майстэрску аздоблены з дрэва гаршчочак для кактуса. Ён арганічна зліваецца з кветкай, бы працягвае яе. Гэтак жа арыгінальна зроблена бра, столікі, вешалка з рагоў, падсвечнікі, пацеркі і іншыя рэчы.

— Наогул, вырабы ў мяне доўга не затрымліваюцца,— усміхаецца Сарокін,— іх звычайна разбіраюць сябры і знаёмыя ў якасці сувеніраў. А вось бачыце гэтую сімпатычную малпачку з карэння? Гэта мне прывёз сябар і аднакурснік Юра Бяляеў. Ён таксама прыхільнік прыгожага. Толькі ў яго асноўны матэрыял — карэнні, а ў мяне, апрача іх, рогі аленяў, нарасты на бярозах, грыбы-трутавікі. Асноўны інструмент — лобзік і такарны станок.

Заядлы паляўнічы і рыбалоў, А. Сарокін лічыць, што яму проста пашанцавала трапіць пасля інстытута ў Бершты. Маляўнічая непаўторная прырода, грыбны і ягадны лес, прыгожае, вялікае рыбнае возера з чаромхавымі і парэчкавымі зараснікамі.

Нялёгкі хлеб ва ўчастковага ўрача на вёсцы. Нямнога ў яго вольнага часу. Вось і нашу кароткую гутарку перапыніў мужчына, які літаральна кінуўся да Анатоля Сямёнавіча:

— Доктар, сынок захварэў.

— Зараз едзем,—Анатоль Сямёнавіч устаў...

Так, нямнога вольнага часу ва ўчастковага ўрача. Але амаль увесь яго гэты ўлюбёны ў прыроду чалавек траціць на сваё захапленне.

— Хобі, як цяпер прынята гаварыць,— смяецца Анатоль Сямёнавіч. —Яно стварае своеасаблівую эмацыянальную атмасферу, адпавядаючую майму разуменню жыцця, калі хочаце — майму мастацкаму густу. А яшчэ дапамагае прыемна і цікава жыць, працаваць, адпачываць.

А. ЛАГУНОВІЧ,
супрацоўніца газеты «Савецкая вёска».
г. Шчучын.

ТУДЭМА—СЮДЭМА...

ФОМА МЕТЕЛКИН

У гасцях у «ЛіМа» сатырычны выпуск «Гродненской правды»

Малюнкі Наталлі Дораш з серыі «Пегас».

Леанід КАЦКЕВІЧ

ПАКОЛЬКІ НЕ ВЕЛЬМІ МОЦНЫ...

У прыёмную камісію інстытута зайшоў мужчына далёка не абітурыенцкага ўзросту. У сакратара Блямкіна ёкнула ў грудзях: «Бацька! Небяспека № 1!» Блямкіну раптам захацелася знікнуць, згубіцца ў калідорным людскім патоку, папіць кефіру ў буфеце... Але было позна.

— Дык вы і ёсць сакратар,— сцвярджальна сказаў бацька. Ён доўга ціскаў блямкінскую руку і ласкава глядзеў яму ў вочы. Але Блямкін—не навічок у такіх справах і за свае доўгія гады работы, як гавораць, сабаку з'еў. І ў гэтай сітуацыі ён, як заўсёды, вырашыў перахапіць ініцыятыву, збіць бацьку з панталыку, а потым накіраваць ціхай хуткасцю да выхаду.

— У вас хто? Сын? Дачка? — рэзка і хутка спытаў ён.

— Сын.

— Сын—гэта не тое, што дачка, — задобрыў Блямкін.

— Так, сын—гэта не дачка,— згадзіўся бацька.

— Вы, вядома, любіце яго?

— А як жа, я ж яго бацька. Голас крыві, так сказаць.

— Вядома, трэба думаць, ён у вас здольны?

— Не без гэтага, — адказаў бацька, — Толькі здольнасці ў яго не па праграме.

— На экзаменах выкладчыкі гэтага не могуць зразумець, ці не так?

— Вядома, — згадзіўся бацька.—Я і сам так думаю.

— І вы хочаце...

— Так, так, я хачу...

— Але ж гэта непрыгожа. Вы толькі ўявіце такую карціну. Бацька Ламаносава, памор Васілій, непісьменны рыбак, ідзе з Халмагор у Санкт-Пецярбург, заходзіць у лапцях у Славяна-грэка-лацінскую акадэмію, б'е чалом, частуе вучоных немцаў траской і просіць, каб сына яго Міхайлу прынялі, таму што ён вельмі моцны ў арыфметыцы...

— Так, цяжка такое ўявіць,— ахвотна падхапіў бацька.— Узяць таго ж фізіка Ландау. Папаша бярэ яго за руку, і ідуць яны ў Бакінскі універсітэт. І там бацька прыніжана просіць за свайго наследніка, абівае парогі, траціць час у прыёмных. Фантастыка!

Блямкін інстынктыўна адчуў, што ініцыятыву ў яго вырываюць. Ён сабраўся з сіламі.

— А ўспомніце П'ера Кюры. Няўжо вы дапускаеце, што яго бацька, урач Эжэн, уніжаўся перад швейцарам у Сарбоне? Ніколі не паверу. П'ер бліскуча здаў усе экзамены, і бацьку не давялося даваць абяцанне адносна бясплатнага лячэння прафесарскага саставу.

— Не варта далёка хадзіць за прыкладам, — разгаварыўся бацька. — У нас у краіне столькі Платонаў і хуткіх на розум Ньютонаў. Той жа Мікалай Лабачэўскі. Найпершы бядняк з мяшчан. Яго бацька, бедны каморнік, вядома, не мог паехаць у Казань і там слёзна прасіць прыняць сына на вучобу з-за боязі, што ён «зрэжацца» на ўступных экзаменах. Не мог ён гэтага зрабіць хаця б таму, што да таго часу ён памёр... А наш знакаміты Зялінскі...

— Хопіць! — замахаў рукамі Блямкін. І, выціраючы ўспацелы лоб, спытаў: — Колькі ён не дабраў балаў?..

— Дык жа я не за тым прыйшоў, — сказаў бацька. — Мяне прыслалі праводку праверыць. Манцёр я...

Анатоль КУДЗЯН

НА РАДАСЦЯХ

Мне сягоння жонка нарадзіла
Сына!

Уладзімір ПРАВАСУД.
(З верша «Радасць»).

Сёння надзвычайная нагода,
Вершамі ад золку размаўляю,
Мне прынесла жонка ўзнагароду,—
Я цяпер багаты — сына маю!

Радасць—вестку разнясу па свету
Ад гары ад Лысай да Ямайкі...
Нават вершык напішу ў газету,
Што не толькі здольны я
на байкі!..

Яўген СКРАБОЦКІ

Памылка

Гэта быў фінансавы дакумент. Будаўнікі называюць яго «працэнтоўкай».

Друкуючы фразу «Пракладка труб у неасушаных траншэях», машыністка зрабіла памылку.

Хтосьці першы не заўважыў памылкі і падпісаў дакумент. Другі, любоўна дзьмухнуўшы на пячатку, прыціснуў яе да гэтай важнай паперы...

Папера прайшла банк, некалькі вытворчых аддзелаў, бухгалтэрыю і нарэшце трапіла ў папку мінулых гадоў.

Тут я і сустрэў яе перад адпраўкай у архіў. Як свежыя сінякі, ззялі сакавіта адціснутыя пячаткі. А крыху вышэй размашыстых подпісаў — фраза: «Пракладка труб у неіснуючых траншэях».

У рыбнаглядзе

— Вы абвінавачваецеся ў незаконным адлове рыбы з калгаснай сажалкі.

— Што вы, таварыш інспектар!? Проста я мыў у сажалцы сваю сетку, а што ў яе заплылі карпы — маёй віны няма.

У рэстаране

— Афіцыянт, прынясіце, калі ласка, селядзец.
— Селядца няма. Сёння рыбны дзень.

А. ГЕМБІЦКІ

УЗРОВЕНЬ РАЗВІЦЦЯ

Сядзім мы неяк за сталом з сябрам майго дзяцінства і яго жонкай. Побач круціцца іх пяцігадовы сын Воўка.

Гледзячы на гэтага жвавага хлопчыка, я думаю аб сабе і сябрах свайго дзяцінства: «Як адрозніваюцца сучасныя дзеці ад дзяцей майго часу! Сучасныя дзеці і больш кемлівыя, і больш рухомыя...».

Вера, жонка майго сябра, заўважыла, што мой новы гальштук мне да твару. Мой сябра Гена — таксама заўважыў.

І толькі іх сын скептычна сказаў, калупаючыся ў носе: «Падумаеш: новы гальштук, у мяне вунь новая балячка, учора нагу падрапаў і то нічога, а ён...».

— Ты б лепш выцягнуў палец з носу, а то чаго добрага яшчэ разьбу сарвеш,—параіў бацька. — А наогул, ідзі ты лепш адсюль і не круціся каля дарослых.

— Па-першае, у мяне паміж носам і пальцам не разьбавое злучэнне, а па-другое...

— А па-другое, —рэзка абарваў яго бацька,—хуценька адсюль, бо зараз сам выведу, тады горш будзе.

Я, каб не прысутнічаць у час выхавання дзіцяці, пачаў развітвацца: «Ну, герой, давай пяць», — сказаў я, звяртаючыся да Воўкі.

— Не, пяць не дам, хопіць з цябе і тры, — адказаў Воўка і і працягнуў мне ручку, на якой і сапраўды тры пальцы былі згорнуты ў даволі-такі цікавую фігуру.

Вера, збялеўшы, закрычала на высокіх нотах: «Ты як сябе паводзіш з дарослымі, нягоднік?».

— А чаму ж ён учора адабраў ад мяне ката, якога я цягнуў за хвост да пясочніцы? Я хацеў толькі пацікавіцца: ці вылез бы з-пад пяску, куды я яго хацеў закапаць.

Я кінуўся ўцякаць з хаты, баючыся, што ў такога кемлівага дзіцяці можа ўзнікнуць жаданне: адрэзаць мне вуха і прышыць яго да сваёй куртачкі, каб пацікавіцца, ці стане прыгажэй ад гэтага ягоная вопратка.

Малюнкі Наталлі Дораш з серыі «Пегас».

Анатоль КАЦЫК

ПУД СОЛІ

Крычаць жаніху і нявесце:
«Жадаем пуд солі вам з'есці».
Яны перасолена елі,
Хутчэй яго з'есці хацелі.
Барыс, як і ўсе, у той долі
З'еў з жонкаю, можа, і болей.

Ды нешта не гэтак на свеце:
Абрыдлі і жонка і дзеці.
Нішто яму ў хаце не міла,
Душу нібы трасцаю біла.
Каб Валя замест яго Зіны,
І камень здаваўся б пярынай.
Пуд солі даўно яны з'елі
І новы пачаць захацелі.

«Литература и искусство» — орган Министерства культуры и правления Союза писателей БССР. Минск.

«ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА»

Выходзіць па пятніцах на шаснаццаці старонках.

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.

Індэкс 63856 АТ 67298 12345678

Адрас рэдакцыі: 220600, ГСП, Мінск, вул. Захарава, 19.

Тэлефоны: прыёмнай рэдакцыі — 33-24-61, намесніка галоўнага рэдактара — 33-25-25, адказнага сакратара — 33-44-04, аддзела грамадска-палітычнага жыцця і інфармацыі — 33-22-04, аддзела прозы і паэзіі — 33-24-62, аддзела крытыкі і бібліяграфіі — 33-24-62, аддзела тэатра, кіно і музыкі — 33-21-53, аддзела выяўленчага мастацтва, архітэктуры і вытворчай эстэтыкі — 33-24-62, аддзела культуры — 33-24-62, аддзела пісем і масавай работы — 33-22-04, выдавецтва — 23-52-85, бухгалтэрыі — 23-77-65.

Рукапісаў рэдакцыя не вяртае.

Галоўны рэдактар Алесь АСІПЕНКА.

Рэдакцыйная калегія:

Заір АЗГУР, Ефрасіння БОНДАРАВА, Барыс БУР'ЯН, Мікола ГІЛЬ (адказны сакратар), Уладзімір ГНІЛАМЕДАЎ, Юрый ГРЫГОР'ЕЎ, Канстанцін ГУБАРЭВІЧ, Васіль ІВАШЫН, Віктар КАВАЛЕНКА, Аляксандр КАПУСЦІН (намеснік галоўнага рэдактара), Уладзімір НЯФЁД, Нічыпар ПАШКЕВІЧ, Аляксей ПЫСІН, Міхаіл САВІЦКІ, Барыс САЧАНКА, Язэп СЕМЯЖОН, Юрый СЕМЯНЯКА, Мікола ТКАЧОЎ, Юлія ЧУРКО.